## СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА
НА IV КВАРТАЛ 2010 г.
*Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)*

| Індэкс | месяц | IV квартал |
|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 12400 | 37200 |
| 63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў) | 11600 | 34800 |
| 63858 (ведамасны) | 19900 | 59700 |
| 63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 18000 | 54000 |

*Заставайцеся з намі!*



WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

31 ЖНІЎНЯ 2010 г.
АЎТОРАК
№ 169
(26777)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.


Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «РЭНТАБЕЛЬНАСЦЬ СТАНЕ ГАЛОЎНЫМ ПАКАЗЧЫКАМ ЭКАНОМІКІ Ў НАСТУПНАЙ ПЯЦІГОДЦЫ»

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас рабочай паездкі ў Гомельскую вобласць.

«Мы будзем глядзець на дынаміку прыросту, але галоўным паказчыкам будзе рэнтабельнасць, на гэта і настройвайцеся», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.



Фота БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка сказаў, што з буйнымі навацыямі ў сельскай гаспадарцы ў асноўным у краіне закончылі. «У наступнай пяцігодцы іх трэба завяршыць. Цяпер чакае праверка правільнасці выбранага курсу, дашліфоўка аграгарадкоў і кропкавыя ўліванні грашовых сродкаў у канкрэтныя напрамкі праграмы», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы дадаў, што «ні ў якім выпадку нельга дапусціць распылення сродкаў». У той жа час Прэзідэнт звярнуў увагу на неабходнасць выканання вельмі строгай дысцыпліны і тэхналагічных нормаў.

«Аднак яшчэ раз падкрэслю, што галоўным павінна стаць дынаміка па ўсіх напрамках і рэнтабельнасць», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адзначае неабходнасць арыентавацца на заключэнне доўгатэрміновых кантрактаў у гандлі сельгаспрадукцыяй.

СТАР. 2

Гаспадары

## СВОЙ СЯРОД ПТУШАК



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

З 1976 года жыхар Хойнікаў Юрый Гапоненка важдаецца з галубамі. Белымі, сівымі, пярэстымі, кругавымі і гоннымі, птушкамі вертыкальнага ўзлёту, паштовымі. Ён тады быў яшчэ ў восьмым класе. У старэйшага брата вучыўся спасцігаць тонкасці гэтай, насамрэч не надта і простай птушынай справы.

— Без любові спасцігай не спасцігай, добрым галубятнікам не станеш. Як і ў любой справе, — кажа Юрый і дэманструе відавочную прыязнасць чалавека і птушкі: галубы спакойна сядзяць на ягоным плячы і не спяшаюцца выпырхваць з далоняў.

Цяпер у Хойніках, мяркуе Юрый, не болей за пяць галубятняў. Розныя людзі па прафесіі выбралі сабе хобі, якое, па сутнасці, з'яўляецца вельмі даўняй на Беларусі традыцыяй. Але прафесійны пажарны і да таго ж чарнобыльскі ліквідатар сярод іх — толькі Гапоненка. Юрыю было ўсяго 24, калі гахнуў Чарнобыль. Як супрацоўніка Міністэрства ўнутраных спраў яго ў ліку першых накіравалі ў небяспечную зону. Вядома, у размове з ім мы не маглі не закрануць гэтую, зусім не галубіную, тэму. Хаця б таму, што з-за Чарнобыля Юрыю давялося развітацца з птушкамі ледзь не на год.

— Адразу пасля першамайскай дэманстрацыі 1986 года нас, міліцыянераў, апранутых яшчэ ў парадную форму, павезлі ў 30-кіламетровую зону эвакуяваць дзяцей. Вывозілі іх з Аравічаў, Краснаполля, Уласоў, Дронькаў. А 4 мая асабіста я, як старшы групы, эвакуяваў усё насельніцтва вёскі Сянцы, займаўся вывазам і жывёлы з сялянскіх падворкаў, не да галубоў тады было.

Цяпер ён заслужана лічыцца ліквідатарам. Падпалкоўнік у запасе. Гэта ўжо пасля, як з 1998 па 2006 год узначальваў Брагінскі раённы аддзел па надзвычайных сітуацыях. Тым не менш працуе і апошнія тры гады з'яўляецца намеснікам начальніка пажарна-хімічнай станцыі Палескага Дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка.

— Вядома, я магу сабе дазволіць адпачываць, ды неяк сядзець без працы — не па-нашаму, не па-паляшуцку, — кажа гаспадар галубятні і раскрывае далонь, каб белая птушка ўзвілася ў сіняе неба. Усміхаецца, назіраючы за імклівай чародкай.

Напэўна, гэтак шчасліва ўсміхаўся і на пачатку жніўня, калі ладзіў вяселле дачкі і маладыя выпускалі галубіную пару.

— Галубы — сімвал міру! Каб дзеці нараджаліся і раслі, на зямлі ў першую чаргу патрэбен мір.

Ён дае птушак на выпускныя школьныя вечары, вяселлі дзяцей сваіх сяброў і знаёмых. На дзень абароны дзяцей. Каб мір назаўсёды запанаваў у ягоных Хойніках.

*г.Хойнікі.*

## ГРАМАДСКАЯ ДУМКА АБ САЦЫЯЛЬНА-ПАЛІТЫЧНАЙ СІТУАЦЫІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

*(першае паўгоддзе 2010 г.)*

### Меркаванне насельніцтва аб палітычнай сітуацыі ў краіне

Палітычную абстаноўку ў Беларусі пераважная большасць рэспандэнтаў **(83 %)** лічыць **спакойнай**. Ацэньваюць яе як напружаную 12 % удзельнікаў апытання — гэта на 11 % менш, чым год таму.

Вынікі апытання паказваюць **нізкі пратэстны патэнцыял беларускага грамадства. Пераважная большасць рэспандэнтаў (да 96 %) адмаўляе магчымасць свайго ўдзелу** ў розных акцыях пратэсту нават пры выключных абставінах.

### Давер сацыяльным інстытутам

Сярод **палітычных партый, грамадскіх, рэлігійных арганізацый** насельніцтва **давярае** перш за ўсё **царкве** — 82 % апытаных (у 2009 годзе — 77,5 %).

**Не карыстаюцца даверам** у грамадзян перш за ўсё апазіцыйныя партыі (узровень даверу ніжэй за 10 %) і так званыя незалежныя прафсаюзы, якія не ўваходзяць у Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі (менш за 20 %).

Сярод **праваахоўных, сілавых, кантралюючых, судовых органаў** рэспублікі **найбольшым даверам** карыстаецца **армія**, якой, як і год назад, давяраюць **81,5 %** апытаных. Далей ідуць суд — 76 % (у 2009 годзе — 71 %), пракуратура — 75 % (69 %), КДБ — 72,5 % (72 %).

**Сярод органаў улады** па-ранейшаму **найбольш высокі ўзровень даверу грамадзян Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь — 80 %**. З IV квартала 2007 г. ён практычна застаецца нязменным.

**Дынаміка ступені даверу насельніцтва Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь А.Р. ЛУКАШЭНКУ**
*(у % ад колькасці апытаных)*




Далей па ступені даверу ідуць Урад (Савет Міністраў) — 74 %, Парламент (Нацыянальны сход) — 73 %, мясцовыя органы ўлады (70 %). За апошні год **узровень даверу** грамадзян гэтым уладным структурам крыху вырас.

Пераважная большасць грамадзян **(76,5 %)** лічаць, што **дзейнасць цяперашняга Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь адпавядае інтарэсам такіх людзей, якімі з'яўляюцца яны самі**. І столькі ж рэспандэнтаў **(77,3 %)** згодныя са сцвярджэннем, што **пад кіраўніцтвам цяперашняга Кіраўніка дзяржавы Беларусь у цэлым развіваецца ў правільным кірунку.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### НА РОК-ФЕСТЫВАЛІ Ў МІЯСЕ ЗБІЛІ ГЛЕДАЧОЎ

**28-29 жніўня на тэрыторыі дзіцячага лагера імя Зоі Касмадзям'янскай у горадзе Міясе Чалябінскай вобласці праходзіў рок-фестываль «Тарнада».**



Увечар 29 жніўня ў лагер уварвалася каля ста мужчын ва ўзросце ад 20 да 40 гадоў з дубінкамі, палкамі і арматурай. Усе яны былі распранутыя да пояса. Мужчыны арганізавана занялі лагер, збілі наведвальнікаў фестывалю і арганізавана адступілі. У выніку атрымалі раненні каля 20 чалавек. Раней мясцовыя СМІ паведамлялі, што загінула 14-летняя дзяўчына, аднак у ГУУС па Чалябінскай вобласці гэтую інфармацыю не пацвердзілі. Па некаторых звестках, падчас нападу былі чутныя стрэлы.

Раней у СМІ распаўсюдзілася палітычная версія канфлікту. Меркавалася, што на фестываль напалі з-за таго, што яго арганізатар Валіхан Тургумбаеў мае намер увосень 2010 года балатавацца ў дэпутаты заканадаўчага сходу Чалябінскай вобласці. Аднак пракурор вобласці Аляксандр Вайтовіч заявіў, што падобная версія не разглядаецца.

### МЕРКЕЛЬ ПРАДОЎЖЫЦЬ ТЭРМІНЫ ДЗЕЯННЯ АЭС У ФРГ НА 10—15 ГАДОЎ

**Канцлер Германіі Ангела Меркель у нядзелю, 29 жніўня, у эфіры ARD упершыню афіцыйна назвала, якія плануюцца тэрміны працягу дзеяння нямецкіх АЭС. Паводле слоў Меркель, тэрміны эксплуатацыі рэактараў будуць павялічаны на 10—15 гадоў.**

Заява канцлера выйшла пасля таго, як 27 жніўня ўраду быў прадстаўлены даклад экспертаў, у якім разглядаліся некалькі сцэнарыяў развіцця энергетычнага сектара. Меркель адзначыла, што, з пункту гледжання спецыялістаў, працяг тэрмінаў дзеяння АЭС на 10—15 гадоў «з'яўляецца найбольш разумным».

Рашэнне ўрада ФРГ выклікала рэзкую крытыку з боку апазіцыі. Старшыня СДПГ Зігмар Габрыэль абвінавацію Ангелу Меркель у тым, што яна праводзіць «адкрыта пралабіраваную» палітыку ў інтарэсах энергетычных канцэрнаў і «прадае бяспеку грамадзян». У падобным ключы выказалася лідар партыі «Левыя» Гезіна Летш.

### ДЗЕВЯЦЬ ЧАЛАВЕК ЗАГІНУЛІ ПРЫ ПАЖАРЫ Ў ДОМЕ САСТАРЭЛЫХ ПАД ЦВЕР'Ю

**У выніку пажару ў доме састарэлых у горадзе Вышнім Валачку Цвярской вобласці 9 чалавек загінула, атруціўшыся чадным газам, адзін цяжка пацярпеў.**

Сігнал аб загаранні паступіў у 5.05 па маскоўскім часе. Першыя пажарныя разлікі прыбылі на месца здарэння праз некалькі хвілін. З пакояў было эвакуявана 480 чалавек. У 5.30 пажар быў ліквідаваны.

У агні загінула 9 чалавек. Паводле адной з версій, прычынай узгарання магло стаць самаспальванне пенсіянера-ветэрана. Пра гэта сведчаць некалькі каністраў з-пад бензіну, знойдзеных на месцы здарэння. Пацыент стаяў у чарзе на кватэру і быў у адчаі з-за таго, што яму яе не даюць. Вывучаюцца і іншыя версіі, у тым ліку кароткае замыканне.

### У ПОЛЬШЧЫ Ў АДНОЙ З КАВЯРНЯЎ КУБАК КАВЫ КАШТУЕ Br100 ТЫС.

**У польскім горадзе Цмелю на поўдні краіны ў меню кавярні «Ляжачая котка» ўнесена кава, стандартны кубак якой каштуе (у пераразліку з польскіх злотых) Br100 тыс.**

Гэта адзінае месца ў Польшчы, дзе аматары чорнага духмянага напою могуць пакаштаваць самую дарагую ў свеце каву «Копі Лювак».

Працэс вытворчасці зерня кавы «Копі Лювак» дарагі і незвычайны. Так, галоўную ролю ў ім адыгрываюць пальмавыя цыветы — невялікія звяркі, якія жывуць у Паўднёва-Усходняй Азіі. Жывёлы паядаюць спелыя плады кававага дрэва, пераатраўліваюць мякаць, якая акаляе кававае зерне, а непераатраўленыя зярняткі кавы выдаляюць падчас фізіялагічнага працэсу. Затым кававае зерне збіраецца людзьмі, мыецца, сушыцца на сонцы і абсмажваецца.

## Падтрымка айчыннай культуры — на высокім узроўні

Станоўчае пазіцыянаванне айчыннага кнігавыдання на замежных рынках, годнае правядзенне Дня беларускага пісьменства з выкарыстаннем спадчыны — такімі былі асноўныя тэмы ўчорашняй прэс-канферэнцыі ў грамадскім прэс-цэнтры, якую правяла **першы намеснік міністра інфармацыі Лілія АНАНІЧ**. Яна адзначыла важнасць падзей,



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

што чакаюць нас у першы тыдзень верасня. 23-я Міжнародная кніжная выстава-кірмаш адкрываецца заўтра ў Маскве і працягнецца да 6 верасня ўключна. Наша краіна запрошаная туды ў якасці ганаровага госця. Гэты статус абавязвае не проста прадэманстраваць тое, што будзе на экспазіцыі ў 320 квадратных метраў, а паказаць сябе з самага лепшага боку. А чытаць, адзначыла Лілія Ананіч, у нашай краіне ёсць што. Кожны год павялічваецца колькасць цікавых кніг, кола арганізацый, якія атрымліваюць ліцэнзіі на выдавецкую дзейнасць. У якасці адмысловага ўзору айчыннага кнігавыдання была прыведзена кніга-фаліянт пра Радзівілаў, якая ўвасабляе і ахоплівае ўсю беларускую спадчыну і культуру. Дарэчы, менавіта такі экзэмпляр каштоўнага выдання, над якім цэлыя два гады працавала Вольга Бажэнава, мяркуецца ўручыць у якасці падарунка ад Беларусі Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы.

У гэтую нядзелю ў Хойніках адбудзецца свята беларускага пісьменства, у якім па традыцыі прымуць удзел высокія афіцыйныя асобы краіны, дзеячы літаратуры, культуры, навукі, мастацтва, журналісты, прадстаўнікі замежных пасольстваў, акрэдытаваныя ў Беларусі, а таксама замежныя дэлегацыі.

А іх, на думку арганізатараў свята, будзе нямала. У Хойнікі, дзе карані вядомага беларускага пісьменніка Івана Мележа, павінны прыбыць вядомыя дзеячы культуры з Чарнагорыі, Босніі і Герцагавіны, Польшчы, Літвы, Украіны, Расіі, Малдовы.

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**

## ПІЛІ, ЕЛІ, ПАКУЛЬ НЕ ЗАПЕЛІ
## на фэсце «Мотальскія прысмакі»

Нават іванаўская раённая газета выйшла ў гэты дзень пад шапкай – «Усе – у Моталь на прысмакі!». Тут сабраўся не толькі ўвесь раён, з райцэнтра былі арганізаваныя дадатковыя маршруты аўтобусаў, машын стаяла процьма, гасцей наехала з усяго свету. Колькі моў гучала ў той дзень на вуліцах старажытнага мястэчка!

Тое, што Моталь – асаблівы край, ведаюць многія і ў нашай краіне, і за яе межамі. Некалі яшчэ каралева Бона падаравала мястэчку Магдэбургскае права, і населены пункт стаў квітнець сваімі рамёствамі, гандлем, земляробствам. Але такое права займелі тады многія малыя гарады і мястэчкі нашага краю, а вось захаваць адметнасці да нашых дзён не ўдалося амаль ніводнаму. І толькі пра Моталь яшчэ ў савецкія часы хадзіла байка: калі вёску агарадзіць калючым дротам і пазбавіць стасункаў са светам, яна выжыве. Сапраўды так. Бо прадпрымальныя людзі тут не пераводзіліся. Вось і Валерыя Кліцунова, старшыня праўлення грамадскага аб'яднання «Адпачынак у вёсцы» згадала, як у восьмым класе яна прыязджала ў Моталь шыць кажух. Тут шылі кажухі, рабілі каўбасы, здабывалі мёд, умелі многа чаго іншага.

Шмат слынных выхадцаў з Моталя праславіліся ў свеце. Пра тое, што тут нарадзіўся і вырас першы прэзідэнт дзяржавы Ізраіль Хаім Вейцман, многія ведаюць. А вось пра мотальскіх братоў Чыжаў, якія ў Чыкага заснавалі студыю гуказапісу і ўвекавечылі творы рок-н-ролу, іншых музычных кірункаў, з цікавасцю пачулі ўдзельнікі фэсту ад госця, часовага паверанага ў справах ЗША ў Беларусі Майкла Скэнлана. Віталі мотальскі фэст госці са Швецыі, Нідэрландаў, Польшчы, Украіны, іншых краін.

Ну і яны, маталяне, у даўгу не заставаліся. Не шкадавалі ні добрага слова, ні каравая. Нават традыцыйная афіцыйная частка мерапры-



емства з прамовамі і віншаваннямі вызначылася тым, што ў нейкі момант са сцэны сышлі дзяўчаты з падносамі і сталі раздаваць прысутным па ладным кавалку свежага духмянага караваю. Дарэчы, майстар-клас па гатаванні вясельнага каравая прайшоў у першы дзень фестывалю ў абрадавым доміку пры мясцовым краязнаўчым музеі. Каравай выпякалі, а потым дзялілі з песнямі, карагодамі, паводле ўсіх мясцовых традыцый. Потым нават прагучала, што каравайны абрад можа быць уключаны ў спіс культурных каштоўнасцяў ЮНЕСКА.

Мотальскія гаспадынькі ды жанчыны з суседніх Опаля, Псычшава, Дружылавічаў, Дастоева, Ляскавічаў, Моладава, іншых сёл прывезлі свае фірменныя стравы. Сталы былі застаўленыя салам-каўбасамі, некаторыя прапаноўвалі паспытаць жур, клёцкі, варэнікі, розныя наліўкі. Дранікаў было поўна на кожным стале. Сярод гаспадынь найбольш заўважана работнікаў сельскіх клубаў і бібліятэк. Хто ж, як не яны павінны збіраць, аберагаць, захоўваць яшчэ бабуліны традыцыі прыгатавання страў? Таму кожная з гасцінных гаспадынь пастаралася прыбраць не толькі стол, але і ўпрыгожыць імправізаваную сцяну вышыўкамі, ручнікамі. Тут спрадвеку ткалі, шылі, вышывалі. Экспазіцыя Таццяны Барэйкі з Ляскавічаў называлася «Бабуліна кухня ад Гаршкалёпаў». Аказваецца, пэўную частку вёскі Ляскавічы спрадвеку называлі гаршкалёпамі. Бо гаршкі ляпілі, былі ганчарамі. І менавіта ў гэтым канцы сяла вясковая кухня адрознівалася сваімі асаблівасцямі. Вось і нагатавала Таццяна бліноў, іншых страў, як гэта некалі рабіла бабуля.

Раённыя бібліятэкары паспрабавалі сябе ў яўрэйскай кухні. Справа ў тым, што да фэсту было прымеркавана неафіцыйнае адкрыццё музея Хаіма Вейцмана. Дом, дзе некалі жыла сям'я гэтага легендарнага чалавека, купіў прадпрымальнік з Мінска з намерам адчыніць тут музей. Пакуль што музей не зусім гатовы, але для наведванняў адкрыты. Спецыяльна для свята работнікі мясцовай культуры вырашылі зрабіць нейкую разыначку для музея. Заселі за кніжкі, выпісалі рэцэпты і прыгатавалі шэраг страў яўрэйскай кухні. Усе, хто спрабавалі, гаварылі: «Смаката».

Так можна было вызначыць і адчуванні ад усяго, чым частавалі і што прадавалі на свяце. Свае павільёны на фестывалі гасцінна расчынілі «Каапрам» Іванаўскага райспажыўтаварыства, вытворчы камбінат «Моталь» Мікалая Шыкалая, Андрэй Мінюк, кіраўнік фермерскай гаспадаркі. Усе тры названыя прадпрыемствы выпускаюць фірмовыя мотальскія каўбасы. Падчас адкрыцця свята прагучала, што ў Моталі выпускаюць столькі каўбасаў, колькі вырабляе ўвесь Кобрынскі мясакамбінат. Каля гандлёвых кропак чэргі стаялі паўсюль. У адной з іх давялося бавіць час вашай пакорнай слузе, бо як жа прыехаць з фэсту прысмакаў і не пачаставаць сям'ю! Дык вось тутэйшыя жанчыны ў гэтай чарзе вельмі хвалілі нам, прыезджым, мясцовую прадукцыю. Расказвалі, якая строгая дысцыпліна на прадпрыемствах прыватных прадпрымальнікаў, якая там чыстая вытворчасць і якая добрыя прадукцыя выкарыстоўваецца ў якасці сыравіны. У вёсцы ж усё ведаюць!

СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 31.08.2010 г. (для б/н разлікаў)*

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 3 012,00 | 1 чэшская крона | 154,98 |
| ▲ 1 еўра | 3 832,77 | 1 польскі злоты | 965,11 |
| 1 латвійскі лат | 5 409,97 | ▲ 1 расійскі рубель | 98,23 |
| 1 літоўскі літ | 1 110,31 | 1 украінская грыўня | 382,04 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ*

| | |
|---|---|
| USD | 30,6640 |
| 10 UAH | 38,8767 |
| 1000 BYR | 10,1840 |
| EUR | 39,0291 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова


АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ
WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости» (организатор аукциона) по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Борисовском райисполкоме,**

проводит открытый аукцион по продаже обращенной в доход государства части центрального склада, об. пл. 219,5 кв.м, расположенного по адресу: **Минская обл., г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36.**

**Начальная цена – 52 683 730 бел. рублей.**

Задаток в сумме 5 000 000 бел. рублей перечисляется на **р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.** Оплата за объект должна быть осуществлена в течение 2 месяцев и 25-ти дней с даты проведения торгов.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится **30.09.2010** в 15.00 по адресу: Минская обл., г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.09.2010** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, к. 324.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.*



АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ
WWW.RLT.BY

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Дзержинский райагросервис» (продавец)**

проводит повторный открытый аукцион по продаже **нефтебазы**, расположенной по адресу: **Минская обл., г. Дзержинск, пер. Коммунистический, 16,** в составе: административное здание, об. пл. 58,6 кв.м; насосная, об. пл.38,3 кв.м; склад, об. пл. 42,2 кв.м; бытовое здание, об. пл. 48,9 кв.м; производственно-бытовое здание, об. пл. 77,9 кв.м; гараж, об. пл. 70,8 кв.м; **подъездной железнодорожный путь,** иные сооружения и оборудование.

**Начальная цена с НДС (снижена на 20 %) – 2 039 774 746 бел. руб.**

Площадь земельного участка **2,7534 га.**

**Задаток 50 000 000 бел. руб.**

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 27.07.2010.

Аукцион состоится **07.09.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 06.09.2010 до 17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.**



АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ
WWW.RLT.BY

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Белстройматериалы» (продавец)**

проводит очередной открытый аукцион по продаже зданий и сооружений производственного участка, расположенного по адресу: **г. Смолевичи, ул. Торговая, 20а**, в составе здания вспомогательного корпуса, об. пл. 942,3 кв.м; объектов незавершенного строительства: складской корпус, об. пл. 6246 кв.м, административно-бытовой корпус, об. пл. 635,7 кв.м, склад ГСМ, об. пл. 33,8 кв.м, контрольно-проездной пункт (3х3м); канализационная насосная станция; очистные сооружения дождевых вод; прожекторная мачта (2 ед.); резервуары запаса воды (3 ед.); **железная дорога** (протяж. 1268,71 п.м.); ворота металлические; осветительные ж/б столбы (18 ед.); ограждение территории (275 бетонных плит); открытый склад под козловым краном (бетон. площадка); внутриплощадочные сети; внеплощадочные сети, а также оборудования.

**Начальная цена с НДС (снижена на 40 %) – 4 900 503 067 бел. руб.**

Площадь земельного участка **9,2953 га.**

Задаток в сумме 20 000 000 бел. руб. перечисляется на **р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) дней со дня проведения аукциона, **если иное не предусмотрено договором купли-продажи.**

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 23.12.2009.

Аукцион состоится **08.09.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 07.09.2010 до 17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.**


### НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ Ў ВЕРАСНІ

| | |
|---|---|
| **03.09** 7:40 — 8:51 | **18.09** 7:13 — 9:35 |
| **05.09** 10:30 — 11:45 | **20.09** 15:08 — 22:15 |
| **07.09** 10:20 — 11:53 | **23.09** 7:52 — 10:47 |
| **11.09** 7:15 — 11:21 | **25.09** 15:15 — 22:17 |
| **13.09** 13:55 — 14:52 | **28.09** 5:05 — 8:10 |
| **15.09** 20:50 — 22:30 | **30.09** 12:36 — 15:46 |

# «Белая Русь»: насустрач насельніцтву

**Працягваецца трэці этап маніторынгу работы мясцовай улады спецыялістамі Адміністрацыі Прэзідэнта. Адначасова з міжведамаснымі рабочымі групамі ўдзел у ім прымаюць упаўнаважаныя прадстаўнікі Прэзідэнта ў абласцях і члены грамадскага аб'яднання «Белая Русь». Напярэдадні грамадская прыёмная гэтай арганізацыі працавала ў Веткаўскім раёне.**

Пасля чарнобыльскай катастрофы насельніцтва раёна зменшылася ўдвая, і цяпер тут жыве крыху больш за 19 тысяч чалавек. Па колькасці насельніцтва гэта адзін з самых невялікіх раёнаў Гомельшчыны. Але свае праблемы ёсць і тут. Іх, дарэчы, імкнуцца вырашаць мясцовыя ўлады ў звычайным рабочым рэжыме. Двойчы на месяц — прыём старшыні райвыканкама, кожны тыдзень — яго намеснікаў. І, вядома, пастаянная работа з насельніцтвам з боку сельскіх Саветаў. Асноўныя пытанні — бытавыя, адзначае **намеснік старшыні Веткаўскага райвыканкама Сяргей КОНЧЫЦ**:

— Пытанні тычацца газіфікацыі, зямельных участкаў, водазабеспячэння. У большасці яны вырашаюцца, калі гэта не патрабуе вялікіх фінансавых укладанняў. Таму імкнёмся ісці насустрач насельніцтву і пытанні вырашаць аператыўна.

Усіх, хто ўпершыню наведвае Ветку, звычайна здзіўляе і радуе адрас, па якім знаходзяцца мясцовыя ўлады: Чырвоная плошча, 7. Тут, у Веткаўскім райвыканкаме, у межах маніторынгу работы органаў улады прайшоў і прыём насельніцтва прадстаўнікамі грамадскага аб'яднання «Белая Русь» — разам з кіраўніцтвам раёна. Пытанні ў людзей самыя розныя — атрыманне даведак, газіфікацыя жылля і нават рэалізацыя мёду з уласных пасек. Штосьці растлумачваецца адразу, штосьці бярэцца на кантроль. У «Белай Русі» ўвогуле ніводная ведаюць розныя праблемы становішча спраў у грамадстве. Грамадскія прыёмныя гэтай арганізацыі ў вобласці дзейнічаюць амаль два гады. Звярнуцца можна літаральна па любым пытанні, гаворыць **старшыня Гомельскай абласной арганізацыі РГА «Белая Русь» Ала НАУМЧЫК**:

— У пенсіянераў і ветэранаў праблема ўвагі да іх. У моладзі гэта жыллёвыя праблемы, пошук добрай работы. Праблемы жыхароў сярэдняга ўзросту, на жаль, гэта п'янства і алкагалізм. І гэтую праблему нам таксама трэба вырашаць усім разам.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# ПІЛІ, ЕЛІ, ПАКУЛЬ НЕ ЗАПЕЛІ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ну а калі мясную прадукцыю прадавалі цэнтнерамі, то вельмі да месца была і выстава СВК «Агра-Моталь». СВК паказаў тое, з чаго можа быць зроблена каўбаса ці паўфабрыкат вышэйшых гатункаў ці розныя далікатэсы. За агародкай пахаджвалі каровы пароды «Лімузін», якіх вырошчваюць на так званую мармуровую ялавічыну. Быкі вялізных памераў так і не ўстаў, каб гледачы маглі ацаніць яго габарыты вокам, толькі ляжаў ды матаў галавой. У натоўпе казалі, што яму падсыпалі снатворнага ў ежу дзеля захавання бяспекі. І вельмі дарэчы: карыда на свяце непатрэбная. Прысутныя з задавальненнем разглядалі заморскіх вялікіх авечак, чорных лустых расчэсаных курачак. Як не згадаць тэму выжывання Моталя ва ўмовах натуральнай гаспадаркі ў чарговы раз?

І хоць трэці міжнародны кулінарны фестываль меў так бы мовіць мясны акцэнт (ні на адных «Дажынках» аўтару гэтых радкоў не даводзілася сустракаць столькі «скульптурных фігур», зробленых з сала, ну, напрыклад, гусей), тут прадавалі таксама бульбу, агародніну, мёд. Стрэльненскі музей народнай медыцыны распачаў продаж лекавых траў.

І ўсё ж гэта было не толькі свята народных традыцый ежы, але і народнай культуры ў цэлым. Самадзейныя артысты не толькі з Моталя, з усяго раёна, пастараліся ўпрыгожыць фэст сваім мастацтвам. Дарэчы, на ўваходзе перад кальцавой плошчай гасцей сустракала вялікая экспазіцыя твораў моталькага мастака Янкі Рамановіча. 33-гадовы жыхар Моталя — ужо вядомы ў нашай краіне мастак. Яго праніклівыя творы на тэму роднага краю таксама могуць шмат расказаць пра самабытнасць і багаты Моталь.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *Іванаўскі раён.*

## ВЫБУХ НА МАГІЛЁЎСКІМ РЫБАКОМПЛЕКСЕ

29 жніўня каля 21 гадзіны ў Магілёве на Слаўгарадскай шашы, на тэрыторыі дзяржаўнага прадпрыемства «Магілёўскі рыбакомплекс», адбыўся выбух. Гэта здарылася ў слясарні: выбухнула газапаветраная сумесь, якая ўтварылася з-за ўцечкі прапану ў сувязі з няспраўнасцю вентыля газавага балона.

Паводле паведамленняў МНС і міліцыі, у выніку здарэння пацярпелі тры рабочыя прадпрыемства. З траўмамі рознай ступені цяжкасці яны шпіталізаваныя ў бальніцы Магілёва. У майстэрні разбураны дзве сцяны. Выбуховай хваляй пашкоджаны дзверы і выбіты шыбы на першым паверсе будынка.

**Ілона ІВАНОВА.**

# «РЭНТАБЕЛЬНАСЦЬ СТАНЕ ГАЛОЎНЫМ ПАКАЗЧЫКАМ ЭКАНОМІКІ Ў НАСТУПНАЙ ПЯЦІГОДЦЫ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, у ходзе рабочай паездкі па Гомельшчыне ў тым, што датычыцца сельскай гаспадаркі, яго перш за ўсё цікавяць два пытанні: кукуруза і бульба. У прыватнасці, ён адзначыў, што ў гэтым годзе складваецца выключна высокая рэнтабельнасць бульбы — да 100 працэнтаў. «Нават нафтаперапрацоўка не дае такую рэнтабельнасць», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Гаворачы пра кукурузу, Прэзідэнт нагадаў, што ў свой час быў узяты курс на пашырэнне пасеваў гэтай культуры, і, як паказала практыка, гэта рашэнне не стала памылкай. Так, калі ў 2005 годзе ў рэспубліцы засявалася кукурузай каля 480 тыс. га, то апошнія гады гэтая лічба ўзрасла прыкладна да 800 тыс. га.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што неабходна арыентавацца на поўны цыкл вытворчасці як па бульбе, так і па кукурузе, поўнасцю забяспечваючы сябе насеннем уласнай вытворчасці.

Прэзідэнт адзначыў, што сітуацыя на сусветным рынку сельгаспрадукцыі будзе толькі ўскладняцца, у тым ліку па прычыне хуткага росту насельніцтва ў свеце. Менавіта таму «сельскай гаспадарцы трэба надаць дастаткова ўвагі і дакладна вызначыць, чым мы будзем займацца», падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. У той жа час ён адзначыў неабходнасць скарыстацца сітуацыяй на рынку і арыентавацца на заключэнне доўгатэрміновых кантрактаў з замежнымі партнёрамі на пастаўкі беларускай сельгаспрадукцыі. «Мы павінны ведаць канкрэтных пакупнікоў нашых тавараў і мець з імі дамоўленасці», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

Асаблівую ўвагу ён таксама звярнуў на стан сховішчаў для сельгаспрадукцыі. «Няма чаго вырабляць, калі не можам захоўваць», — падкрэсліў беларускі лідар, запатрабаваўшы надаць максімальную ўвагу таму, як захаваць ураджай, пачынаючы ад сіласу і заканчваючы агароднінай і садавінай.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка звярнуў раз звярнуў увагу на тое, што ў насельніцтва неабходна купляць усю сельгаспрадукцыю, якую людзі пажадаюць прадаць, заплаціўшы справядлівую цану.

Гаворачы аб тэндэнцыях на сусветным рынку сельгаспрадукцыі, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў наступным годзе сітуацыя будзе аналагічная. «Трэба планаваць так пасяўныя плошчы, каб і на будучы год мы маглі мець добрую капейку», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Беларусь з 2013 года будзе поўнасцю забяспечваць сябе насеннем кукурузы.

Пра гэта ўчора было далажэна Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку падчас яго рабочай паездкі ў Гомельскую вобласць.

У 2004 годзе Прэзідэнт даў даручэнне аб будаўніцтве ў Мазырскім раёне кукурузакаліброўвачнага завода. Учора ён наведаў эксперыментальную базу «Крынічная», у структуру якой увайшло створанае прадпрыемства. Тут Прэзідэнт азнаёміўся з тэхналагічнымі працэсамі вытворчасці насення.

Усяго ў Беларусі працуе два кукурузакаліброўвачныя заводы — у Мазырскім (Гомельская вобласць) і Івацэвіцкім (Брэсцкая вобласць) раёнах. Гэта значыць, фактычна ў гэтых двух абласцях створана асноўная сырывінная зона па вытворчасці насення кукурузы. Усяго ў рэспубліцы ў гэтым годзе было засеяна 23 тыс. тон насення гэтай культуры, з якіх 14 тыс. тон беларускай вытворчасці. Як было далажэна Прэзідэнту, па ўраджайнасці беларускія гатункі поўнасцю адпавядаюць імпартным. Акрамя таго, эканомяцца значныя валютныя рэзервы, якія раней ішлі на закупку насення. Толькі ў гэтым годзе эканомія склала 19 млн еўра.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

# Як пераафарміць чаргу?

**Я працую на прадпрыемстве ўжо 9 гадоў. Там жа стаю на чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў. Пражываю з сям'ёй (жонка і сын) у пакоі інтэрната, які нам выдзеліла маё прадпрыемства. Ці магу я, пры ўмове, што жонка ўладкуецца на гэтае ж прадпрыемства, перапісаць на яе чаргу на жыллё, а сам звольніцца? Што трэба зрабіць, каб у нас не забралі пакой у інтэрнаце?**

*Андрэй, г. Мінск.*

Пераафарміць чаргу вы можаце. Але да вашага звальнення неабходна працаўладкаваць на прадпрыемства жонку, інакш вас знімуць з уліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў на падставе падпункта 31.3 пункта 31 Палажэння, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29.11.2005 г. № 565 «Аб некаторых мерах па рэгуляванні жыллёвых адносін», як асобу, якая спыніла працоўныя адносіны з прадпрыемствам.

Пасля працаўладкавання жонкі на вашай пісьмовай заяве і з яе згоды на прадпрыемстве павінны пераафарміць чаргу на жонку. Гэта прадугледжана пунктам 24 вышэйназванага Палажэння. Разам з заявай вам неабходна будзе прадставіць дакументы, што пацвярджаюць асобу вас, жонкі і іншых поўнагадовых грамадзян, якія знаходзяцца на ўліку ў складзе вашай сям'і, а таксама пасведчанне аб нараджэнні сына (калі ён няпоўнагадовы). Пры наяўнасці права на ільготнае атрыманне жылога памяшкання або права на атрыманне жылога памяшкання сацыяльнага карыстання, неабходна таксама прадстаўляць дакументы, якія пацвярджаюць права на гэта.

Пад пытаннем, ці не забяруць у вас пакой у інтэрнаце, вы, напэўна, разумелі — ці не выселяць вас з інтэрната. Як устаноўлена Жыллёвым кодэксам Рэспублікі Беларусь і Палажэннем аб інтэрнатах, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 15.09.1999 г. № 1437 (у рэдакцыі пастановы ад 14.12.2005 г. № 1441), выселенне з інтэрната дапускаецца толькі на падставах, прадугледжаных заканадаўчымі актамі. Згодна з пунктам 56 Палажэння аб інтэрнатах, выселенне з іх адбываецца ў судовым парадку. Гэта значыць, калі вы самі на прапанову вызваліць памяшканне адкажаце згодай і выедзеце ва іншае месца жыхарства, то перашкаджаць вам ніхто не будзе. Але пры адсутнасці вашай згоды і адмове выселіцца прадпрыемства па віна будзе звяртацца ў суд.

Артыкуламі 96, 98 Жыллёвага кодэкса, а таксама ў пункце 58 Палажэння аб інтэрнатах, пералічаны катэгорыі грамадзян, якія не могуць быць выселены без прадастаўлення іншага жылога памяшкання.

Так, не могуць быць выселены без прадастаўлення іншага жылога памяшкання грамадзяне, якія адпрацавалі на прадпрыемстве, што прадаставіла ім інтэрнат, не менш дзесяці гадоў, а таксама грамадзяне, члены сям'і каторых, што пражываюць разам з імі ў адным жылым памяшканні, працуюць на прадпрыемстве, якое прадаставіла жылую плошчу ў інтэрнаце, або выконваюць работу, звязаную з непасрэдным абслугоўваннем працоўнага калектыву гэтага прадпрыемства.

Такім чынам, калі вы ўладкуеце на прадпрыемства, дзе цяпер працуеце, сваю жонку, пытанне з інтэрнатам будзе вырашанае, а калі яшчэ і пачакаеце са звальненнем адзін год, то турбавацца ўвогуле не будзе прычын.

## ВОСЕНЬ У БЕЛАРУСІ ЎСТУПІЦЬ У СВАЕ ПРАВЫ ДАЖДЖЛІВЫМ НАДВОР'ЕМ

1 і 2 верасня чакаюцца працяглыя дажджы. Месцамі ўзмоцніцца вецер з парывамі да 15-20 метраў у секунду. Пры гэтым тэмпература паветра ўноч на 1 верасня складзе 7-14. У першы вераснёўскі дзень яна не перасягне 10-17 градусаў цяпла. Халаднаватым абяцае быць і 3 верасня. Дзённая тэмпература на перасягне 10-17 градусаў цяпла. У гэтыя выхадныя месцамі чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы панізіцца да 3-8 градусаў цяпла. У нізкіх месцах і на тарфяніках Палесся магчымы першыя асеннія замаразкі да нуля — мінус 1 градуса. Днём паветра прагрэецца да плюс 13-18 градусаў.

**БЕЛТА.**

## Абзац

◢ **Кіраўнік аднаго з аддзелаў Клімавіцкага райвыканкама абвінавачваецца ў службовым падлогу. Жанчына ўнесла ў дакументы заведама лжывыя звесткі аб правядзенні канцэртаў і іншых мерапрыемстваў, чым завысіла паказчыкі па аказанні платных паслуг больш чым на 390 млн рублёў. Цяпер ёй пагражае крымінальная адказнасць.**

◢ Кантрабандысты на пяці машынах, якія спрабавалі перавезці буйную партыю цыгарэт у Літву, былі затрыманыя гродзенскімі памежнікамі сумесна з супрацоўнікамі мытні ў пункце пропуску «Прывалка». У агульнай складанасці ў палiўных баках, у спінках сядзенняў, у пустацелых прасторах, у каробцы перадач чатырох «Аўдзі» і аднаго «Фальксвагена» было схавана 230 тыс. беларускіх цыгарэт. Вадзіцелі — грамадзяне Літвы — адпушчаныя дадому, а вось аўтамабілі затрыманыя да рашэння суда. У агульнай складанасці аўтапарк ацэнены ў Br34 млн, кошт цыгарэт — каля Br12 млн.

◢ **Кантрабандныя мабільныя тэлефоны выяўленыя ў прыбіральні рэйсавага аўтобуса Карлсруэ—Бабруйск. Тавар коштам каля 40 млн рублёў быў схаваны ў смеццевым вядры і зачыненай нішы для інвентару. Усяго там знаходзілася каля 40 мабільных тэлефонаў, 3 навігатары, 66 акумулятарных батарэй, больш за 72 зарадныя прыстасаванні і каля 150 стэрэагарнітур.**

## Поўны абзац

◢ На Мальдывах з'явіцца востраў для бландзінак. На гэтым востраве плануецца пабудаваць гасцініцы, цэнтры забаў і спа-салоны. Пры гэтым увесь абслуговы персанал, якому трэба будзе працаваць на востраве, будзе строга адбірацца па колеры валасоў — адбор пройдуць толькі светлавалосыя.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

# Перад матчам з Францыяй Бернд Штанге спіць спакойна

*І гульцоў настройвае: не пасылай ягня, калі хочаш забіць ваўка*

**3 верасня — той дзень, калі беларуская зборная стартуе ў кваліфікацыі да чэмпіянату Еўропы-2012. Як вядома, нашым першым супернікам стане каманда Францыі — тая, што аскандалілася пару месяцаў таму ў Паўднёвай Афрыцы, цалкам змяніла склад і галоўнага трэнера. Але не трэба забываць, што ў лепшыя часы гэтая зборная была і чэмпіёнам свету, і чэмпіёнам Еўропы.**

Галоўны трэнер беларускай каманды Бернд Штанге ўзгадвае, што, узначальваючы зборную ГДР, двойчы выходзіў супраць французаў.

— Трэба ведаць тую атмасферу, якая пануе на стадыёне, калі гуляе зборная Францыі. Гэты гімн, які пачынае аркестр, а падпявае ўвесь стадыён. Нямецкія гульцы ў гэты час стаялі белыя.

Але трэнер беларусаў ведае, як настроіць гульцоў, да таго ж лічыць, што апошнія падзеі ў стане суперніка нам толькі на карысць:

— Адзін раз я прайграў зборнай Францыі 0:2. Але другі раз выйграў — 1:0. Так што пра гэта я і раскажу гульцам. Супраць такога суперніка, якім была зборная Францыі ў Паўднёвай Афрыцы, мы б і самі з задавальненнем згулялі. Але той каманды больш не існуе. Нам трэба быць гатовымі, што зборная Францыі агрэсіўна настроіцца на матч. Для іх гульня ў Паўднёвай Афрыцы — гэта ганьба, і яны вымушаны вярнуць свой твар. Але сабраць новую каманду, якае пачне гуляць, вельмі няпроста, гэта патрабуе шмат часу. Так што ў нас ёсць шанс у Парыжы. Мы паважаем суперніка, але не баімся яго. Я спакойна сплю, і раніцай без панікі гляджу ў люстэрка, — дадаў Бернд Штанге.

У якім складзе выйдзе ў Парыжы наш супернік, не ведае ніхто.

— Мы бачылі апошні таварыскі матч зборнай Францыі супраць Нарвегіі. Але пасля гэтага ў складзе з'явілася 10 новых гульцоў! Можна сказаць, што французы гуляюць з рознымі камбінацыямі, але ЯК яны цяпер гуляюць — гэтага не ведае ніхто, — гаворыць Бернд Штанге.

У той жа час трэнер сцвярджае, што беларуская каманда сабралася ў аптымальным складзе, ніхто не траўмаваны. Аляксандр Глеб перад паездкай у зборную павінен падпісаць новы кантракт (праўда, удакладніць клуб трэнер адмовіўся), а Віталь Кутузаў адыграў 90 хвілін у апошнім матчы супраць «Ювентуса», і яго клуб выйграў; Кісляк правёў выдатны матч супраць «Дняпра»...

Хоць у гэтым матчы беларусы аўтсайдары, лічыць наш трэнер:

— Кожны з гульцоў французскай каманды каштуе 10 мільёнаў. Наш Антон Пуціла — 225 тысяч. Але мы павінны быць аптымістамі. Нядаўна я знайшоў рускую прымаўку: «Не пасылай ягня, калі хочаш забіць ваўка». Таму мы павінны быць моцнымі і храбрымі.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

# «ГАРАЧЫ» 287 17 41 Бойлер — гэта індывідуальнае водазабеспячэнне...

**Здавалася б, прайшло ўжо некалькі месяцаў пасля ўнясення змяненняў і дапаўненняў у парадак аплаты камунальных паслуг грамадзянамі, што пражываюць у сядзібных дамах павышанай камфортнасці (як яно пазначана ў дакументах), а пытанні з гэтай нагоды ўсё роўна паступаюць у рэдакцыю. Спрэчкі ў людзей выклікаюць усё тыя ж параметры камфортнасці жылля. З Бараўлянаў, што пад самым Мінскам, з гэтай нагоды патэлефанаваў наш даўні падпісчык.**

— Мне чамусьці ў плошчу дома залічылі паддашкавае памяшканне. Так, там можна жыць, паставіць які ложак, але толькі летам. Далей ідзём. Вады ў мяне ў доме няма, туалет — на вуліцы. Які ж гэта камфорт? А мне дасылаюць паведамленне аб павялічэнні тарыфаў, — гаварыў заяўнік.

У кожнага такога чалавека — свая гісторыя будаўніцтва дома, якую яны гатовыя расказваць доўга і з падрабязнасцямі, свае, як ім падаецца, абгрунтаваныя пярэчанні таму парадку аплаты за камунальныя паслугі, што дзейнічае зараз у дачыненні да іх. Проста па-чалавечы заяўнікаў можна зразумець, паспачуваць ім. Аднак з больш рэальнага рэдакцыя можа толькі параіць: трэба ўважліва чытаць памянёныя крытэрыі аднясення сядзібных жылых дамоў да катэгорыі павышанай камфортнасці.

— Прабачце, — пытаюся ў чытача, — у вашым доме ўвогуле няма вады?

— Чаму ж, — здзіўляецца ўжо ён. — Бойлер ёсць. Але ж цэнтральнага водазабеспячэння няма, як і той каналізацыі!

Для многіх жыхароў шматкватэрных дамоў наяўнасць у кватэры кранаў з гарачай і халоднай вадой, батарэй ацяплення — такая ж элементарная з'ява, як для вяскоўцаў — чыстае паветра і ўласныя вітаміны з градкі. Менавіта гэтыя выгоды атаясамліваюцца найперш калі не з павышаным, дык з элементарным камфортам. Але давайце проста яшчэ раз перачытаем дакумент, у прыватнасці, тыя самыя крытэрыі аднясення дамоў да катэгорыі жылля павышанай камфортнасці. Там гаворыцца і пра агульную плошчу жылых памяшканняў, і пра наяўнасць гаспадарча-пітнога і гарачага водазабеспячэння, каналізацыі, ацяплення і вентыляцыі, электраасвятлення, наяўнасці газавых ці электрычных плітаў, і пра размяшчэнне гэтых дамоў у сталіцы і яе прыгараднай зоне, абласных гарадах і прылеглых да іх адміністрацыйных раёнах, раённых цэнтрах. Тут усё зразумела, так.

Але, вяртаючыся крыху назад, многія не звяртаюць асаблівай увагі на тое, да чаго могуць быць падключаныя вышэйназваныя газ, святло, вада, каналізацыя. А сілкавацца яны могуць, зноў жа працытуем дакумент, «ад цэнтралізаваных, мясцовых ці індывідуальных сістэм з выкарыстаннем традыцыйных ці альтэрнатыўных крыніц». Таму і выходзіць, што выграбная яма на вуліцы і бойлер на сцяне — гэта індывідуальныя каналізацыя і водазабеспячэнне. Яны ж ёсць? Разважаючы далей, нават калі чалавек устанавіць, напрыклад, вятрак або сонечныя батарэі, іх можна будзе аднесці да выкарыстання «традыцыйных ці альтэрнатыўных крыніц»...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Здарэнне

# ПРАКАЦІЛІСЯ З ВЕТРЫКАМ...

Жудасная аварыя адбылася а пятай гадзіне раніцы на вуліцы Мазурава, побач з Лядовым палацам ў Гомелі. Пяцярых пацярпелых з рэштак аўтамабіля даставалі супрацоўнікі МНС. Загінулі тры пасажыры «Сітраен-Ксанціі» — юнак і дзве дзяўчыны. Усім траім па 19—20 гадоў. Яшчэ два маладыя чалавекі, у тым ліку кіроўца, знаходзяцца ў бальніцы. Як расказалі ў прэсслужбе ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама, аўтамабіль пад кіраваннем 22-гадовага гамяльчаніна на вялікай хуткасці знёс некалькі пралётаў невысокай агароджы і ўрэзаўся ў апору вулічнага асвятлення. Да таго ж дарожнае пакрыццё ў гэты момант было мокрым...

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Увага!

# Замест прыемных успамінаў — небяспечная інфекцыя?

Спецыялісты Міністэрства аховы здароўя настойліва рэкамендуюць усім беларусам, якія праводзілі свой летні адпачынак за межамі краіны, звяртаць увагу на стан свайго здароўя, бо ў свеце працягваюць рэгістравацца выпадкі захворванняў, якія ўяўляюць небяспеку для міжнароднай супольнасці (халера, ліхаманка Заходняга Ніла, ліхаманка Дэнге, брушны тыф, поліяміэліт, сібірская язва, малярыя), у тым ліку на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі, Азербайджана, Таджыкістана і іншых. У Расійскай Федэрацыі, напрыклад, выпадкі заражэння людзей ліхаманкай Заходняга Ніла мелі месца ў Краснадарскім краі, у Астраханскай, Валгаградскай і Варонежскай абласцях. Прычым для некаторых расіян хвароба завяршылася лятальным зыходам. Распаўсюджванне гэтай інфекцыі расійскія спецыялісты звязваюць са спякотным надвор'ем, якое ўсталявалася на еўрапейскай тэрыторыі Расіі ў ліпені-жніўні і спрыяла размнажэнню камароў — разносчыкаў інфекцыі.

Улічваючы, што вялікая колькасць грамадзян Беларусі адпачывалі летам за межамі краіны, у тым ліку ў рэгіёнах, дзе рэгіструюцца небяспечныя інфекцыйныя захворванні, а таксама завяршэнне масавага адпускнога сезона, Міністэрства аховы здароўя прыняло рашэнне ўзмацніць санітарна-каранцінны кантроль на дзяржаўнай мяжы і павысіць гатоўнасць шпітальнага фонду і амбулаторна-паліклінічнага звяна да аказання дапамогі хворым з падазрэннем на інфіцыраванне небяспечнымі інфекцыйнымі захворваннямі.

**Медыкі раяць усім вандроўнікам пры павышэнні тэмпературы цела ці з'яўленні іншых нехарактэрных зменаў у стане здароўя, якія могуць быць сігналам заражэння небяспечным інфекцыйным захворваннем, ні ў якім разе не займацца самалячэннем, а неадкладна звяртацца па медыцынскую дапамогу.** Пры гэтым трэба абавязкова паведаміць доктару пра факт адпачынку за межамі Беларусі. Поспех прафілактыкі і лячэння самых небяспечных для здароўя інфекцыйных захворванняў залежыць ад своечасова распачатага лячэння і паўнаты выканання рэкамендацый медыцынскіх работнікаў, папярэджваюць эпідэміёлагі.

Варта памятаць таксама і пра працяглы інкубацыйны перыяд многіх паразітарных захворванняў, якія з цягам часу набываюць хранічнае цячэнне. Урач павінен ведаць пра ўсе паездкі ў экзатычныя краіны, каб своечасова ўстанавіць першапрычыну вашых сімптомаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ПАСЛЯ ВЫХАДУ Ў ЛІГУ ЕЎРОПЫ БАТЭ РАЗГРАМІЛА «ВІЦЕБСК»

*Чэмпіён забіў у вароты суперніка шэсць галоў*

Матчы 23-га тура ў вышэйшай лізе прайшлі ў выхадныя. БАТЭ і «Мінск» працягваюць сваё пераможнае шэсце. Чэмпіён краіны ў нядзелю разграміў чарговага суперніка — на гэты раз пад раздачу трапіў «Віцебск», у вароты якога заляцела шэсць мячоў. Віцябчане адзін мяч адквіталі — 6:1 у выніку. З лікам 3:1 «Мінск» перайграў сталічны «Партызан». Абедзве каманды — БАТЭ і «Мінск» — у адрыве з 51 і 48 ачкамі адпаведна. Крыху адстаў «Шахцёр», якому на апошніх хвілінах удалося вырваць нічыю ў «Дынама» з Брэста (42 ачкі).

Сталічнае «Дынама» выйграла ў «Дняпра», дзякуючы галам Кісляка і Чухлея — 2:1. Клуб па-ранейшаму размяшчаецца на чацвёртым месцы. У Наваполацку «Нафтан» у дададзены арбітрам час перайграў-такі «Нёман» 2:1. «Тарпеда» ўнічыю згуляла з «Белшынай», і гэта дазволіла камандзе з Жодзіна на адно ачко адарвацца ад апошняга месца, дзе зноў размясціўся «Партызан».

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

# «Неўзабаве ў печы паліць трэба будзе, а я не магу комін адрамантаваць»

**Пенсіянерка з вёскі Волма Дзяржынскага раёна Тамара Сцяпанаўна Залатар сутыкнулася з праблемай, якая, на першы погляд, вырашыцца павінна дастаткова проста і хутка, аднак па факце дабіцца гэтага жанчына не можа ўжо два месяцы запар.**

— Разваліўся комін, трэба рамантаваць. Працы там на гадзіну-дзве, аднак ніхто не пагаджаецца дапамагчы. Вядома, вялікіх грошай так не заробіш, а час змарнуеш. Таму і адмаўляюцца печнікі. А я ўжо пакрысе хвалявацца пачынаю: хутка ацяпляльны сезон, а ў мяне печ няспраўная. Сама б зрабіла той комін, адзінае замінае, што трэба на вышыню, на дах лезці, — падзялілася сваёй бядой Тамара Сцяпанаўна. — Мо ёсць усё ж якія арганізацыі, што дапамагаюць вырашаць людзям такія праблемы?

— Так, арганізацыі, якія маюць ліцэнзію на правядзенне такога кшталту работ — а гэта абавязковая ўмова — у раёне ёсць, — паведаміў нам галоўны спецыяліст інспекцыі дзяржаўнага пажарнага нагляду Дзяржынскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Віктар Шаблоўскі. — Гэтае пытанне было канчаткова вырашана гады два-тры таму. Калі гэта, напрыклад, адзінокі пажылы чалавек, ён можа напісаць адпаведную заяву ў цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. На дом прыедуць рабочыя, ацэняць стан коміна, складуць каштарыс. Выкананне патрэбных работ будзе аплачана райвыканкамам. Або можна самастойна звярнуцца ў адну з такіх арганізацый, што маюць адпаведную ліцэнзію. Напрыклад, у даччынае ўнітарнае прадпрыемства ПМК-190, дзе ёсць брыгада печнікоў, або ва ўнітарнае прадпрыемства «ЖКГ Дзяржынскага раёна».

Мы вырашылі ўдакладніць інфармацыю і патэлефанавалі ва ўказаныя месцы. Дырэктар даччынага ўнітарнага прадпрыемства ПМК-190 Мікалай Кавальчук пацвердзіў і пра ліцэнзію, і пра магчымасць дапамагчы заяўніцы. Толькі... у канцы верасня. Патлумачыў такі тэрмін вялікай загружанасцю прадпрыемства: трэба і аграгарадкі ўладкоўваць, і новыя шматкватэрныя дамы будаваць. «Таму калі жанчына за гэты час не здолее вырашыць сваю праблему, няхай звяртаецца да нас крыху пазней». Не стаў называць Мікалай Пятровіч і магчымага кошту рамонту коміна: трэба ўсё ацэньваць непасрэдна на месцы. Таму, магчыма, Тамары Сцяпанаўне лепш не зацягваць і звярнуцца ва ўнітарнае прадпрыемства «ЖКГ Дзяржынскага раёна», дзе таксама працуе пячнік? Згодна з папярэднімі прагнозамі, пачатак верасня абяцае быць прынамсі мокрым...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Развагі за абедзенным сталом

# ЖУРНАЛІСТ «ЗВЯЗДЫ» ПАСПЫТАЎ ХЛЕБА КОШТАМ... 16 ТЫСЯЧ

Сяргей РАСОЛЬКА

**ДНЯМІ ў адным са сталічным ўніверсамаў разам з іншым набыў і хлеб. Проста ўзяў упакоўку з вазка, які толькі-толькі выкацілі ў гандлёвую залу. Мяккі, нарэзаны — якраз на адзін раз на вячэру. Паклаў хлеб у кошык, нават не пагляздзеў на цану. Ды яе, па праўдзе, і не было нідзе. Але колькі ён можа каштаваць, нават дарагіх гатункаў? Таму каб дома выпадкова не зірнуў у касавы чэк, гэтае пытанне так бы і засталося таямніцай. Дык вось, 250 грамаў нарэзанага хлеба «Лінеа люкс» я купіў за 3 970 рублёў. Кілаграм, выходзіць, каштуе амаль 16 тысяч...**



## «Мы не ставім сабе за мэту накарміць усіх»

Лагічным было б думаць, што кошт залежыць ад выкарыстаных інгрыдыентаў. Вывучаю састаў: «мука пшанічная вышэйшага гатунку, сумесь «Лінеа» (мука пшанічная першага гатунку, жытняя, пшанічная салоджаная, абсмажаная, пшанічныя шматкі, сухая пшанічная клейкавіна). Французская здоба (мука пшанічная вышэйшага гатунку, яечны парашок, цукар-пясок, сухая пшанічная клейкавіна, араматызатары, ідэнтычныя натуральным «Сметанковае масла», «Ванілін»), Мельэканом, маргарын 82%, дрожджы хлебапекарныя, цукар-пясок, соль харчовая паваранaя ёдаваная». Магчыма, справа ў «французскай здобе»? Ці гэты хлеб быў выпечаны ў якой Амерыцы? Ды не — вытворцам пазначанае таварыства з абмежаванай адказнасцю, што месціцца ў Мінскім раёне. Тэлефаную туды, гутару з **намеснікам дырэктара фірмы**.

— Мы выкарыстоўваем якасную сыравіну для вытворчасці лініі прадуктаў здаровага харчавання. Натуральна, на выхадзе атрымліваецца дарагі прадукт, — гаворыць жанчына.

— Тую самую «французскую здобу»? А ці нельга замяніць яе на такі ж якасны аналаг, але больш танны?

— І яе таксама. У нас толькі адзін расійскі пастаўшчык сыравіны, з якім мы працуем. Альтэрнатывы таму, што мы атрымліваем ад яго, няма, прынамсі мы нічога падобнага не бачылі. Замяніць, зрабіць прадукцыю больш таннай? Вы ведаеце, мы не ставім сабе за мэту накарміць усіх. Тых жа, напрыклад, хлябоў, адзін з якіх вы паспыталі, мы выпякаем толькі 40 боханаў у дзень, і яны разыходзяцца па ўсім Мінску. Ці шмат гэта? Дарэчы, вы елі наш хлеб, ці спадабаўся ён?

— Калі шчыра, за чатыры тысячы рублёў чакаў нечага большага. Смачна, але, на мой погляд, нічога асаблівага.

— Сапраўды, наша прадукцыя дарагая. Але яе набудуць людзі, якія аддаюць перавагу здароваму харчаванню і змогуць дазволіць сабе такую цану. Вы ў наступны раз будзеце прос та больш уважліва глядзець на этыкетку.

## «Гэта — еўрапейская цана»

Не бачачы перад вачыма саставу хлеба, які паспытаў журналіст «Звязды», **начальнік аддзела хлебапякарнай і макароннай прамысловасці дэпартамента па хлебапрадуктах Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Марына КАШКО** пагадзілася пракаментаваць сітуацыю ўвогуле.

— Нашы хлебазаводы выкарыстоўваюць пераважна айчынную сыравіну, за выключэннем таго, што ў нас не вырабляецца, напрыклад, для дэсертных хлябоў патрэбныя разынкі (а вінаградніку ў краіне няма), арэхі... А ўсё іншае — сваё, айчыннае: мука жытняя і пшанічная, солад, сусла з квасу, бульбяныя крупкі, патака... А наконт вашага пытання адносна замены інгрэдыентаў на больш танныя, скажу так. Каб атрымаўся сапраўды смачны хлеб, на хлебазаводах выкарыстоўваецца працяглы тэхналагічны працэс. Прыватнік сабе такога дазволіць не можа, таму што гэта і памяшканні, і патрэбныя спецыялісты, і час. А яму трэба хутчэй атрымаць прыбытак. Таму ён пераходзіць да паскоранай тэхналогіі, выкарыстоўваючы розныя харчовыя дабаўкі, якія, напэўна, і павялічваюць кошт гатовага вырабу. А чым ён большы, тым большы і прыбытак, — расказала Марына Уладзіміраўна.

Натуральна, ніводны з хлебазаводаў краіны не вырабляе такой прадукцыі, якая каштавала б столькі грошай, як вышэйназваны хлеб ад прыватніка. Суразмоўца назвала цану на апошні еўрапейскай, сказала, што здзіўлена гэтай лічбай.

## «Для таго і шчыруем, каб быць з хлебам»

Калі б гаворка ішла пра якія морапрадукты, ці экзатычныя садавіну і гародніну, што не растуць у нас і завозяцца здалёку, дык там, напэўна, не здзівілі б і большыя лічбы на цэнніках. Ды што там казаць, мы ўжо неяк сарамліва амаль звыкліся з прысутнасцю на паліцах у крамах — у «бульбянай» краіне! — «другога хлебу» з якой Галандыі. Але ж прадукт, пра які кажуць, што ён — усяму галава? Тым больш што яшчэ лічаныя дні таму мы былі сведкамі чарговай уборачнай, сачылі за аператыўнымі зводкамі з палёў, за вясковымі працаўнікамі, якія ва ўмовах анамальнай спёкі забяспечвалі харчовую бяспеку кожнага з нас.

**Механізатар Сяргей ШКРАБА з СВК «Краснадворцы» Салігорскага раёна** — якраз адзін з такіх працаўнікоў, ён у канцы ліпеня разам з сынам Паўлам быў героем адной з публікацый у «Звяздзе». Што ён думае пра цану кавалка хлеба?

— Калі вы маеце на ўвазе, як ён даецца, дык — нялёгка. А калі пра такія грошы, дык не кожнаму зарплата дазволіць яго купіць, — нешматслоўна, перакрываючы гукі працуючай тэхнікі, адказаў Сяргей Уладзіміравіч. — Але мы для таго і шчыруем, каб усім быць са сваім хлебам.

# РЭАЛЬНЫЯ СПРАВЫ СТРАТЭГІЧНЫХ ПАРТНЁРАЎ

**Учора пасол Казахстана ў Беларусі Анатоль Смірноў правёў брыфінг з нагоды 15-годдзя Канстытуцыі Рэспублікі Казахстан.**

Нагадаем, роўна 15 гадоў таму 30 жніўня Канстытуцыя Казахстана была прынятая на ўсенародным рэферэндуме. За гэты час краіна непазнавальна змянілася, значна павысіўся ўзровень жыцця яе насельніцтва. Усяго некалькі лічбаў. Анатоль Смірноў з гонарам гаворыць, што за гэты час у эканоміку было прыцягнута 100 мільярдаў долараў прамых замежных інвестыцый, а паказчык валавога ўнутранага прадукту (ВУП) на душу насельніцтва вырас у 11 разоў — з 700 да 8000 долараў ЗША. Нават у мінулы крызісны год Казахстан не страціў станоўчую дынаміку эканамічнага развіцця. Зараз у краіне назіраецца аднаўленне росту эканомікі, напрыклад, толькі за першае паўгоддзе ВУП павялічыўся на 8 працэнтаў. У рамках антыкрызіснай праграмы было створана больш за 400 тысяч працоўных месцаў. У краіне адкрыліся сотні новых прадпрыемстваў, устаноў, бальніц і школ. А ў параўнанні з 1996 годам даходы насельніцтва выраслі ў 14 разоў, а ўзровень нараджальнасці — у 4 разы.

Адзначым, што гэтыя поспехі сяброў у нашых з вамі інтарэсах. Казахстан і Беларусь — стратэгічныя партнёры. Таму для нас прамая выгада, каб гэтая краіна ўстойліва і мэтанакіравана ішла наперад, актыўна развівалася ў розных галінах. Асабліва плённа ідзе ў нас супрацоўніцтва ў эканоміцы. Пра гэта сведчыць вялікая колькасць сумесных прадпрыемстваў, удзел Беларусі ў дзясятках важных для Казахстана праектаў. У розных гарадах краіны адкрытыя беларускія гандлёвыя дамы. Так, Казахстан зацікаўлены ў стварэнні эфектыўнай сэрвіснай службы БелАЗаў, адкрыцці новых зборачных вытворчасцяў беларускай сельскагаспадарчай тэхнікі, ліфтаў, бытавой тэхнікі і г. д.

На думку пасла, стварэнне Мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расіі, з'яўленне ў недалёкай будучыні Адзінай эканамічнай прасторы значна пашырыць магчымасці для ўзаемавыгаднага беларуска-казахстанскага супрацоўніцтва, а залогам яго поспеху з'яўляюцца дзелавыя, сяброўскія адносіны прэзідэнтаў абедзвюх дзяржаў і кіраўнікоў урадаў краін.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА

**объявляет о проведении повторных публичных торгов по продаже имущества, принадлежащего СООО «ИНАВТОМАРКЕТ БЕЛ»**

**Лот № 1.** Капитальное строение с инвентарным номером 411/С-152 (назначение — здание гостиниц, мотелей, кемпингов), общей площадью 2874,8 кв. м, 2000 года постройки, стоимостью — 2 575 800 000 (Два миллиарда пятьсот семьдесят пять миллионов восемьсот тысяч) белорусских рублей, расположенное по адресу: Гродненская обл., Берестовицкий район, п. Пограничный, ул. Советская, 1. Стоимость указана с учетом НДС.

**Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://minsk.court.by/**

а также в помещении хозяйственного суда г. Минска: г. Минск, ул. Академическая, 15/1.

**Торги состоятся 17.09.2010 года в 14 часов по адресу: Гродненская обл., Берестовицкий район, п. Пограничный, ул. Советская, 1.**

**За дополнительной информацией обращаться: судебный исполнитель Сакович А.С., тел./факс: 294 93 57, (029) 1773268**

**ст. судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел. 294 93 67**

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет хозяйственного суда города Минска № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код 795, УНП 101541763 не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

Минимальная величина первого шага составляет 5 % стоимости имущества в размере 128 790 000 белорусских рублей.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

Доктар адкажа

## ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

**На гэтым тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:**

**31 жніўня** — намеснік дырэктара па вытворчасці РНПЦ гематалогіі і трансфузіялогіі Лявонцій Георгіевіч ЛАГОДЗІЧ.

**1 верасня** — галоўны ўрач 12-й мінскай дзіцячай паліклінікі Ірына Міхайлаўна ПАЎЛОВІЧ.

**2 верасня** — галоўны ўрач 9-й мінскай гарадской паліклінікі Анатоль Канстанцінавіч СТАРЫКАЎ.

**3 верасня** — галоўны ўрач 28-й мінскай гарадской паліклінікі Уладзімір Іванавіч КАРПЕЧКІН.

**«Гарачая» лінія ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (017) 220 20 25**

**31 жніўня** — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной клінічнай бальніцы Яраслаў Леанідавіч ПЕРАЛЫГІН.

**1 верасня** — загадчык акушэрскага аддзялення паталогіі цяжарнасці Мінскага абласнога радзільнага дома Ганна Нікіфараўна ЖОРАВА.

**2 верасня** — загадчык рэнтгеналагічнага аддзялення Мінскай абласной клінічнай бальніцы Анатоль Уладзіміравіч ЛОЙ.

**3 верасня** — загадчык неўралагічнага аддзялення Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Святлана Іванаўна ХІТРО.

Ёсць пытанне

## ЗДАРОВЫМ ДЗЕЦЯМ МЕДЫЦЫНСКАЯ ДАВЕДКА НЕПАТРЭБНАЯ?

**Падкажыце, калі ласка, ці праўда, што цяпер ад бацькоў не будуць патрабаваць медыцынскую даведку пры адсутнасці дзіцяці ў дашкольнай установе больш як тры рабочыя дні, калі, зразумела, дзіця не хварэла? У нашым дзіцячым садку мы не змаглі атрымаць патрэбную інфармацыю... На які дакумент можна спасылацца?**

**Т.М**, *г. Мінск*.

Як патлумачылі спецыялісты аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, Пастановай Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 24 мая 2010 года № 49 былі ўнесеныя змены ў Санітарныя нормы, правілы і гігіенічныя нарматывы «Гігіенічныя патрабаванні да ўладкавання, ўтрымання і рэжыму дзейнасці ўстаноў, якія забяспечваюць дашкольную адукацыю». Гэтай пастановай было адменена прадастаўленне медыцынскай даведкі аб стане здароўя дзіцяці пры адсутнасці здаровага дзіцяці ў дашкольнай установе (незалежна ад працягласці яго адсутнасці). Разам з тым прадастаўленне медыцынскай даведкі застаецца абавязковым пры паступленні (афармленні) выхаванцаў у дашкольную ўстанову і пасля перанесенай дзіцем хваробы. Калі падчас ранішняга прыёму дзяцей у педагогаў узнікае падазрэнне на захворванне, то такое дзіця павінна накіроўвацца на агляд да медыцынскага работніка.

Да гэтага дакумента падрыхтаваны таксама і тлумачальны ліст. Пасля яго зацвярджэння ён будзе адпраўлены ва ўсе органы кіравання адукацыяй і аховы здароўя.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Здарэнні

## НАСУСТРАЧ БЯДЗЕ

У нядзелю 29 жніўня ў Чавускім раёне, паблізу вёскі Самулкі, 52-гадовы жыхар раённага цэнтра на аўтамабілі «Форд» выехаў на паласу сустрэчнага руху і ўдарыўся ў грузавы «МАН». У выніку аварыі вадзіцель «Форда» загінуў. Пракуратура праводзіць праверку, але, паводле некаторых звестак, гэта мог быць і крок адчаю з боку мужчыны, які нядаўна пахаваў блізкага чалавека.



Увогуле за тыдзень у Магілёўскай вобласці адбылося 14 дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх 5 чалавек загінула і 10 атрымала траўмы. Сярод іх варта ўзгадаць аварыю, якая адбылася 26 жніўня ў Клімавіцкім раёне: 18-гадовая дзяўчына, якая не мела вадзіцельскіх правоў, не справілася з кіраваннем: аўтамабіль з'ехаў у кювет і ўдарыўся ў дрэва. Гаракіроўца шпіталізаваная з траўмамі, а 27-гадовы пасажыр загінуў.

**Ілона ІВАНОВА. Фота Магілёўскай ДАІ.**

Жаночае здароўе

# АГЛЯД МАЛОЧНАЙ ЗАЛОЗЫ ДАВЕРЫМ МУЖЧЫНАМ

**САМАЯ распаўсюджаная онкапаталогія ў жанчын — рак малочнай залозы. Колькасць выпадкаў захворвання істотна вырасла за апошнія гады, і рост гэты будзе працягвацца. Сучасная жанчына падвяргаецца велізарнай колькасці адмоўных момантаў, шкодных для малочнай залозы. Адным з такіх момантаў застаецца добра вядомы хранічны стрэс, няўменне з ім спраўляцца. Нездарма рак малочнай залозы спецыялісты яшчэ называюць «хваробай нервовых жанчын». Падрабязней пра гэта — загадчык аддзела онкамамалогіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава, прафесар, доктар медыцынскіх навук Леанід ПУТЫРСКІ.**



— За апошнія трыццаць гадоў стрэсавая нагрузка істотна вырасла. Мы вымушаны, так бы мовіць, шмат круціцца, напружвацца, страчваць душэўную раўнавагу. Некаторым жанчынам адмоўныя эмацыйныя ўздымы абяцаюць з'яўленне боляў у малочнай залозе літаральна на другі дзень.

Самыя розныя вонкавыя ўздзеянні ўплываюць на нашу нервовую сістэму, а яна ў сваю чаргу — на ўсе працэсы, якія адбываюцца ў арганізме, у тым ліку гармананальныя. А малочная залоза — орган, як вядома, гармоназалежны...

***— Мужчыны ў больш выйгрышным становішчы?***

— У моцнага полу малочная залоза знаходзіцца, так бы мовіць, у зачатковым стане, і, значыць, не можа пакутаваць у той жа ступені. Тым не менш нельга сказаць, што малочная залоза мужчын абсалютна не рэагуе на адмоўныя фактары. Паводле статыстыкі, на кожныя 100 захварэлых жанчын прыпадае 1 мужчына. У Беларусі штогод выяўляецца дзесьці 30-35 новых выпадкаў раку малочнай залозы сярод мужчын. Больш стала выяўляцца ў іх і дабраякасных працэсаў гэтага органа.

**Жанчына, якая захварэла на рак малочнай залозы, павінна сачыць таксама за здароўем яечнікаў і шыйкі маткі, паколькі прычыны гэтых відаў раку — аднолькавыя.**

***— Стрэс мае значэнне для ўсіх лакалізацый раку, а ці ёсць моманты, уласцівыя толькі гэтаму віду анкалогіі?***

— Гэта бясплоднасць, больш познія роды, меншая колькасць родаў, малая працягласць груднога выкормлівання, перарыванні цяжарнасці. Акрамя таго, мае значэнне і нерэгулярнасць менструальнага цыкла, і частыя запаленчыя захворванні, і нерэгулярнае палавое жыццё, і нізкая фізічная актыўнасць, якая якраз дазваляе спраўляцца з нервовымі перагрузкамі... З ростам колькасці актыўных жанчын, якія займаюцца спортам, павялічылася і колькасць траўмаў малочнай залозы ў іх, што таксама не на карысць апошняй... Як вучоны я спрабую разважаць і пра тое, які ўнёсак у здароўе дзяўчынкі робяць частыя ультрагукавыя даследаванні на ранніх стадыях цяжарнасці. Адзін-два разы за цяжарнасць — норма, аднак нельга лічыць гэты від дыягностыкі цалкам бясшкодным. Каласальную шкоду жаночаму здароўю наносіць і курэнне... Аднак не існуе аднаго канкрэтнага фактара, здольнага справакаваць рак любой лакалізацыі. Паломка адбываецца, калі сыходзіцца цэлы шэраг прычын.

Вывучаецца зараз у Беларусі і спадчынны фактар. Даследуюцца сем'і, дзе хварэюць, скажам, тры пакаленні жанчын. Сапраўды, мы выяўляем у іх пэўныя генетычныя паломкі. Рызыка захварэць на рак малочнай залозы складае ў такіх жанчын ад 60 да 80 працэнтаў.

***— У адной замежнай перадачы расказвалася пра магчымасць выдалення здаровай залозы ў спадчынных выпадках — з мэтай прафілактыкі...***

— А можа быць, наогул не варта падвяргаць сябе такому даследаванню — каб не жыць пад прэсам неадназначных ведаў?.. Думаю, большасць маладых жанчын, якія даведаюцца пра наяўнасць гена ў сябе, будуць спадзявацца ўсё ж такі на 20-40 працэнтаў, калі хвароба не надыходзіць, і наўрад ці захочуць развітацца з малочнай залозай дзеля прафілактыкі. Разам з тым, а што павінен рэкамендаваць урач жанчыне, у якой выяўлены злаякасны ген? Адна з магчымасцяў — сапраўды, выдаліць здаровую малочную залозу і паставіць пратэз. Ёсць сёння і магчымасць пэўных медыкаментозных прафілактычных прызначэнняў, схему якіх павінен распісаць урач-мамолаг ці анколаг, які займаецца менавіта малочнай залозай.

***— Па сутнасці, рак малочнай залозы павінен часцей за іншыя віды раку выяўляцца на ранніх стадыях...***

— За апошнія пятнаццаць гадоў у гэтым накірунку была праведзена актыўная работа. Калі раней у запушчанай стадыі выяўлялася 40 працэнтаў выпадкаў, то летась — усяго 17. Гэта вельмі сур'ёзны вынік, нягледзячы нават на тое, што нашы ранція стадыі адрозніваюцца ад замежных. Там мамаграфія дазваляе ўбачыць пухліны значна меншага памеру. Тым не менш, па ранняй дыягностыцы мы маем лепшы вынік на постсавецкай прасторы.

Дарэчы, у чэрвені я быў запрошаны ў Злучаныя Штаты, паколькі наша справаздача аб 15-гадовай рабоце па ранняй дыягностыцы раку была ўдастоена амерыканскімі вучонымі другога месца ў свеце. Мы дасягнулі вялікіх зрухаў без істотных грашовых затрат. Проста належным чынам арганізавалі адпаведную работу, у тым ліку інфармацыйную. Сустракаліся як з жаночым насельніцтвам, так і з медыкамі. І адных, і другіх навучалі асновам рэгулярнага агляду малочнай залозы. Тым самым удалося сэканоміць каласальныя грошы, паколькі раннія стадыі лечацца намнога прасцей.

Нельга, праўда, сказаць, што ў прафілактычнай рабоце можна ставіць кропку. Амерыканцы высветлілі: 85 працэнтаў жанчын, навучаных самаагляду урачом, пачынаюць глядзець за сабой. Праз год такіх застаецца палова. Глядзець за сабой пачынаюць 40 працэнтаў жанчын, якія даведваюцца пра самаагляд са СМІ. Даказана таксама, што калі жанчына глядзіць за малочнай залозай час ад часу, то сярэдні памер пухліны, які ў яе выяўляецца, не перавышае 3 см. Калі жанчыну навучыў самаагляду ўрач і яна рэгулярна прымяняе веды на практыцы, памер выяўленай пухліны — каля 2 см, а гэта, дарэчы, першая стадыя. Калі ж жанчына раз у паўгода паказваецца спецыялісту, то сярэдні памер пухліны будзе каля 1 см, а гэта ўжо азначае магчымасць захавання малочнай залозы.

***— Для ранняй дыягностыкі дастаткова рэгулярнага самаагляду ці трэба яшчэ штогод праходзіць мамаграфію?***

— Неабавязкова штогод праходзіць мамаграфію. Мамаграфічны скрынінг — дарагі і досыць складаны ў арганізацыйным плане від абследавання. Праўда, сёння мы арганізуем у 10 раёнах краіны пілотны праект па мамаграфічным скрынінгу раку малочнай залозы. Гадоў праз пяць падвядзём першыя вынікі...

Жанчыны павінны разумець, што галоўнае для кожнай з іх — штомесячны самаагляд і штогадовае наведванне анколага ці мамолага. Калі ва урача ўзнікнуць пэўныя падазрэнні, ён накіруе на ўльтрагук ці мамаграфію.

**Выйшла з друку другое выданне кнігі Л.А. Путырскага і Ю.Л. Путырскага «Парады ўрача-мамолага: як захаваць грудзі здаровымі».**

Яшчэ я хацеў бы звярнуцца да мужчын. Калі ласка, памятайце, што без блізкіх жанчын вам будзе вельмі дрэнна. Я бачыў нават моцных духам мужчын, якія апускалі рукі, калі ўсведамлялі, што застаюцца без любімай жанчыны, той, якая шмат зрабіла для іх, вызваліла ад шэрагу штодзённых клопатаў і праблем. Сачыце, калі ласка, за здароўем сваіх блізкіх і дарагіх жанчын. На жаль, вельмі рэдка якая з іх можа сказаць мамолагу, што пухліну знайшоў муж. Часцей здараецца так, што пухліна ўжо вялікіх памераў, а муж пра гэта нічога не ведае.

***— Жанчына, якая намацала нейкае ўшчыльненне ў малочнай залозе, хутчэй за ўсё, адчуе страх і разгубленасць. Як часта ўсё ж такі мае месца менавіта рак?***

— Па статыстыцы толькі 5-6 працэнтаў ачаговых утварэнняў, з якімі звяртаюцца жанчыны, — гэта сапраўды рак. Усё астатняе — гэта або анкалагічныя дабраякасныя працэсы, або працэсы неанкалагічныя — ачаговая мастапатыя, ліпома, фібраадэнома і г.д. Таму не трэба самой ставіць сабе дыягназ. Ідзіце да ўрача.

***— Наколькі працяглым і складаным можа быць лячэнне дабраякаснага і злаякаснага працэсаў?***

— Дабраякасны працэс лечыцца ва ўмовах стацыянара аднаго дня. Жанчыну прааперыравалі, і яна ў той жа ці на наступны дзень ідзе дадому. Калі мы гаворым пра рак, то на першай стадыі выдаляецца частка малочнай залозы, хоць у некаторых выпадках можа выдаляцца і ўся. Часцей за ўсё дадаецца прамянёвая тэрапія, якую можна атрымліваць у амбулаторным рэжыме. Хіміятэрапія на гэтым этапе, як правіла, не праводзіцца, хоць большасць вучоных схіляюцца да мэтазгоднасці апошняй. Чым большая стадыя, тым, зразумела, больш працяглым будзе лячэнне. У сярэднім на ранніх стадыях хіміятэрапія выконваецца раз у 21 дзень на працягу трох месяцаў (4 разы), прамянёвая тэрапія працягваецца 25 дзён.

***— Наколькі высокай можа быць рызыка вяртання хваробы?***

— Калі аднойчы жанчына захварэла, пралячылася і вылечылася ад раку малочнай залозы, рызыка захварэць зноў, вядома, больш высокая, чым у здаровай жанчыны. Пры наяўнасці дабраякаснага працэсу рызыка павышаецца не так моцна. У любым выпадку захворванне не трэба чакаць. Але нельга і скідваць з рахунку тое, што ў кожнай жанчыны — свая ступень рызыкі захварэць на рак, паколькі на яе ўздзейнічаюць тыя ці іншыя прычыны. Паводле амерыканскіх звестак, кожная 15-я сучасная жанчына захварэе на рак малочнай залозы і адна з 28 загіне ад яго, калі не будуць вынайдзены іншыя спосабы лячэння. У ЗША, праўда, захваральнасць на рак малочнай залозы ў два разы вышэйшая, чым у Беларусі. Значыць, у нас захварэе адна з 30-ці.

Не варта баяцца гэтых сумных лічбаў, трэба паводзіць сябе згодна з тымі рэкамендацыямі, якія даюць спецыялісты. Жанчынам, якія паправіліся аднойчы ад раку малочнай залозы, наогул ніколі не варта падвяргаць сябе актыўнаму сонечнаму абпраменьванню, не варта хадзіць у парылку, рэзка мяняць клімат. Трэба паменей нервавацца, асцерагацца прастудных і вірусных інфекцый. Нават праз дзесяць гадоў пасля вылячэння нельга забывацца на гэта. Уважліва ставіцца да сябе павінны і здаровыя жанчыны.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

### Сарваўся з даху

34-гадовы рабочы аднаго з прадпрыемстваў у Хойніках. Гамяльчанін працаваў на рамонце Хойніцкага камбіната бытавога абслугоўвання. Мужчына атрымаў пераломы абедзвюх ног.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

У **суд Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутнай без вестак Логінавай Валянціны Мікалаеўны, 28 кастрычніка 1965 года нараджэння, ураджэнкі в. Кіраў Нараўлянскага раёна, апошняе вядомае месца жыхарства — Гомельская вобл., Рэчыцкі раён, в. Маканавічы, д. 39.

Просім усіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Логінаву Валянціну Мікалаеўну, паведаміць суду Рэчыцкага раёна на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі на адрас: г. Рэчыцы, вул. К. Маркса, д. 30.

# ПАСЛЯ АДПАЧЫНКУ РАДЫЯЦЦЫЯ Ў ДЗЯЦЕЙ ЗМЕНШЫЛАСЯ Ў ДВА РАЗЫ

Амаль месяц правялі беларускія дзеці на адпачынку ў пансіянаце каля нямецкага горада Шопенштэдта. Перад выездам за мяжу і ў дзень вяртання хлопчыкі і дзяўчынкі з Віцебска, Ліды, Іўя, чарнобыльскіх вёсак Дзятлавічы Лунінецкага і Валаўск Ельскага раёнаў прайшлі тэсты на колькасць назапашаных бекерэляў радыенуклідаў у арганізмах. Вымярэнні ў лабараторыі спектраметрыі выпраменьвання інстытута радыяцыйнай бяспекі «Белрад» паказалі, што пасля аздараўлення шкодныя накапленні ад чарнобыльскага забруджвання зменшыліся ў два, а то і ў тры разы. У падлетка з Валаўска ўзровень бекерэляў папярэдне сягаў да васьмідзесяці, цяпер складае сорак два. А ў хлопчыка з Дзятлавічаў узровень знізіўся ажно ў 25 разоў.









Адпачынак для дзяцей арганізавала чарнобыльская ініцыятыва пад шматгадовым кіраўніцтвам Паўля і Ірэны Кохаў. Дзецям былі прадастаўлены гульнявыя і спартыўныя пляцоўкі, ім ладзіліся пазнавальныя экскурсіі, добрае харчаванне, знаёмства і пражыванне ў сем'ях.

— Для нас вельмі важна ведаць, што арганізаваныя адпачынкі даюць добры плён у здароўі і развіцці маленькіх гасцей з сяброўскай Беларусі, — кажа Паўль Кох і падкрэслівае, што і праз 25 гадоў пасля Чарнобыля яго краіна не застанецца ў баку ад дапамогі і гуманітарнага супрацоўніцтва з нашай краінай.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**

***На здымках: моманты адпачынку беларускіх дзяцей у Германіі і вымярэнне на крэсле спектраметрыі выпраменьвання чалавека ў Мінску.***

Ксёндз-пробашч касцёла ў Нясвіжы Пётр ШАРКО:

# «Турысты кажуць мне: «Што вы тут моліцеся, дайце храм паглядзець, мы здалёк ехалі!..»

**Касцёл Божага Цела ў Нясвіжы ўнікальны па многіх прычынах. Гэта — першы на тэрыторыі Усходняй Еўропы храм у стылі барока (збудаваны на замову Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі італьянскім архітэктарам Джавані Марыя Бернардоні ў 1593 годзе). Тут мясціцца трэцяя па велічыні крыпта-пахавальня ў Еўропе. І пахавальня гэтая не абы-каго, а саміх князёў Радзівілаў на чале з вялікім Сіроткам, які і збудаваў касцёл разам з замкам. Паглядзець на гэтыя помнікі архітэктуры ў Нясвіж штогод прыязджае каля 100 тысяч турыстаў. І гэта — з улікам таго, што замак зараз рэстаўруецца і можна пабачыць з сярэдзіны толькі невялікую ягоную частку. Распачалося ўжо і аднаўленне касцёла Божага Цела. Пра ўсё гэта мы гутарым з шаноўным ксяндзом-пробашчам Пятром ШАРКО.**



**Ксёндз Пётр ШАРКО годна апекуецца ўнікальным касцёлам Божага Цела ў Нясвіжы**

### «Я спадзяюся, што пры аднаўленні касцёла будуць зважаць на якасць, а не на тэрміны засваення сродкаў»

***— У прэсе прайшла інфармацыя, што зараз пачынаецца аднаўленне касцёла. На якой стадыі гэтая праца знаходзіцца?***

— Аднаўленне касцёла распачалося з самага пачатку года, з таго часу, калі былі выдаткаваныя сродкі з рэспубліканскага фонду, а менавіта з Міністэрства культуры — адзін мільярд беларускіх рублёў, і з абласнога бюджэту — таксама адзін мільярд беларускіх рублёў. Цяпер ідуць гістарычныя і інжынерныя даследаванні гэтага будынка, робіцца праектна-каштарысная дакументацыя: што менавіта патрабуе рэстаўрацыі, колькі гэта будзе каштаваць. Ад верасня плануецца распачаць капітальны рамонт даху. У 1944 годзе дах быў пашкоджаны пажарам ад бомбы і цалкам згарэў. І ў першапачатковы выгляд ён не вярнуўся, хоць ксёндз Каласоўскі, геніяльны чалавек, які вельмі шмат зрабіў для гэтага храма, вельмі ўдала тады затушыў пажар: не быў заліты будынак і фрэскі. У адрозненне ад нядаўняга пажару ў замку: там пры непрафесійным тушэнні шмат што пашкодзілі... У 1944 годзе пажар не патрапіў у касцёл, аднак амаль усе драўляныя канструкцыі даху згарэлі. І наколькі дазвалялі сродкі, рамонт даху быў праведзены: зрабілі новыя бэлькі, новую бляху. Гэта быў 1944 год, і рабілі гэта ўвосень, вельмі хутка — за 2,5 месяца. Ксёндз Каласоўскі збіраў у людзей яйкі, сала, іншыя прадукты — гэта ўсё прадавалася, і за атрыманыя грошы куплялася бляха, дамаўляліся з ляснічым, каб ён выдзяляў лес. На жаль, тады не быў адноўлены першасны выгляд даху — зразумела, які быў час... Бо дах, паводле гістарычных звестак з XVII стагоддзя — быў накрыты керамічнаю дахоўкаю, выробленай у форме лацінскай літары S — гэткія гістарычныя экзэмпляры падчас даследаванняў былі знойдзеныя пад дахам на скляпеннях. Ёсць прапанова такая, каб аднавіць тую дахоўку, а купалы пакрыць меддзю (ёсць адпаведныя гістарычныя звесткі). Было таксама шмат упрыгажэнняў на фасадзе касцёла, на даху... Гэта таксама Каласоўскі не меў магчымасці аднавіць. Знайшлі і такія цікавыя звесткі: на самым верхнім узроўні купала быў абсталяваны такі балконік, з якога па вялікіх урачыстасцях рабілі светлавую ілюмінацыю... Таксама стаялі фігуры розных святых, вазы на фасадзе — захавалася гэта цяпер толькі на цэнтральным фасадзе... Я спадзяюся, у працэсе рэстаўрацыі ўсе гэтыя страчаныя элементы вернуцца. Гэта тое, што плануецца зрабіць сёлета. Як будзе выглядаць далейшы працэс рэстаўрацыйны, гэта залежыць, зразумела, ад наяўнасці сродкаў. Адзінае, чаго я баюся, каб з касцёлам не было тое, што з замкам: будаўнікам вылучаюць сродкі і даюць тэрмін, каб іх засвоіць. Аднак у часе рэстаўрацыі заўсёды выяўляюцца новыя звесткі, дэталі, адкрыцці — і тады ў гэтыя тэрміны ўкласціся немагчыма... Я вельмі хачу, каб у нашым выпадку было ўсё зроблена не на хуткасць, а на якасць.

Фота Андрэя ДЫБОЎСКАГА.



**Касцёл Божага Цела збудаваны італьянскім дойлідам Бернардоні на замову нашага князя Радзівіла ў 1593 годзе.**

Аднак ужо ёсць трывога: згаданыя раней 2 мільярды трэба абавязкова «засвоіць» сёлета. І вось гэтае «засвоіць» мяне пужае.

### «У алтарнай частцы ўжо адвалілася некалькі кавалкаў фрэскі...»

***— Уважлівы вернік ці наведнік пабачыць: у храме ўжо адваліўся кавалак алтарнай фрэскі. У якім стане знаходзіцца ўнікальны жывапіс, фрэскі ў касцёле? Якога яны патрабуюць умяшальніцтва?***

— На гэты момант яны патрабуюць умяшальніцтва — замены даху. Бо займацца зараз фрэскамі — гэта нелагічна і неразумна. Просты чалавек, нават мой бацька, які мае 84 гады, сказаў бы: недарэчна рабіць рамонт у хаце, калі працякае дах, бо шпалеры ўсё роўна адлепяцца. Таму ў першую чаргу трэба забяспечыць дах, каб па сценах не цякла і не ўсмоктвалася гэтая вільгаць, больш абараніць касцёл ад грунтовых водаў, ад зменаў кліматычных і ўнутраных. Асабліва вялікая вільготнасць у касцёле ўвесну і ўвосень, калі ідуць дажджы. Добра было б паставіць якое прыстасаванне, каб гэтую вільгаць сцягваць, каб не асядала на сценах і на падлозе. ...Фрэскі не ў самым дрэнным стане. Але я не магу сцвярджаць як даследчык ці знаўца фрэсак, бо я з'яўляюся святаром. Павінна быць заключэнне спецыялістаў. У першую чаргу я скажу, што ў алтарнай частцы за 2 гады я заўважыў, што некалькі кавалкаў самой тынкоўкі не хочуць трымацца, адпадаюць... Але фрэскі — гэта з апошніх этапаў, як і арган, інтэр'еры...

***— Ваш касцёл адметны ад іншых яшчэ і тым, што ён зазнае вялікую навалу турыстаў, якія едуць да вас проста тысячамі. Скажыце як святар, наколькі дарэчна гэта ў храме, калі некалькі разоў на дзень сюды завальваецца цэлы аўтобус турыстаў, якія, не ведаючы правілаў паводзінаў у касцёле, пачынаюць нешта аглядаць, мацаць, патрабаваць?***

— Гэта нармалёвая практыка ва ўсім свеце — турызм. Толькі што вельмі часта праяўляецца такая тэндэнцыя нядобрая — калі турысты патрабуюць, каб мы адчынілі храм тады, калі гэта немагчыма, ці нават такія часамі казусы ўзнікаюць: «Чаго вы тут моліцеся, учынілі нейкі малебен, а мы здалёк прыехалі, хочам паглядзець, а вы нас не пускаеце пахадзіць па храме!» У першую чаргу гэта храм, святыня, дзе людзі могуць маліцца, узяць шлюб, ахрысціць сваіх дзяцей, паспавядацца, пабыць у цішыні. Гэты храм мае назву касцёла Божага Цела. Тут ёсць Хрыстос, захоўваюцца Святыя Дары. Часамі няма пашаны ў тых турыстаў. Робіш заўвагі, што неадпаведна апранутыя — абражаюцца і абураюцца: што вы тут ад нас хочаце, нам вельмі горача! Я кажу: ну, тады вы памыліліся. Як вам горача — ідзіце на пляж, а гэта — святыня. Ватыкан на мінулым тыдні вынес пастанову: не прапускаць на тэрыторыю Ватыкана, нават на плошчу перад саборам Святога Пятра ў неадпаведным адзенні: у майках без рукавоў і шортах, бо вельмі часта турысты прыходзяць ледзь не ў бікіні. Гэта неадпаведны строй. У музей ці рэстаран мы не ідзём у бікіні, а надзяваем прыгожую сукенку. Дык чаму ў касцёл ідзяце неадпаведна?

***— Якія тайны адкрыў Нясвіжскі касцёл за час Вашага служэння тут? Як лічыце, ці шмат тут тайнаў яшчэ?***

— Тайнаў, напэўна, шмат. Нават не тайнаў, а гістарычных звестак. Напрыклад, ні для нікога не з'яўляецца тайнаю, што ззаду і збоку касцёла быў езуіцкі калегіум, і падмуркі яго засталіся. Нават ёсць інфармацыя, што падвалы гэтага будынка захаваліся. У часе навуковай калегіі па рэстаўрацыі касцёла праблiснула нават прапанова аднавіць калегіум! Можа, гэта правільна, бо тут калі рабілі даследаванні глебы, рабілі зандажы, загналі зонд — правяралі, наколькі моцны грунт, на якім стаіць касцёл, — дык адзін зонд застаўся ў зямлі: якраз трапілі на гэты фундамент, і зонд у ім засеў. Хто будзе рабіць рэстаўрацыйныя працы праз 100 гадоў — знойдзе яго як гістарычную цікавостку!.. (усміхаецца) Хачу напрыканцы яшчэ раз звярнуцца да турыстаў, каб яны не падумалі, што я супраць іх наведвання. Мы заўжды рады бачыць усіх вернікаў і проста людзей, якія цікавяцца нашым касцёлам. Аднак заклікаю памятаць, што гэта — найперш Храм Божы, прызначаны для вернікаў. Але ў вольны час (парафіяне пагадзіліся на адпаведным пасяджэнні), з адпаведнымі ўмовамі наведвання касцёла (адзенне, паводзіны і г. д.), дазваляем гэта рабіць. Шчыра вітаем усіх!

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**
**Фота аўтара.**

## Вока — за вока?



**У Каралеўстве Саудаўская Аравія судовы працэс над удзельнікам бойкі з панажоўшчынай закончыўся гучным скандалам. Суд, кіруючыся прынцыпам «вока за вока», прапанаваў урачам зрабіць з падсуднага паралітыка.**

Скандальны прысуд гатовы вынесці суддзя горада Табук Сауд бэн Сулейман аль-Юсеф. Ён ужо звярнуўся ў некалькі клінік Эр-Рыяда з незвычайным запытам, піша газета The Daily Mail. Служка Феміды цікавіўся, ці могуць хірургі падчас аперацыі пашкодзіць хрыбетнік пацыента такім чынам, каб гэта прывяло да яго поўнай паралізацыі.

У адпаведнасці з законамі шарыяту ахвяры злачынстваў маюць права прасіць, каб злачынцу было нанесена дакладна такое ж калецтва, якое атрымалі яны ў выніку нападу. Гэта так званы прынцып таліёна, адлюстраваны ў знакамітай біблейскай формуле «вока за вока, зуб за зуб».

Як вынікае з матэрыялаў справы, якая цяпер знаходзіцца ў судаводстве горада Табук, 22-гадовы Абдул-Азіз Мутаіры два гады назад падчас бойкі атрымаў нажавое раненне ў спіну, у выніку якога яго паралізавала. Злачынца, які ўчыніў напад, быў арыштаваны і асуджаны да 14 месяцаў турэмнага зняволення. Аднак праз 7 месяцаў ён трапіў пад амністыю і выйшаў на волю.

Абдул-Азіз Мутаіры вырашыў скарыстацца маючым у яго правам і звярнуўся ў суд з просьбай судзіць злачынцу другі раз — па законах шарыяту. Гэта хадайніцтва суд задаволіў. Цяпер суддзя Сауд бэн Сулейман аль-Юсеф шукае медыкаў, якія ўзяліся б за правядзенне беспрэцэдэнтнай хірургічнай аперацыі на пазваночніку па ператварэнні здаровага чалавека ў інваліда ў якасці пакарання.

Пакуль мясцовая медыцынская супольнасць захоўвае вернасць клятве Гіпакрата. Ва ўсіх трох апытаных сталічных клініках на запыт суда быў атрыманы адмоўны адказ: хірургі са шкадаваннем паведамлялі, што яны не могуць правесці падобную аперацыю і наўмысна пашкодзіць пацыенту спінны мозг. Зрэшты, канчатковае рашэнне па іску Абдула-Азіза Мутаіры судом яшчэ не вынесена. Як заявіў у сувязі з гэтым прававым кур'ёзам адзін з вядомых саудаўскіх журналістаў, які вырашыў захаваць ананімнасць, ніводны доктар не вырашыцца на падобную аперацыю хоць бы таму, што сам можа апынуцца на лаве падсудных.

«Гэта — экстрэмісцкі звычай, ён не мае ніякіх адносінаў да мусульманскага закона, які прызнае вяршэнства міласэрнасці», — запэўніў журналіст.

## Магнітнае поле Зямлі можа знікнуць



**Французскія даследчыкі з Універсітэта імя Дэні Дзідро ўстанавілі, што змена зямных палюсоў можа адбыцца ў любы час. Прадказаць гэта магчыма толькі за 10-20 гадоў, больш доўгатэрміновы і дакладны прагноз немагчымы.**

Інверсіі магнітных палюсоў Зямлі неаднаразова адбываліся ў мінулым. Звычайна гэта суправаджалася кароткачасовым знікненнем магнітасферы. Для біясферы Зямлі гэта азначае станчэнне азонавага слоя і знікненне абароны ад сонечнага ветру і касмічнай радыяцыі. Калі «перапалюсоўка» завершыцца хутка, жыццё на нашай планеце можа захавацца, але калі Зямля застанецца без магнітнага поля хаця б на некалькі гадоў, гэта будзе азначаць гібель усяго жывога.

Паводле назіранняў навукоўцаў, цяпер напружанасць магнітнага поля Зямлі паступова падае. За апошнія 22 гады магнітнае поле Землі стала слабей амаль на 2 працэнты, прычым у некаторых частках Атлантычнага акіяна яно саслабела на 10 працэнтаў, праўда, у некаторых рэгіёнах яно трохі ўзмацнілася.

Зрушэнне магнітных палюсоў Зямлі было зарэгістравана яшчэ ў 1885 годзе. З таго часу паўднёвы магнітны полюс зрушыўся на 900 кіламетраў у бок Індыйскага акіяна, а паўночны — у бок Усходне-Сібірскай магнітнай анамаліі. Хуткасць дрэйфу палюсоў у наш час складае каля 60 кіламетраў у год, чаго ніколі раней не назіралася.

## Удмурцкі дэпутат прапанаваў адпраўляць жанчын у адпачынак на «крытычныя дні»

**Дэпутат Дзяржсавета Удмуртыі Энвіль Касімаў (фракцыя ЛДПР) выступіў з заканадаўчай ініцыятывай прадастаўляць жанчынам аплачваемы адпачынак на «крытычныя дні».**

Як паведаміў аўтар ініцыятывы ў інтэрв'ю адной з мясцовых газет, ён прапанаваў прыняць адпаведны закон. Паводле яго прапановы, жанчынам па іх заяве і на падставе выдадзенага ва ўстаноўленым парадку ліста непрацаздольнасці неабходна прадастаўляць адпачынак на перыяд менструацыі, але не больш чым на 2 дні з выплатай дапамогі па дзяржаўным сацыяльным страхаванні. Пры гэтым, паводле слоў Касімава, у Працоўным Кодэксе Расіі (частка 41) адлюстраваны асаблівасці рэгулявання працы жанчын, але не ўлічаны ўсе асаблівасці жаночага арганізма. «Мяркую, што многім вядома пра такую фізіялагічную з'яву, як менструацыя. У гэты перыяд жанчына аб'ектыўна непрацаздольная», — лічыць парламентарый.

Як паказала апытанне, праведзенае выданнем, мясцовыя жыхары падтрымліваюць такую ініцыятыву. Падчас апытання на зададзеную тэму на сайце газеты пераважная большасць (67 %) рэспандэнтаў пагадзіліся з ідэяй ліберал-дэмакрата. Пры гэтым 23 % удзельнікаў апытання прапанавалі ўвесці альтэрнатыўныя выхадныя — «пахмельныя» дні для мужчын. А яшчэ 10 % чалавек выступілі супраць выхадных для жанчын, справядліва мяркуючы, што працаваць у такім разе не будзе каму.

## У Бразіліі арбітр зарэзаў падчас гульні надаедлівага футбаліста, а ў Румыніі футбольны суддзя пасля матчу адстрэльваўся ад заўзятараў з пісталета



**У бразільскім горадзе Барэйра, што знаходзіцца на паўночным усходзе краіны, падчас матчу аматарскіх каманд «Рэдэнсао» і «Баа-Фе» адбыўся трагічны інцыдэнт, які забраў жыццё аднаго з футбалістаў.**

У адным з эпізодаў 26-гадовы арбітр Франсіска Чавес зафіксаваў фол на карысць гаспадароў поля. Ігрок прыезджай каманды Хасэ Рамас да Сілва не пагадзіўся з гэтым рашэннем і, падышоўшы да рэферы, ударыў яго нагой. На полі тут жа завязалася бойка, падчас якой суддзя выцягнуў аднекуль нож і пырнуў ім футбаліста ў грудзі. Брат пацярпелага, Франсіска да Сілва, які прыбег на падмогу, падчас сутычкі атрымаў некалькі нажавых раненняў у спіну. Ад атрыманых ран футбаліст сканаў яшчэ да прыезду хуткай, а яго брата здолелі давезці да бальніцы, і яго жыццю зараз нічога не пагражае, перадае FOXnews.

Футбольны арбітр пасля панажоўшчыны схаваўся ў невядомым напрамку, скарыстаўшыся адсутнасцю на аматарскай гульні паліцыянтаў. Улады штата абвясцілі яго ў вышук.

А вось румынскі футбольны арбітр Багдан Лука, які абслугоўваў у якасці бакавога суддзі матч чацвёртай лігі паміж камандамі акругі Калараш, абараняючыся ад заўзятараў, якія выбеглі на поле, выкарыстоўваў баявы пісталет, паведамляе РІА «Навіны» са спасылкай на мясцовыя СМІ.

Пагрозы ў адрас судзейскай брыгады з трыбун пачалі паступаць у першым тайме, калі каманда гаспадароў поля саступала суперніку з лікам 1:2. Яшчэ больш сітуацыя накалілася ў канцы матчу, пасля таго як Лука зафіксаваў афсайд, з-за якога галоўны суддзя адмяніў гол, забіты гаспадарамі сустрэчы. Паводле паведамленняў СМІ, калі пасля гэтага — вельмі спрэчнага — рашэння раз'юшаны натоўп заўзятараў выбег на поле, каб разабрацца з арбітрамі, Лука выхапіў пісталет і два разы стрэліў у паветра. Затым судзейская брыгада схавалася ў падтрыбунных памяшканнях.

Відэа з інцыдэнтам, знятае на камеру мабільнага тэлефона, з'явілася ў Інтэрнэце і выклікала бурную дыскусію. На кадрах выразна відаць, як суддзя сыходзіць з поля, трымаючы ў руках пісталет і судзейскі сцяжок. Дзе арбітр трымаў «ствол» на працягу ўсяго матчу, засталося няясным.

# «КАЛІ СОК АДБРОДЗІЦЬ — БУДЗЕ ВЕСЯЛЕЙ?»

## І куды падзеліся нарыхтоўшчыкі?

**Небывалы ўраджай садавіны сёлета, здавалася б, павінен быў зняць усе праблемы з нарыхтоўкай яе перапрацоўчымі прадпрыемствамі, але нашы кансервавыя і вінаробныя заводы з закупкай не спяшаюцца, хоць некаторыя з іх набылі толькі палову ад патрэбнага ці і таго меней. Сыравіны ўдосталь і яна, як ніколі, танная, то чаму б не весці закуп па максімуму?**



Сёння каля кожнай вясковай хаты расце хоць некалькі яблынь, і гэта не нізкарослыя «клоны», а магутныя разгалістыя дрэвы. Так што 4-5 такіх яблынь дадуць большы ўраджай, чым 25 кланападобных. І калі яблыкі ўрадзілі, то паўстае пытанне: «А што з імі рабіць?»

Колькі гадоў таму па вёсках ездзілі нарыхтоўшчыкі і машыну з прычэпам маглі загрузіць у адной вёсцы. Калі плацілі добра, то людзі здавалі не толькі апад, але і абтрасалі сад — не чакалі, пакуль яблыкі паспеюць. Гаспадару было выгадна ў адзін заход скінуць з рук клопат, бо пазней збыць садавіну даволі складана.

Нарыхтоўшчык ехаў ад хаты да хаты і прыпыняўся каля выстаўленых побач з брамай мяхоў, а бывала, што машына стаяла дзесьці на пляцоўцы ці перакрыжаванні і туды яблыкі падвозілі на веласіпедах, вазках, калёсах... Радавала людзей і тое, што нарыхтоўшчык, узважыўшы яблыкі, тут жа разлічваўся. Некаторыя гаспадары здавалі па 50-70 мяхоў. Мне і самому даводзілася такім чынам вызваляць агарод ад ападу. Няшмат было тых яблыкаў, але 3-4 мяхі за тыдзень набіралася. А сёлета прыходзіцца пускаць яблыкі на сок, але ж ва ўсім ёсць мяжа. Закрылі 20 літраў, то і дастаткова, бо запасліся і таматным. А яблыкаў на дрэвах, здаецца, меней не стала. Праўда, белы наліў адышоў, а вось антонаўкі і каштэлі шмат.



Каб разабрацца ў сістэме закупак, пачаў шукаць нарыхтоўшчыкаў. Раней найбольш іх было ў Баранавіцкага камбіната харчовых прадуктаў. На прадпрыемстве вырабляюць віно, і без яблычнага соку тут не абысціся.

— Сёння ў нас нарыхтоўшчыкаў няма, — заявіла начальнік аддзела забеспячэння Раіса Корпік.

**— Сёлета такое багацце яблыкаў, а ваша прадпрыемства адмовілася ад нарыхтоўшчыкаў?**

— А гэта звязана з тым, што мы не можам весці закупкі за наяўныя сродкі.

**— У такім разе, як ваш камбінат закупляе сыравіну, тыя ж яблыкі?**

— Набываем у райпа. Спажыўтаварыства закупляе ў насельніцтва, а мы ў яго.

**— Выгада тут ёсць?**

— Якая выгада, выжываем. Напрыклад, райпа за кілаграм яблыкаў людзям плаціць 150 рублёў, а нам прадае па 250 рублёў.

**— А чым займаюцца вашы нарыхтоўшчыкі?**

— Мы іх адправілі ў іншыя арганізацыі. Працуюць не толькі ў Баранавіцкім, але і іншых раёнах.

А як складваецца сітуацыя на Пінскім вінаробным заводзе? Тлумачэнні даў начальнік забеспячэння Віктар Каль.

— Завод нарыхтаваў ужо 50 працэнтаў сыравіны ад неабходнага.

**— Восень ужо наступіла. Паспееце закупіць патрэбную колькасць яблыкаў?**

— Калгасы яшчэ не здавалі, ды і нарыхтоўкай у нас займаюцца, пакуль снег не ўпадзе, так што ўправімся.

**— За кілаграм колькі плаціце?**

Закупляць пачалі па 100 рублёў, а з 2 жніўня цану паднялі да 150 рублёў, а з 16 жніўня апусцілі зноў да 100 рублёў — рынак, яблыкаў шмат.

**— У вас нарыхтоўшчыкі ёсць?**

— Напачатку ездзілі. Але прыйшлося ад іх паслуг адмовіцца, бо нерэнтабельна. Матляюцца па раёне, пакуль машыну яблыкаў назбіраюць.

**— А як закупляеце?**

— Ды праз гандаль. Ёсць крамы, туды насельніцтва яблыкі і здае.

Крамы, якія прымаюць яблыкі — гэта быццам бы добра, але не ў кожнай вёсцы яны ёсць. Неяк я пацікавіўся ў прадаўшчыцы сельскай крамы наконт здачы яблыкаў, і яна спытала:

— А колькі ў вас яблыкаў?

**— Ды мяхі чатыры.**

— Не, з-за чатырох мяхоў я машыну заказваць не буду.

Ехаў з дачы дамоў і прыпыніўся ў Крошыне. Зайшоў у краму і даведаўся, што яблыкі не закупляюць. Маўляў, з'явіўся нейкі нарыхтоўшчык, якому яблыкі можна здаць.

Сапраўды, каля адной з хат стаяў гаспадар, а за варотамі — мяхі з яблыкамі.

— Па тэлефоне абяцаў прыехаць, то вось з раніцы чакаю. А ён усё не едзе, — паскардзіўся мужчына.

У размове з людзьмі пачуў, што яны з вялікім задавальненнем здавалі б яблыкі і за прадукцыю, якую выпускае прадпрыемства-закупшчык. Напэўна, такі бартар павінен быў бы зацікавіць кансервавыя ды вінаробныя заводы. Калі ёсць праблема з наяўнымі грашыма, то прадукцыі на складах хапае.

Для прыватніка і такі варыянт падышоў бы, а вось у дзяржаўнага прадпрыемства прасторы для манеўру заўсёды меней.

Безумоўна, нарыхтоўшчыкі і раней працавалі не па адладжанай схеме. Ніхто дакладна не ведаў, калі нарыхтоўшчык прыедзе. Здаралася, што людзі з сабранымі яблыкамі чакалі дзень, другі..., а ён прыязджаў праз тыдзень. Але, тым не меней, нарыхтоўшчыкаў на вёсцы заўсёды чакалі, і яны часткова закрывалі праблему закупкі яблыкаў у насельніцтва.

Сельскія Саветы таксама маглі б праявіць ініцыятыву і паспрыяць людзям са збытам яблыкаў. Хіба нельга пацікавіцца, якія арганізацыі займаюцца нарыхтоўкай, у якіх вёсках будзе праводзіцца закупка, калі прыедуць і праз старастаў аб'явіць людзям.

З нарыхтоўкай садавіны ў кожным раёне свая сітуацыя. Напрыклад, у Ляхавіцкім знайшлі выйсце. Мясцовы кансервавы завод вырашае праблему з сыравінай на сваіх гектарах. Што вырасцілі, тое і пусцілі ў вытворчасць. І нядзіўна, што прадукцыя завода значна таннейшая, чым у канкурэнтаў.

А куды збывае насельніцтва яблыкі?

— Садоў у нас хапае, і паўстала пытанне наконт нарыхтоўкі яблыкаў, бо свая спажыўкааперацыя не можа іх «пераварыць». А праблему знялі камерсанты з Гомельскай і Гродзенскай абласцей. Яны займаюцца нарыхтоўкай садавіны, і ўсе задаволеныя. Хоць, магчыма, на нейкі аддалены хутар і не дабраліся, — паведаў старшыня Ляхавіцкага райсавета Яўген Юрлевіч.

Пры такім багатым ураджаі садавіны павінен быў бы адчувацца ўздым. Рух. Колькі гадоў таму машыны, гружаныя яблыкамі, ішлі праз горад даволі часта, а сёлета ніводнай не давялося ўбачыць. Раней у мясцовых газетах траплялiся на вочы аб'явы, у якіх насельніцтву прапаноўвалі выціснуць яблычны сок. Чалавек прывёз яблыкі, заплаціў нейкую тысячу за работу і дамоў паехаў з сокам. А то на бытавой сокавыціскалцы цэдзіш той сок цэлы дзень.

Нарыхтоўшчыкі — самае нізкае звяно ў закупачнай сістэме. А як яны працуюць і ці будуць увогуле займацца нарыхтоўкай — залежыць ад прадпрыемстваў, арганізацый, ведамстваў, якія маюць свае інтарэсы ў тых закупках. А можа, яшчэ нехта тыя інтарэсы і лабіруе.

Яблыкамі ўсыпаная зямля, у антонаўкі ад перагрузкі адарвала «лапу», і калі бачыш усё гэта, то наплывае млявасць. Але не ўсё так дрэнна. Некалькі бутляў з сокам стаяць на кухні пад сталом, і калі сок адбродзіць — будзе весялей...

**Сымон СВІСТУНОВІЧ**

**Фота аўтара.**

### Ганарымся!

#### БАЛЬНІЦА ІМЯ МАРЗОНА

Бабруйская гарадская бальніца хуткай дапамогі будзе насіць імя Уладзіміра Марзона.

Улады прысвоілі гэтай медыцынскай установе імя хірурга, прафесара, кандыдата медыцынскіх навук, заслужанага дзеяча навукі БССР.

Уладзімір Марзон яшчэ да рэвалюцыі працаваў урачом у Бабруйскім павеце, у Бабруйскай бальніцы стаў хірургам. За савецкім часам ён загадваў кафедрамі хірургіі ў Віцебскім медінстытуце і інстытуце ўдасканальвання ўрачоў, сумяшчаў практыку з актыўнай навукова-педагагічнай дзейнасцю, быў удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны. Цяпер бальніца ў Бабруйску будзе называцца імем гэтага слыннага беларускага медыка.

**Ілона ІВАНОВА.**

#### ПАМЯТНАЯ ДОШКА ЗЕМЛЯКУ

У Жыткавіцкай дзіцячай школе мастацтваў адкрылі мемарыяльную дошку кампазітару Уладзіміру Будніку, чыё імя носіць гэтая навучальная ўстанова. Вядомы беларускі кампазітар, аўтар песень «Пах чабаровы», «Палессе», «Белая лілея» і многіх іншых, нарадзіўся ў 1949 годзе ў невялікім палескім райцэнтры Жыткавічы. Першую музычную адукацыю ён атрымаў у Гомельскім вучылішчы імя Н. Сакалоўскага па класе баяна. Потым заканчваў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю па класе кампазіцыі. Пра кампазітара, які памёр тры гады таму, сябры і вядомыя дзеячы беларускай культуры гаварылі як пра адметнага мастака лірычнай песні. Выразнасць мелодый, эмацыйная непасрэднасць і нацыянальны каларыт забяспечылі вядомасць яго баладам, паэмам, мініяцюрам.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

#### У МІНСКУ ПЛАНУЕЦЦА ЎСТАНАВІЦЬ МЕМАРЫЯЛЬНЫЯ ДОШКІ

ў гонар народных артыстаў Віктара Роўды, Ганны Абуховіч, Валерыя Глушакова, а таксама заснавальніка беларускай школы хімікаў-аналітыкаў, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Рыгора Старабінца і Героя Сацыялістычнай працы, заслужанага ўрача БССР Аляксея Шубы. Цяпер у сталіцы ўстаноўлена больш за 460 мемарыяльных дошак і 150 помнікаў, бюстаў і скульптурных кампазіцый, што ўвекавечваюць памяць гістарычных падзей і вядомых людзей.

**Ала КАЗАКОВА,**
*«Мінск—Навіны».*

### СТРЭЛІЎ З АЎТАМАШЫНЫ Ў МАТАЦЫКЛІСТА

45-гадовы жыхар в. Расна ехаў на матацыкле «Мінск» дамоў. Непадалёку ад пас. Белавежскі (Камянецкі раён) яго нагнаў «Опель-Астра» без нумароў. Невядомы высунуў з аўтамашыны пнеўматычную вінтоўку і стрэліў у матацыкліста.

Быў уведзены план «Перахоп» і ў в. Чапялі аўтамашыну затрымалі. Устанавілі, што пашкоджанні з вінтоўкі матацыклісту нанёс пасажыр — беспрацоўны з пасёлка Белавежскі. Заведзена крымінальная справа.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

**Предложение о покупке акций ОАО «Минскводстрой» на баланс Общества**

| | |
|---|---|
| 1. Наименование акционерного общества | Открытое акционерное общество «Минскводстрой» 220090, г. Минск, ул. Широкая, 4, тел. 265 61 04 |
| 2. Цель приобретения акций | для продажи инвестору |
| 3. Количество приобретаемых акций | 353 простые обыкновенные акции |
| 4. Цена приобретения акций | 1 500 000 рублей за одну акцию |
| 5. Даты начала и окончания срока представления предложений акционеров на продажу акций | с 30.08.10 г. по 29.09.10 г. |
| 6. Даты начала и окончания срока заключения договоров купли-продажи | с 30.09.10 г. по 10.10.10 г. |
| 7. Адрес, по которому будут заключаться договора купли-продажи акций | г. Минск, ул. Шафарнянская, 11 (каб. 409). |
| 8. Сроки, форма и порядок оплаты акций | денежными средствами через бухгалтерию Общества, в течение 30 дней со дня заключения договоров купли-продажи акций |

УНП 600013209

*Управляющий по делу о банкротстве № 208-9Б/2008 Драницкий И.Г.*

**РЕАЛИЗУЕТ ЧАСТЯМИ С ПОВТОРНЫХ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ИМУЩЕСТВО, ПРИНАДЛЕЖАЩЕЕ ДОЛЖНИКУ СП «БЕЛТЕКСТ» ООО, г. БАРАНОВИЧИ.**

**В состав имущества входят:** легковой автотранспорт, ткацкое оборудование, смесовые ткани.

Каждая единица выставляемого на аукционные торги имущества реализуется отдельным лотом.

Цена на каждую единицу имущества снижена на 50 % от первоначально установленной.

Задаток на участие в аукционных торгах – 10 % от суммы приобретаемого имущества.

Шаг аукционных торгов: 10 %.

Цена в белорусских рублях определяется на день проведения расчетов по курсу Национального банка Республики Беларусь к доллару США с учетом НДС.

Торги состоятся **14.09.2010 г. в 12.00** по адресу: г. Барановичи, ул. Фабричная, д. 7, 7 этаж, зал заседаний РУП «Барановичское производственное хлопчатобумажное объединение».

Подробно с перечнем реализуемого имущества и его ценой можно ознакомиться на сайте Министерства экономики Республики Беларусь **www.ekonomy.gov.by.**

Для участия в аукционных торгах необходимо предоставить копии учредительных документов организации, заверенные в установленном порядке.

Победитель аукциона определяется в соответствии с максимально предложенной ценой.

Заявки на участие в торгах принимаются до **13.09.2010 г.** на почтовый адрес: 225410, Республика Беларусь, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7—67.

Управляющему по делу о банкротстве СП «Белтекст» ООО.

**Контактный тел. моб. (Velcom) 8 029 652 15 65, тел./факс (0163) 475561.**

УНП 200166488

### Вяртаючыся да надрукаванага

Настаўнік вышэйшай катэгорыі Яўген ВАСІЛЬЕЎ:

## «НЕЛЬГА Ў АДУКАЦЫІ КІРАВАЦЦА ПАСТУЛАТАМ «ДРЭННЫ ВЫНІК — ТАКСАМА ВЫНІК»

Мінуў месяц ад нашых публікацый на тэму праблемаў сярэдняй адукацыі («Звязда» ад 31 ліпеня і 4 жніўня), а водгукі працягваюць ісці. Пішуць людзі з самых розных куткоў Беларусі — настаўнікі, бацькі, проста неабыякавыя грамадзяне.

**Наша чытачка з Віцебска Е.Л. МІХЕЙКА** — інвалід 2-й групы з дзяцінства (ДЦП), адна гадуе дачку. Можна зразумець яе эмоцыі, калі чытаеш:

«...Малайцы, звяздоўцы! Напісалі ўсю праўду! І не ў брыво, а ў вока! ...Мая дачка не здолела паступіць на бясплатнае навучанне ў медычны каледж, хоць у школе была адной з найлепшых вучаніц, мае за 11 гадоў 30(!) граматаў і дыпломаў. Але ў выніку ўсіх эксперыментаў з адукацыяй засталіся пацярпелымі не толькі дзеці, але і бацькі, якія цяпер вымушаны вучыць дзяцей за свой кошт — пры тым, што чыноўнікі рэгулярна заяўляюць, што медыкаў у Беларусі не хапае. Колькі я не прасіла дапамагчы мне вывучыць дачку — дасылаюць адмову за адмовай. Толькі пасля маіх шматразовых зваротаў выдалі матэрыяльную дапамогу — 350 тысяч. А я не матэрыяльную дапамогу прасіла — дапамажыце вывучыць дачку!.. Зрабіце зніжку пры аплаце навучання! Нічога не змянілася — так і плачу 200 тысяч за месяц... Затое камісіі з праверкамі задавалі мне шмат пытанняў, сярод якіх: чаму я не падрыхтавала добра сваю дачку да паступлення і тэставання? Я дагэтуль не разумею: няўжо я сама мусіла яе рыхтаваць? А настаўнікі ў школе навошта? Я вучылася ў спецыяльнай школе, па палегчанай праграме — я не магу яе добра падрыхтаваць, бо мы шмат што не праходзілі! А рэпетытараў мы дазволіць сабе не можам, бо і так ледзьве выжываем... З нашымі заробкамі і пенсіямі ледзьве на харчаванне грошай хапае — тут ужо не да рэпетытараў... У тым, што дзеці не паступаюць, вінаватыя настаўнікі, а не бацькі. Любы настаўнік мусіць вучыць дзяцей так, каб не былі патрэбныя рэпетытары. ...У Савецкім Саюзе было 10 класаў, пра рэпетытараў і не чулі, у класах было па 30-40 чалавек — і выдатна паступалі, выдатна вучыліся. У Беларусі 11 класаў апынулася мала, трэба было зрабіць 12, а пасля не даць дзецям давучыцца 12-ы клас, прымусіць праходзіць за адзін год праграму двух класаў»

**Ветэран працы, настаўнік вышэйшай катэгорыі з вёскі Сасновая Асіповіцкага раёна Яўген Цімафеевіч ВАСІЛЬЕЎ** даслаў доўгі і ўдумлівы ліст. «...Палкія заявы аб гуманітарызацыі адукацыі прывялі да значнага скарачэння часу на вывучэнне матэматыкі, фізікі, хіміі, а па біялогіі наогул выйшлі на 1,5 гадзіны ў тыдзень. Пра якія інавацыі, пра якую «сіліконавую даліну» праз 15-20 гадоў можна будзе весці гаворку? Тыя дзве-тры сотні, няхай тысяча, самародкаў, пра якіх штогод гаворыцца, прызначаючы імянныя стыпендыі — іх яўна будзе недастаткова для паспяховага развіцця навукі і тэхнікі». Яўген Цімафеевіч піша, што мудрыя настаўнікі нават у часе няўдалага эксперымента з 12-гадовым навучаннем працягвалі карыстацца падручнікамі 11-годкі, не здавалі іх на макулатуру. І не прагадалі. Абураецца заслужаны настаўнік і тым, што «адзінка» па 10-бальнай шкале таксама лічыцца «пераводнай адзнакай» — гэта значыць, зарабіўшы за год «адзінку» па нейкім прадмеце, вучань усё адно пераходзіць у наступны клас! Ветэран працы задаецца пытаннем: «Мы змагаемся з другагоднiцтвам ці пакрываем безадказнасць і расхлябанасць асобных дзецюкоў?» Нельга ў адукацыі кiравацца пастулатам «дрэнны вынік — таксама вынік». Гэта не для людзей».

**Падпісчык «Звязды» з 25-гадовым стажам з пасёлка Дараганава Асіповіцкага раёна С.БАРОДЗІЧ** піша: «Прыведзеныя ў вашых артыкулах факты адпавядаюць рэчаіснасці. У большай ці меншай ступені, але яны прысутнічаюць амаль у кожнай школе. Заяўляю пра гэта як былы педагог са шматгадовым стажам. Прыпіскі і паказуха суправаджаюць школьнае жыццё вельмі даўно. У цяперашняй бюракратычнай сістэме яны непераадольныя — таму распачатая вамі дыскусія ні да чаго не прывядзе...»

...Такія лісты, шаноўныя чытачы, важныя для нас і для агучанай праблемы. Адзін з папрокаў, якія мы пачулі ад некаторых чыноўнікаў, — што некаторыя прыведзеныя ў газеце выказванні ананімныя. А ананімкам даверу, як вядома, няшмат. Але калі да нас пішуць настаўнікі вышэйшай катэгорыі, педагогі са шматгадовым стажам — і пад сваім іменем пацвярджаюць прыведзеныя факты, што цяпер скажуць?

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**

## БЕЛАРУСЬ ПАСПЯХОВА АЖЫЦЦЯВІЛА ДРУГІ ВЫПУСК, У ТОЙ ЧАС ЯК ЗАХОДНІЯ ЕЎРАПЕЙЦЫ ШУКАЮЦЬ ПАКРЫЦЦЁ

**РЭСПУБЛІКА Беларусь на мінулым тыдні вярнулася на рынак пасля дэбютнага выпуску аблігацый, які ажыццёўлены толькі два тыдні таму і карыстаецца попытам на рынках доўгу краін, якія развіваюцца, у той час як заходнееўрапейскія суверэнныя аблігацыі патаннелі.**

У панядзелак у выніку моцнага попыту на рынку доўгу краін, якія развіваюцца, Беларусь (рэйтынгі B1/B +/-) ажыццявіла дадатковае размяшчэнне аблігацый на суму 400 млн долараў ЗША да дэбютнага выпуску на суму 600 млн долараў ЗША пад стаўку 8,75 % з тэрмінам пагашэння ў 2015 годзе. За апошнія некалькі месяцаў павялічылася колькасць інвестараў з Заходняй Еўропы, якія звяртаюць увагу на рынкі доўгу краін, якія развіваюцца, для дыверсіфікацыі і атрымання больш высокага даходу ва ўмовах нізкіх працэнтных ставак.

Аднак гэта не азначае, што доўг краін, якія развіваюцца, неўспрымальны да хваляванняў аб эканамічным росце ў развітых краінах, наступствам якіх стаў значны распродаж іх доўгу, які набраў тэмп на працягу тыдня і прывёў да росту даходнасцяў па новых выпусках, якія павялічыліся да 15 базісных пунктаў. Напрыклад, даходнасць пяцігадовых іспанскіх даўгавых абавязацельстваў вырасла больш чым на 18 базісных пунктаў з моманту закрыцця біржы ў панядзелак да ўзроўню 2,786 %, паколькі назіралася падзенне глабальных фондавых рынкаў.

Нягледзячы на гэта, з'яўленне такога малавядомага эмітэнта з нізкім рэйтынгам паказала, якую перавагу маюць выпускі краін, якія развіваюцца.

«Гэта здзелка дэманструе сілу, якая захоўваецца, рынкаў, якія развіваюцца, як эфектыўнага сродку зберажэння, з попытам, які перавышае прапанову такім чынам, што, калі з'яўляецца якаснае імя на рынку доўгу краін, якія развіваюцца, усе інвестары ім цікавяцца», — сказаў Нік Дарант, кіраўнік сіндыката па рынках, якія развіваюцца, BNP Paribas, які выступае арганізатарам выпуску.

Дадатковае размяшчэнне было абумоўлена вялікім попытам, які дазволіў сабраць кнігу заявак больш чым на 1,1 млрд долараў ЗША. БНП Парыба, Дойчэ Банк, Каралеўскі Банк Шатландыі і Ашчадбанк выступілі ў якасці букранераў.

«Наяўнасць вялікага попыту павялічыла ўпэўненасць у рэалізацыі даразмяшчэння, асабліва прымаючы да ўвагі моцныя характарыстыкі аблігацыі і прыхільную рыначную кан'юнктуру», — сказаў Алан Роч, дырэктар сіндыката ў Каралеўскім Банку Шатландыі. «На пачатковым этапе мэтавы памер даразмяшчэння не быў вызначаны, але з партфелем заявак на 1,1 млрд долараў ЗША, аб'ём у 400 млн долараў ЗША выразна праглядваўся, што павялічыла поўны памер здзелкі да ўзроўню ў 1 млрд долараў ЗША, павялічваючы значнасць паперы ў якасці цэнавага індыкатара».

Аднак некаторыя ўдзельнікі рынку чакалі меншы аб'ём выпуску, прыкладна 200—300 млн долараў ЗША.

Большая частка была прададзена інвестарам, якія не ўцягнутыя ў першапачатковую здзелку, што ўласціва даразмяшчэнням папер, якія добра ацэньваюцца. Першапачаткова здзелка на 600 млн долараў ЗША была ацэнена на падставе кнігі заявак на суму звыш 1,5 млрд долараў ЗША.

«Выпуск аблігацый у дзве стадыі быў цалкам правільным падыходам — 600 млн долараў ЗША правільны аб'ём першапачатковага размяшчэння», — сказаў Роч.

Аналітыкі, не звязаныя з арганізацыяй выпуску, сказалі, што рашэнне па дадатковым выпуску каштоўных папер было разумным. Украіна, адна з супастаўных з Беларуссю дзяржаў, пацвердзіла, што ёй забяспечана атрыманне апошняй траншы крэдыту МВФ. Гэта таксама дапамагло Беларусі ажыццявіць выпуск у тых жа межах. Аблігацыі ўражваюць нізкай даходнасцю 7,880 % па стане на 4 жніўня ў параўнанні з першапачатковай




даходнасцю ў 9 %.

«У цяперашні час існуе шмат пазітыўных навін вакол краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы — гэта было правільнае рашэнне зрабіць выпуск цяпер, чым чакаць канца лета і не ведаць да чаго прыйдзем, і што можа здарыцца», — сказаў аналітык аддзела доўгу краін, якія развіваюцца, у Лондане.

Вядучыя менеджары ацанілі дадатковы выпуск каштоўных папер у 102 працэнты ад наміналу, што адпавядала даходнасці 8,251 % і знізіла ўзважаны сярэдні кошт фінансавання для Беларусі да 8,7 %.

Першапачатковы выпуск гандляваўся на ўзроўні ў 102,5 6 жніўня, і новы выпуск быў прапанаваны з прэміяй 50 цэнтаў, або 20 базісных пунктаў. На думку афіцыйнай асобы сіндыката, які не ўдзельнічаў у арганізацыі здзелкі, у чацвер перад гэтым здзелка выглядала дарагой, асабліва пасля таго, як яна аслабілася пасля прайсінгу...

«Даразмешчаныя паперы гандляваліся з даходнасцю прыкладна на 15 б.п. ніжэй, чым яны былі размешчаныя, і на 30 б.п ніжэй, чым паперы першапачатковага размяшчэння да правядзення даразмяшчэння», — сказала афіцыйная асоба сіндыката, які не ўдзельнічаў у арганізацыі здзелкі. «Даходнасць па аблігацыях Украіны з пагашэннем у 2016 годзе за аналагічны перыяд знізілася на 17 б.п. у той жа перыяд. Такім чынам, нягледзячы на тое, што рынак стаў слабейшым пасля прайсінгу даразмяшчэння, Беларусь усё яшчэ недаацэненая. Першапачатковае размяшчэнне гандлявалася асабліва добра ў сілу тэхнічных прычын, і 101 — гэта лепшая цана для такога аб'ёму выпуску або ім трэба было выйсці з меншым аб'ёмам, чым чакаў рынак».

«Але букранеры тлумачаць недаацэненасць феноменам, у адпаведнасці з якім новыя выпускі паказваюць дынаміку горш за рынак, калі сітуацыя на рынку пагаршаецца пасля прайсінгу. Прычына гэтаму — ліквідная прырода свежых здзелак. Прычына недаацэненасці гэта не наступства вельмі агрэсіўнага прайсінгу здзелкі», — сказалі яны. У панядзелак падчас вызначэння аб'ёму кнігі не назіралася адтоку аб'ёму заявак, калі цана даразмяшчэння была павялічана з 100,75 да 102.

«Мы не даразмяшчаліся вельмі агрэсіўна — гэта была правільная цана для гэтага дня», — сказалі букранеры. «Пашырэнне здзелкі зусім не звязанае з прайсінгам, яно звязанае з глабальнай эканомікай — калі рынак добры, новыя выпускі пераацэненыя, калі рынак дрэнны, яны недаацэненыя».

### АКНО МАГЧЫМАСЦЯЎ ЗАЧЫНЯЕЦЦА

Банкіры разыходзяцца ў меркаванні, ці змогуць іншыя эмітэнты з краін, якія развіваюцца, ажыццявіць здзелкі ў жніўні, які традыцыйна характарызуецца тым, што інвестары не ўкладваюць грошы. Але здзелка Беларусі падказала некаторым сур'ёзным кандыдатам зрабіць запыт адносна ажыццяўлення прыцягнення сродкаў напрыканцы лета.

«Ёсць апасенні, што ў жніўні некаторыя інвестары будуць адсутнічаць, але рынак моцны і ліквіднасць добрая, таму мы думаем, што гэта будзе правільны час для выхаду», — сказаў Роч. «Ёсць больш цяжкасцяў для ажыццяўлення добрага дэбюту ў жніўні, паколькі неабходнае «роуд-шоу», але для даразмяшчэння — гэта зручны час, як і ў выпадку з Беларуссю, на рынку дастатковы попыт нават напрыканцы лета».

«Акрамя таго, у верасні чакаецца канвеер выпускаў краін, якія развіваюцца, таму рабіць прапановы летам добрая прапанова, паколькі дазваляе пазбегнуць павышанай прапановы». Але Роч дадаў, што праз тыдзень можна чакаць змянення рынку, паколькі на працягу некалькіх мінулых дзён эканоміка ЗША выглядала слаба і выйшлі дрэнныя звесткі па Кітаі, гэта можа быць няўдалым часам для многіх іншых здзелак краін ЦВЕ, якія развіваюцца і якія будуць у гэтым месяцы.

У любым выпадку, мэта — стварыць бенчмарк міжнароднага доўгу Беларусі, якая агучвалася, калі Беларусь напрыканцы ліпеня ажыццяўляла першапачатковае размяшчэнне аблігацый, безумоўна, дасягнутая. Здзелка адкрые шлях будучым пазыкам для Беларусі, прадстаўнікі сіндыката сказалі, што ў хуткім часе мы можам убачыць на міжнародным рынку капіталу банкі і кампаніі з гэтай краіны, першым на чарзе стаіць Беларусбанк.

«Гэта здзелка дазволіла стварыць ліквідны бенчмарк для краіны, адкрыла дзверы беларускім карпаратыўным пазычальнікам і фінансавым інстытутам, паспяховы выпуск суверэна пратаптаў ім дарогу», — сказаў Дарант.

«Беларусь мела вялікую паспяховую гісторыю гэтым летам — спачатку бліскучае першапачатковае размяшчэнне і цяпер даразмяшчэнне, Беларусь прасунула сябе ў вышэйшую лігу бенчмаркаў аблігацый краін ЦВЕ. Беларусь заняла цвёрдае месца на карце паказчыкаў рынку аблігацый СНД».

**Пераклад артыкула, апублікаванага ў газеце Euroweek.**

# АХОВА
## ПАД ЗНАКАМ САВЫ

№ 8 (12)

СУМЕСНЫ ВЫПУСК «ЗВЯЗДЫ» І ДЭПАРТАМЕНТА АХОВЫ МУС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ




**„КУРСАНТАЎ ВУЧАЦЬ ПЕРАНОСІЦЬ НА ПРАЦЯГУ ДОЎГАГА ЧАСУ ФІЗІЧНЫЯ І ПСІХІЧНЫЯ НАГРУЗКІ БЕЗ ЗНІЖЭННЯ ПРАФЕСІЙНАЙ ПРАЦАЗДОЛЬНАСЦІ, ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ ТАКТЫКА-ТЭХНІЧНЫЯ ДЗЕЯННІ СІЛАВОГА ЗАТРЫМАННЯ НЯЎЗБРОЕНЫХ І ЎЗБРОЕНЫХ ПАРУШАЛЬНІКАЎ."**

**„ТЭОРЫЮ ЗАМАЦОЎВАЕМ НА ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАХ, ВУЧЫМ ДЗЕЙНІЧАЦЬ ПА СІГНАЛУ «ТРЫВОГА», ЯКІ ПАСТУПІЎ З АХОЎНАГА АБ'ЕКТА, ВА ЎМОВАХ, МАКСІМАЛЬНА НАБЛІЖАНЫХ ДА РЭАЛЬНЫХ."**

Віталь Аляксеевіч ДЗМІТРЫЕЎ, начальнік Установы адукацыі «Вучэбны цэнтр Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь» палкоўнік міліцыі:

# «НАША ЎСТАНОВА — ГЭТА МОЦНЫ КАЛЕКТЫЎ АДНАДУМЦАЎ-ЭНТУЗІЯСТАЎ, ЗДОЛЬНЫ ЯКАСНА НАВУЧАЦЬ МІЛІЦЫЯНЕРАЎ АХОВЫ»

**Што за ўстанова з'яўляецца кузняй кадраў для падраздзяленняў Дэпартамента аховы МУС? Якім азам і спецыяльным ведам вучаць будучых «ахоўнікаў»? На гэтыя пытанні адказаў начальнік Установы адукацыі «Вучэбны цэнтр Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь» палкоўнік міліцыі ДЗМІТРЫЕЎ Віталь Аляксеевіч.**



***— Віталь Аляксеевіч, сёлета вучэбнаму цэнтру споўнілася 17 гадоў. Па сутнасці, установа адукацыі ўступіла ва ўзрост паўналецця. Як усё пачыналася?***

— Загадам міністра ўнутраных спраў ад 24 красавіка 1993 года быў створаны вучэбны цэнтр па першапачатковай падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі радавога і начальніцкага складу міліцыі Аб'яднання «Ахова» пры МУС Рэспублікі Беларусь. Навучальнай установе былі бязвыплатна перададзены будынкі і маёмасць былога ваеннага гарадка ў пасёлку Гарані, за 27 кіламетраў ад Мінска. Узначаліў цэнтр палкоўнік міліцыі Генадзь Казлоў. Абагульніўшы існуючы на той момант вопыт падрыхтоўкі супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, менавіта ён распрацаваў і пачаў увасабляць у жыццё ідэі па спецыяльнай падрыхтоўцы супрацоўнікаў для падраздзяленняў аховы.

***— Як развіваўся цэнтр?***

— Станаўленне было справай няпростай. Першы год быў насычаны мерапрыемствамі па рэканструкцыі старых і ўзвядзенні новых карпусоў, падборы каманднa-выкладчыцкага складу, стварэнні неабходнай матэрыяльнай базы.

Штат установы за кароткі тэрмін быў укамплектаваны высокапрафесійнымі спецыялістамі. Утварыўся моцны калектыў аднадумцаў-энтузіястаў, здольны якасна навбучаць міліцыянераў аховы, даваць ім неабходны запас прававых ведаў, навыкі практычнай работы. Ужо ў ліпені 1993 года вучэбны цэнтр прыняў першых слухачоў — міліцыянераў-кінолагаў. Пачалася карпатлівая работа па навучанні азам міліцэйскай службы моладзі, якая вырашыла прысвяціць сваю працоўную дзейнасць барацьбе са злачыннасцю. Навучальны працэс вялі падпалкоўнікі Яленскі, Скуратовіч, Карабач, Сіманкоў, маёры Кастрыцкі, Чуднікаў, Бакуновіч, Ключнік. Першым кіраўніком вучэбнага аддзела быў падпалкоўнік міліцыі Стральцоў. Усе афіцэры былі дасведчанымі педагогамі, а ў мінулым — выдатнымі практыкамі.

Пастуова павялічваліся напаўняльнасць цэнтра, умацоўвалася вучэбна-метадычная і матэрыяльна-тэхнічная база. У 1998 годзе створана аддзяленне перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі, дзе навучаліся камандзіры страявых падраздзяленняў і іх наменснікі, начальнікі і інспектары ўсіх аддзелаў і службаў аховы.

***— Што дасягнута на гэты момант?***

— Сёння ўстанова адукацыі «Вучэбны цэнтр Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь» уваходзіць у сістэму органаў унутраных спраў Рэспублікі Беларусь як самастойная навучальная ўстанова, якая ажыццяўляе прыём кандыдатаў на службу ў органы ўнутраных спраў для праходжання першапачатковай падрыхтоўкі, а таксама павышэння кваліфікацыі радавога і начальніцкага складу і першапачатковую падрыхтоўку супрацоўнікаў Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

На тэрыторыі цэнтра функцыянуюць на 300—350 курсантаў і слухачоў два вучэбныя корпусы, абсталяваныя тэхнічнымі сродкамі навучання і наглядными дапаможнікамі, пункт аховы здароўя, гадавальнік службовых сабак і кіналагічная паласа перашкод, аўтадром, стралковы палігон, паласа перашкод для супрацоўнікаў, стадыён, інтэрактыўны цір.



***— Якія асноўныя кірункі дзейнасці вучэбнага цэнтра?***

— Упор робіцца на першапачатковую падрыхтоўку міліцыянераў і міліцыянераў-кінолагаў падраздзяленняў Дэпартамента аховы. Тэрмін навучання, у залежнасці ад адукацыі і службы ва Узброеных Сілах, складае тры або шэсць месяцаў. Павышэнне кваліфікацыі інспектараў-дзяжурных ОДС, камандзіраў страявых падраздзяленняў, інспектараў міліцэйскай, ваенізаванай і вартавой аховы, міліцыянераў груп затрымання, супрацоўнікаў падраздзяленняў па ахове ведамасных і банкаўскіх аб'ектаў праходзіць у тэрмін ад 5 да 14 дзён. У двухтыднёвы тэрмін мы рыхтуем кадры для ваенізаванай аховы. У сярэднім за адзін год у вучэбным цэнтры праходзяць падрыхтоўку 1200 курсантаў і слухачоў. Акрамя таго, на нашай базе праводзіць заняткі і вучэнні спецпадраздзяленне па барацьбе з тэрарызмам «Алмаз», асобная спецыяльная рота міліцыі Дэпартамента аховы, іншыя падраздзяленні МУС.

Прыбываючы ў вучэбны цэнтр, кандыдаты абавязкова здаюць нарматывы па агульнафізічнай падрыхтоўцы і пішуць дыктоўку. Пасля заканчэння навучання курсанты здаюць экзамены па профільных дысцыплінах: агнявой, фізічнай, юрыдычнай падрыхтоўцы, вярнуўшыся з вучэбнай практыкі — па тактыка-спецыяльнай падрыхтоўцы.

За 17 гадоў у нашым вучэбным цэнтры прайшлі падрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі больш за 15 тысяч супрацоўнікаў.

***— У чым заключаецца галоўная задача першапачатковай падрыхтоўкі?***

— У атрыманні курсантамі мінімуму спецыяльных ведаў, уменняў і навыкаў. Перш за ўсё, гэта юрыдычная падрыхтоўка, ідэалогія беларускай дзяржавы, прафесійная этыка, прафесійная псіхалогія, крыміналістыка, Правілы дарожнага руху, спецыяльная тэхніка АУС, асновы інфарматыкі і даўрачэбнай дапамогі пацярпелым, агнявая і фізічная падрыхтоўка.

***— Які з цыклаў можна назваць асноўным?***

— Цыкл тактыка-спецыяльнай падрыхтоўкі з'яўляецца прафілюючым пры падрыхтоўцы будучых міліцыянераў падраздзяленняў аховы. Падчас навучання шырока выкарыстоўваем вучэбныя відэафільмы, стэнды і іншыя вучэбныя дапаможнікі, распрацаваныя выкладчыкамі цыкла.

Тэорыю замацоўваем на практычных занятках, вучым дзейнічаць па сігналу «трывога», які паступіў з ахоўнага аб'екта, ва ўмовах, максімальна набліжаных да рэальных. Вырашаем сітуацыйныя задачы, праводзім групавыя практыкаванні, вучэнні, дзелавыя і сітуацыйныя гульні, разбіраем праблемныя сітуацыі. Тактыку дзеянняў курсанты адпрацоўваюць на вучэбных аб'ектах у поўнай экіпіроўцы, вучым таксама захоўваць меры асабістай бяспекі пры аглядзе аб'ектаў, дзеяннях унутры памяшканняў, затрымліваць правапарушальнікаў, абыходзіцца са зброяй.

Упор робім на чатыры асноўныя моманты. Першы — падрыхтаваць да самастойнага выканання службовых абавязкаў, звязаных з аховай усіх формаў уласнасці, грамадскага парадку ад супрацьпраўных замахаў, барацьбой са злачыннасцю ў зонах пастоў і маршрутаў патрулявання. Другі — узброіць ведамі тэарэтычных палажэнняў і патрабаванняў нарматыўных прававых актаў, якія рэгламентуюць дзейнасць АУС у цэлым і падраздзяленняў аховы ў прыватнасці. Трэці — правільна ацэньваць умовы і межы прымянення і выкарыстання зброі, спецсродкаў і фізічнай сілы. І чацвёрты — тактычна правільна дзейнічаць пры атрыманні сігналу «трывога» з ахоўных аб'ектаў, жылых дамоў грамадзян, праводзіць асабісты агляд затрыманых.

***— Якое значэнне надаецца фізічнай падрыхтоўцы курсантаў?***

— Курсанты абавязаныя выпрацаваць навыкі самаабароны, затрымання і суправаджэння правапарушальніка, вывучыць правілы абароны пры нападзе зламысніка са зброяй, авалодаць тэхнікай асноўных удараў, навучыцца ўзаемадзейнічаць з калегамі. Курсантаў вучаць пераносіць на працягу доўгага часу фізічныя і псіхічныя нагрузкі без зніжэння прафесійнай працаздольнасці, выкарыстоўваць тактыка-тэхнічныя дзеянні сілавога затрымання правапарушальнікаў з выкарыстаннем прыёмаў самаабароны, спецсродкаў.

***— А што датычыцца агнявой падрыхтоўкі?***

— Мы дабіваемся набыцця цвёрдых навыкаў валодання агнястрэльнай зброяй, ведання і строгага выканання мераў бяспекі ў абыходжанні са зброяй пры нясенні службы, правядзенні стрэльбаў, выкананні нарматываў па агнявой падрыхтоўцы, умоў і парадку выканання практычных практыкаванняў з пісталета і аўтамата. Кожны курсант вывучае тут прызначэнне і прыстасаванне, набывае ўменні і навыкі абыходжання з пісталетам Макарава, аўтаматамі АК-74, АКС-74, АКС-74У.

Наш стралковы палігон спланаваны так, каб на адной замкнёнай прасторы можна было страляць з аўтамата і пісталета. Практыкаванні выконваюцца самыя розныя. Для больш якаснага валодання табельнай зброяй у нас ёсць інтэрактыўны цір.

***— Супрацоўнікі падраздзяленняў аховы нярэдка ўдзельнічаюць у раскрыцці самых розных злачынстваў. Што ў гэтым плане дае вучэбны цэнтр?***

— Ёсць, напрыклад, прадмет «крыміналістыка». Для вызначэння сапраўднасці дакументаў у спецкласе прадстаўленыя ўзоры сапраўдных і падробленых дакументаў і грашовых знакаў. Акрамя таго, вучым прыёмам і метадам збору і даследавання доказаў, вядзенню следчых дзеянняў, пошукавых і вышуковых мерапрыемстваў.

***— Гэта значыць, вучыце быць гатовымі да дзеянняў у любой сітуацыі?***

— Безумоўна. Міліцыянер аховы, акрамя супрацьстаяння крымінальным праявам, павінен умець, напрыклад, аказаць першую даўрачэбную дапамогу пацярпеламу да прыезду ўрачоў. Вучым слухачоў паслядоўнасці яе аказання, правілам транспарціроўкі пацярпелага ў выніку здарэння.

***— Прафесія міліцыянера звязаная з рызыкай і стрэсавымі сітуацыямі...***

— У складзе аддзела кадраў ёсць група псіхалагічнага суправаджэння. Праз рукі спецыялістаў праходзяць усе кандыдаты на службу, а затым ажыццяўляецца псіхалагічнае суправаджэнне супрацоўнікаў пастаяннага і пераменнага складаў, трэнінгавая работа ў вучэбных групах, псіхалагічнае кансультаванне.

Псіхолагі вучэбных узводаў удзельнічаюць у стварэнні спрыяльнай атмасферы ў калектыве і зняцці бар'ераў зносінаў паміж курсантамі, дапамагаюць курсавым афіцэрам падабраць кандыдатуры на пасады камандзіраў вучэбных узводаў.

Да псіхолагаў па кансультацыі звяртаюцца супрацоўнікі пастаяннага і пераменнага складу вучэбнага цэнтра.

***— А акрамя вучобы, якую работу праводзіце з асабовым складам?***

— Міліцыянер — гэта перш за ўсё прадстаўнік закона, дзяржавы, калі хочаце. Таму вялікае значэнне надаём ідэалагічнаму, маральнаму выхаванню. Возьмем урачысты рытуал прыняцця Прысягі курсантамі першапачатковай падрыхтоўкі (дарэчы, з пачатку года праведзена 10 рытуалаў, у якіх прысягу прынялі 502 курсанты). Афіцэрамі аддзела кадраў выпрацоўваюцца і ўручаюцца навабранцам віншаванні з прыняццем Прысягі. А сам рытуал праводзіцца ва ўрачыстай абстаноўцы, з запрашэннем родных і блізкіх, кіраўнікоў Дэпартамента аховы, ветэранаў Вялікай Айчыннай і службы аховы, духавенства.

А на працягу навучальнага працэсу арганізуем экскурсіі па памятных і гістарычных месцах. Праводзім спаборніцтвы па розных відах спорту, арганізуем канцэрты, сумесныя мерапрыемствы з БРСМ, цяжкімі падлеткамі, дзіцячымі дамамі...

***— Якія перспектывы развіцця вучэбнага цэнтра?***

— Нядаўна ўвялі ў дзеянне аўтадром для навучання вадзіцеляў катэгорыі «В». Рыхтуем вадзіцеляў як з ліку курсантаў першапачатковай падрыхтоўкі, так і з цывільных асобаў. Сёлета ўведзены ў эксплуатацыю новы двухпавярховы вучэбны корпус, у якім размешчаны медыка-аздараўляльны комплекс і вучэбныя аўдыторыі. Заканчваем рэканструкцыю яшчэ аднаго з вучэбных аб'ектаў для правядзення заняткаў па тактыка-спецыяльнай падрыхтоўцы.

У перспектыве развіцця ўстановы — увядзенне ў эксплуатацыю новага 4-павярховага вучэбнага корпуса, што дазволіць адначасова навучаць да 500 курсантаў і слухачоў.

А наогул, маючы такую матэрыяльна-тэхнічную базу, згуртаваны, прафесійна падрыхтаваны калектыў выкладчыкаў, мы гатовыя якасна навучаць маладое пакаленне азам міліцэйскай прафесіі, што і робім цалкам паспяхова.

**За 17 гадоў у вучэбным цэнтры прайшлі падрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі больш за 15000 супрацоўнікаў.**




**З пачатку года ва ўрачыстай абстаноўцы праведзена 10 рытуалаў прыняцця Прысягі. Быць вернымі Радзіме і свайму народу далі клятву 502 курсанты вучэбнага цэнтра.**

## Молада — не «зелена»

### Баявое хрышчэнне

**У 1.35 на пульт Цэнтральнага (г. Гомеля) аддзела аховы ад дзяжурнага Цэнтральнага РАУС паступіла інфармацыя аб моладзі, якая хуліганіла ў двары. Для праверкі на месца выехала група затрымання ў складзе прапаршчыка міліцыі Руслана Навуменкі, міліцыянера-кінолага малодшага сяржанта міліцыі Ігара Лушча і міліцыянера-вадзіцеля сяржанта міліцыі Сяргея Філіпенкі, для якога гэтая дзяжурная змена аказалася першай пасля допуску да самастойнага нясення службы і запомнілася надоўга.**



Міліцыянеры спрабавалі выслухаць усхваляваных грамадзян, якія, перабіваючы адзін аднаго, стараліся расказаць пра тое, што іх таварыша збіў невядомы малады чалавек. Зламыснік разбіў аб галаву ахвяры шкляную бутэльку, а пасля нацкаваў на хлопца свайго сабаку — ратвейлера. Не паспелі праваахоўнікі да канца апытаць пацярпелых і высветліць акалічнасці справы, як з-за рога дома выбег чалавек з нажом у руках і скамандаваў свайму сабаку «фас!», паказваючы на міліцыянераў і людзей, якія стаялі побач.

Магутная жывёліна кінулася на людзей. Малады міліцыянер-кінолаг Ігар Лушч, правільна ацаніўшы абстаноўку, хутка і дакладна зарыентаваўся і прымяніў спецыяльны сродак «Шок» для абясшкоджвання сабакі байцоўскай пароды.

А для таго, каб спыніць нападніка з нажом, давялося прымяніць прыёмы самаабароны, спецыяльныя сродкі аховы і выкарыстаць дапамогу службовага сабакі па мянушцы Тайгур. 23-гадовы гамяльчанін і пацярпелыя для далейшага разбору былі дастаўленыя ў Цэнтральны РАУС.

Гэты прыклад найлепшым чынам пацвярджае прафесіяналізм маладых супрацоўнікаў, якія прыходзяць у падраздзяленні аховы пасля вучэбнага цэнтра Дэпартамента аховы.

### «Меламан»

Мітуслівага маладога чалавека нарад Бабруйскага аддзела аховы ў складзе міліцыянера-кінолага старшыны Уладзіміра Максімава і малодшага сяржанта Аляксея Усава прыкмеціў ужо даўно. Аднак каб канчаткова пераканацца ў вінаватасці падазронага, прыйшлося пачакаць.

Нервова азіраючыся па баках, пад покрывам ночы хлопец важдаўся каля аўтамабіля, які стаяў у двары па вул. Піянерскай, 8. З кожнай хвілінай падазрэнне міліцыянераў станавілася ўсё больш істотным, і калі начны «аўтамабіліст» дастаў з машыны аўтамагнітолу, сумненні развеяліся — злодзей.

Паведаміўшы пра здарэнне ў дзяжурную службу, нарад пачаў затрыманне. Пачуўшы вокрык «Стой, міліцыя!», зламыснік кінуўся ўцякаць. Але ніяк не чакаў, што наўздагон накіруецца такі ж малады міліцыянер, ды яшчэ і ў выдатнай фізічнай форме. Менавіта дзякуючы Аляксею Усаву на зламысніку зашчоўкнуліся наручнікі.

Зладзюжкам аказаўся 16-гадовы жыхар Бабруйска, які ўжо неаднойчы прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці. Аднак на гэты раз справа набыла крымінальны характар.

## МАЛАДОСЦЬ НЕ ПЕРАШКОДА ДЛЯ ПРАФЕСІЯНАЛАЎ



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Старшы сяржант Віктар Гайдук і малодшы сяржант Сяргей Акуленка служаць у міліцыі ў Барысаўскім Дэпартаменце аховы МУС Рэспублікі Беларусь адносна нядаўна. Праўда, гэта не з'яўляецца для іх перашкодай у прафесійным выкананні сваіх службовых абавязкаў. У Барысаўскім раёне пад аховай мясцовага аддзела Дэпартамента аховы каля 2500 аб'ектаў і жылых дамоў грамадзян. І што прыемна адзначыць, гавораць супрацоўнікі міліцыі, якія служаць «пад знакам савы», давер да дэпартамента аховы расце. Як пацвярджэнне таму — колькасць абсталяваных сродкамі ахоўнай пажарнай сігналізацыі кватэр, жылых дамоў грамадзян, а таксама аб'ектаў самых розных формаў уласнасці павялічылася амаль на 200 адзінак.

З улікам гэтых абставінаў можна не сумнявацца, што прэстыж службы «пад знакам савы» мае высокі рэйтынг. А таму кожны выезд на дзяжурства толькі дадае супрацоўнікам міліцыі прафесійнага вопыту.

**Маючы такую матэрыяльна-тэхнічную базу, згуртаваны, прафесійна падрыхтаваны калектыў выкладчыкаў, тут якасна вучаць маладое пакаленне азам міліцэйскай прафесіі.**



## Молада — не «зелена»

### «Мабільныя» хлопцы

Каля паўночы да аператара АЗС звярнулася ўсхваляваная магіляўчанка, якая ў істэрыцы спрабавала патлумачыць, што на яе напалі двое невядомых і выкралі мабільны тэлефон. Супрацоўніца запраўкі націснула трывожную кнопку і літаральна праз пару хвілін на месца прыбыла група затрымання Ленінскага (г. Магілёва) аддзела аховы ў складзе нядаўняга выпускніка вучэбнага цэнтра міліцыянера-кінолага малодшага сяржанта Уладзіміра Лазаранкі і міліцыянера-вадзіцеля прапаршчыка Аляксея Навуменкі.

Прыбыўшы на месца, міліцыянеры апыталі сведак, вызначылі прыкметы зламыснікаў, а затым сталі адпрацоўваць бліжэйшыя вуліцы, спрабуючы вызначыць магчымыя шляхі адыходу рабаўнікоў. Дакладныя і граматныя дзеянні супрацоўнікаў міліцыі ўжо праз 10 хвілін далі станоўчы вынік — падобныя па прыкметах маладыя людзі спяшаліся ў раён прыватнага сектара. Убачыўшы патрульную машыну, падазроныя кінуліся ўцякаць, а адзін з іх спрабаваў пазбавіцца ад мабільнага тэлефона, выкінуўшы яго на газон. Але фізічная падрыхтоўка «ахоўнікаў» аказалася на вышыні, таму затрыманне было ажыццёўлена ў секунды.

За той непрацяглы час, які заняла ўся аперацыя па затрыманні, усхваляваная жанчына змагла вярнуць страчаны сродак сувязі, а непрацуючыя магіляўчане так бязглузда «зарабілі» артыкул Крымінальнага Кодэкса.

### Доўгачаканыя «госці»

Інфармацыя пра тое, што з тэрыторыі будынка, які ўзводзіцца па вуліцы 30 гадоў Перамогі, плануецца крадзеж, паступіла ў Ленінскі (г. Магілёва) аддзел аховы ў 22.10. У гэты час нясенне службы па ахове аб'ектаў і грамадскага парадку на тэрыторыі Ленінскага раёна ажыццяўляла група затрымання ў складзе міліцыянера-вадзіцеля прапаршчыка міліцыі Віталя Касякова і міліцыянера-кінолага малодшага сяржанта міліцыі Максіма Касцова. Прыбыўшы на месца, супрацоўнікі арганізавалі скрытае назіранне, у выніку якога неўзабаве затрымалі «ВАЗ-2106», які з выключанымі габарытнымі агнямі пакідаў тэрыторыю будоўлі. У салоне машыны знаходзіліся чацвёра непрацуючых магіляўчан, а ў багажніку было знойдзена шэсць трубак выкрадзенага рубероіду.

Падчас абходу тэрыторыі Максім Касцоў са службова-вышуковым сабакам Графам знайшоў яшчэ аднаго маладога чалавека, які спрабаваў схавацца ў будаўнічых канструкцыях будынка. Спачатку затрыманы ўсяляк адмаўляў сваё дачыненне да здарэння, але затым усё ж прызнаўся ў загадзя спланаваным крадзяжы будаўнічых матэрыялаў. Гэтаму садзейнічала тое, што Граф знайшоў неабвержныя доказы — вярoўкі і пальчаткі, выкарыстаныя пры выцягванні рубероіду з бытавых памяшканняў. Пасля такой знаходкі апраўдвацца не было сэнсу.




## Вопыт — на службу

Прапаршчык міліцыі Віталь Шутко і старшына міліцыі Віталь Лосеў служаць у Дэпартаменце аховы г. Віцебска ўжо даўно. Экіпаж мае багаты вопыт у сваёй прафесійнай дзейнасці, таму падчас дзяжурства ў іх не ўзнікае праблем, як адрэагаваць на парушальнікаў правапарадку ў гарадскім парку ці справіцца з хуліганамі. Гэта частка іх працы.

Асноўная прафесійная работа — ахова маёмасці грамадзян і юрыдычных асобаў. Прыватныя кватэры, гаражы, прадпрыемствы, банкаўскія ўстановы. Гэта далёка не поўны спіс аб'ектаў, якія могуць ляжаць на маршруце падчас дзяжурства. У выпадку спрацоўвання сігналу «трывожнай» кнопкі супрацоўнікі міліцыі ў лічаныя хвіліны будуць на месцы і па гарачых слядах возьмуць парушальнікаў.




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

## ХТО Ў ЛАГЕРЫ МАЦНЕЙШЫ?

Летнія канікулы падышлі да фінішнай рысы, і апошнія змены ў летніх аздараўляльных лагерах завяршылі сваю работу. Каб гэтыя прыемны час дзеці памяталі як мага далей, супрацоўнікі Заводскага (г. Мінска) аддзела Дэпартамента аховы, пры ўдзеле аддзела БРСМ Заводскага раёна сталіцы, вырашылі зрабіць ім невялікі сюрпрыз — правялі спартыўна-забаўляльнае мерапрыемства, у якім самі ж прынялі непасрэдны ўдзел.

Паводле слоў начальніка Заводскага (г. Мінска) аддзела аховы Івана Трусевіча, «такія мерапрыемствы праводзяцца ва ўсіх лагерах, дзе намі ажыццяўляецца ахова парадку, у гэтым годзе гэта — летні лагер «Лясны агеньчык». Мы хочам бліжэй пазнаёміць падлеткаў з супрацоўнікамі міліцыі, а таксама з іх дзейнасцю, каб даказаць ім: міліцыянер — сябар для падрастаючага пакалення. А яшчэ гэта выдатны наглядны прыклад для тых, хто вырашыць выбраць сабе ў будучыні менавіта нашу прафесію».



Фота Алены ЯРМАЛІНСКАЙ.

Пасля насычанай спартыўнай праграмы дзеці глядзелі паказальныя выступленні супрацоўнікаў Заводскага аддзела аховы. А затрыманне імправізаванага зламысніка выклікала проста непадробнае захапленне. Пасля ўсе ахвотныя змаглі сфатаграфавацца са службовым сабакам, прымераць бронекамізэлькі і шлемы, пасядзець у патрульнай машыне.

Спартландыя прадоўжылася перацягваннем каната, а пераможцы сярод падлеткаў скарысталіся магчымасцю падужацца сіламі з супрацоўнікамі аховы. Ахвотнікаў паспаборнічаць з міліцыянерамі аказалася так шмат, што праз пару хвілін сілы аказаліся няроўнымі. Але хто ж паспрачаецца з дзецьмі...

А пасля ўсе дружна адправіліся на стадыён, дзе адбыўся таварыскі матч па міні-футболе — супрацоўнікі аховы супраць юнацкай каманды лагера. Падлеткі не давалі спуску «ахоўнікам», ды і міліцыянеры не ўдарылі ў гразь тварам, таму ва ўпартай барацьбе перамагло сяброўства — 6:6.

У канцы спартыўнага свята каманды-пераможцы атрымалі граматы і каштоўныя прызы ад «завадчан». А многія дзеці прызналіся, што ў далейшым хочуць стаць такімі ж моцнымі, мужнымі і... дружалюбнымі міліцыянерамі.

Матэрыялы спецвыпуску падрыхтавалі
Уладзімір ЗДАНОВІЧ,
Аляксандр ГЕРАСІМАЎ,
Алена ЯРМАЛІНСКАЯ.

Казкі для дарослых

...Божа, які жах!.. Яна столькі разоў уяўляла сабе, як гэта выглядала збоку... Цягнік ужо гатовы крануцца з месца, яна ўскоквае на падножку, адпіхвае правадніцу і ўрываецца ў вагон. Ён стаіць у праходзе ля акна насупраць свайго купэ. Няма сумнення, што ён усё бачыў: і як яна рванула з месца, і як праціснулася ў тамбур. І цяпер ён чуе, як правадніца бяжыць за ёю і крычыць на ўвесь вагон: «Дзяўчына, як вам не сорамна! Я зараз міліцыю паклічу!». Чуе і не паварочвае галавы, а рукі трымае ў кішэнях... Яна падлятае і кідаецца яму на шыю, і вісіць так секунд дваццаць. Цэлую вечнасць вісіць... Але ён не мяняе позы. Потым асцярожна, але настойліва расчэплівае яе рукі і гаворыць толькі адно слова: «Ідзі...».

Яна выходзіць, не адчуваючы ног. Ёй не хапае паветра... Людзі высоўваюць галовы з дзвярэй купэ і глядзяць на яе са здзіўленнем і асуджэннем. Правадніца працягвае лаяцца...

* * *



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# У апошні раз...

Два гады яна чакала пісьмаў, уздрыгвала ад тэлефонных званкоў. Два гады не знаходзіла сабе месца, блукаючы ў адзіноце па тых вуліцах, дзе некалі яны хадзілі ўдваіх. Варушыла ў памяці старое, аналізавала свае паводзіны, корпалася ў дэталях. І нічога не магла зразумець... Тры месяцы такога шчасця, такой блізкасці... Ён падпарадкаваў яе сабе цалкам настолькі, што нічога свайго ў ёй ужо не засталося. Яна растварылася ў ім, як лыжачка цукру ў шклянцы кіпеню... За месяц да яе дня нараджэння ён сказаў, што хоча падарыць ёй паездку ў горад усіх закаханых — Парыж... Сем дзён яны жылі ў атэлі «Рыц» на Вандомскай плошчы. Любаваліся зіхаценнем фантанаў на фоне серабрыста-шэрага парыжскага неба, каталіся на параходзіку і гулялі па набярэжнай Сены, каштавалі вустрыц у маленькай кавярні непадалёку ад Манмартра і скуплялі ахапкамі жоўтыя цюльпаны... Ён гаварыў, што ў іх жыцці будзе яшчэ шмат такіх паездак і шмат кветак — усялякіх, якія яна пажадае...

А потым, пасля вяртання дадому, усё змянілася. Яны жылі ў розных гарадах, ён прыязджаў да яе на выхадныя, а часам і ў будні. Зрэдку на машыне, часцей на цягніку. Так было і ў апошні раз. Ён пазваніў ёй з вакзала, сказаў, што ў яго мала часу і што трэба сустрэцца. Яна паімчала туды на крылах, спадзеючыся на... На што? На што звычайна спадзяецца жанчына, якая страціла розум ад кахання?.. «Мы не зможам больш сустракацца», — сказаў ён, стоячы ля вагона цягніка, які вось-вось павінен быў адысці... Самае недарэчнае пытанне, якое задаюць услед за гэтай фразай жанчыны — «Чаму?». Яна таксама не стрымалася і спытала. Ён сумна ўсміхнуўся: «Прычына не ў табе...». Развярнуўся і пайшоў да вагона.

* * *

Калі гэта было? Дзесяць гадоў таму ці цэлую вечнасць? І ці было ўвогуле? Два гады яна чакала пісьма ці тэлефанавання, здаралася, раптоўна падхоплівалася і кідалася да тэлефона за некалькі секунд да таго, як ён пачынаў званіць. Але гэта былі НЕ ТЫЯ званкі, іншыя людзі, чужыя мужчыны... Мужчыны... Спачатку яна ненавідзела іх — усіх разам і кожнага паасобку, таму што яны былі не ІМ. Потым нянавісць змянілася на абыякавасць... Яна была прывабнай дзяўчынай, а ператварылася ў прыгожую жанчыну, для якой цяпер галоўным у жыцці стала кар'ера. Расчышчаючы сабе месца пад сонцам, яна запісвалася на ўсялякія курсы, вывучала разнастайныя мовы, спасцігала таямніцы іншых культур, удасканальвала прафесійныя веды і ўпэўнена рухалася наперад... Часам, лежачы ўвечары ў сваім прасторным ложку, яна выключала бра, заплюшчвала вочы і на хвілінку, на адну толькі хвілінку ўяўляла сабе, як, праязджаючы аднойчы па вуліцы на сваім аўто, выпадкова ўбачыць ЯГО на якім-небудзь аўтобусным прыпынку — ссутуленага, няголенага, у задрыпаным паліто і з авоськай. Ці не, лепш з жонкай — тоўстай, белабрысай і каротка астрыжанай, у расцягнутай майцы і стаптаных шлёпанцах... Яна прытармозіць каля іх, выйдзе з машыны з разгубленым выглядам (зразумела, каб купіць у кіёску які-небудзь модны часопіс), потым — быццам выпадкова — паверне галаву... І — Божа! Якая сустрэча! Якія людзі! Не-не, я не магу доўга затрымлівацца, у мяне, ведаеце, праз пятнаццаць хвілін важная сустрэча... Цудоўна выглядаеш, мілы... А гэта хто, мама твая? Ой, даруй... Ну, пакуль! Яшчэ сустрэнемся.

...Яна засынала, але спала неспакойна. І ў снах бачыла тое самае: свой трыумф і яго знішчэнне.

* * *

Аднак усё мінае, і любая рана, калі яна несмяротная, з часам загойваецца. На дні нараджэння адной са сваіх сяброўак яна пазнаёмілася з мужчынам, які падаўся ёй лепшым за астатніх, бо не выклікаў звычайнай агіды. Патанцавалі... Ён пайшоў яе праводзіць, яна запрасіла яго на каву... Пасядзелі, пагаварылі. Ён агледзеў яе двухпакаёвыя харомы і прапанаваў дапамагчы з дробным рамонтам: тут прыбіць, там падфарбаваць... Начаваць не застаўся, а прыехаў толькі праз тры дні з цэлым наборам інструментаў. Яна падумала, што жыццё праходзіць, і ў ім не хапае чагосьці надзейнага, фундаментальнага. Той асновы, якая нясе з сабой спакой і размеранасць...

Ён не падмануў яе чаканняў, быў надзейным і верным. На працы не затрымліваўся, мужчынскіх пасядзелак з півам не любіў, як, дарэчы, і само піва...

Спачатку ў іх нарадзілася дзяўчынка, праз некалькі гадоў — хлопчык. У другі раз роды былі цяжкімі, ёй рабілі кесарава... Пакуль ляжала дома, адыходзіла ад аперацыі, муж уставаў да малога па начах, вадзіў старэйшую ў дзіцячы сад, гатаваў ежу і мыў бялізну... А па вечарах, выкраіўшы хвілінку-другую, садзіўся каля яе і гладзіў па руцэ. Яна ніколі не бачыла яго ні злосным, ні незадаволеным...

— Хто гэта? — спытаў ён аднойчы, гартаючы стары фотаальбом. Нейкім незразумелым чынам парыжскі фотаздымак патрапіў у «галерэю» яе ўніверсітэцкіх сяброў. Жоўтыя цюльпаны кальнулі ў сэрца пялёсткамі-стрэлкамі.

— Ды так... Ніхто.

* * *

Ён патэлефанаваў светлым і цёплым вераснёўскім днём. Яна гуляла з малодшым і чакала са школы дачку. Муж быў на працы... Яна столькі разоў «пракручвала» ў галаве гэты званок, так часта «рэпеціравала» абыякавасць... А цяпер абсалютна разгубілася.

— Ты?..

— Я, — адказаў ён. — Толькі не кладзі трубку.

Яна паспрабавала ўзяць сябе ў рукі... Падбег сын, настойліва пацягнуў яе за крысо халаціка, не ўтрымаўся на нагах, мякка прызямліўся на падлогу і заенчыў... Яна ўсміхнулася, пагладзіла яго па бялявай галоўцы.

— Ну-ну, маленькі... Мама хутка зараз, ідзі ў пакой, пагуляй з машынкамі.

— Гэта твой сын? Колькі яму? — спытаў ён.

— Хутка будзе тры.

— Ён у цябе адзін?

— Не, яшчэ ёсць дачка, ёй восем.

— Малайчына... Я нават не думаў...

— А што ты думаў? — у ёй пачало закіпаць раздражненне. Гадзіннік паказваў палову другой. Вось-вось павінна была прыбегчы са школы Волечка, а яна яшчэ не бралася разаграваць абед.

— Паслухай, я ўсё разумею, — ён загаварыў вельмі хутка. — Я ў вашым горадзе праездам. Знайшоў праз даведку твой адрас...

— Навошта?

— Ну... Я хацеў бы цябе ўбачыць.

— Столькі гадоў не хацеў і раптам захацеў? З чаго гэта?

— Разумееш, я ад'язджаю. Надоўга. Можна сказаць, назусім. Так што хачу развітацца з тымі, хто шмат для мяне значыў.

— І якая я па ліку ў гэтым спісе?

— Першая і... апошняя.

— Не смешна, — адказала яна пасля паўзы, проста каб што-небудзь адказаць. Божа, ну навошта ён патэлефанаваў, няўжо яму хочацца ўсё гэта варушыць? Ехаў бы сабе спакойна туды, куды сабраўся. Дык не...

— Я змагу выйсці з дому толькі ўвечары, пасля шасці, калі вернецца з працы муж.

— Добра, буду чакаць цябе ў шэсць гадзін на нашай лавачцы, трэцяй ад уваходу ў парк... Памятаеш?

Ці памятае яна? Яшчэ б... Але што сказаць мужу? Яна ніколі не падманвала яго і не збіралася гэта рабіць... Ну што за пакаранне? Як можна знікаць на гады, а потым звальвацца на галаву і патрабаваць тэрміновай сустрэчы?.. Яна ўжо не тая наіўная дзяўчына, асляпленая вялікім (куды ўжо болей) каханнем... Захоча — і ўвогуле нікуды не пойдзе...

* * *

— Ты зусім не змянілася, — ён падняўся з лавачкі і зрабіў некалькі крокаў ёй насустрач. — Хочаш прайсціся ці пасядзім?

Прайсціся? Ён увогуле думае, што гаворыць? У парку поўна народу, не хапала яшчэ сустрэць каго-небудзь са знаёмых...

— Лепш пасядзім, — яна ўжо шкадавала, што прыйшла. — У мяне мала часу.

— Так-так, безумоўна... Ты не магла адказаць інакш. Я моцна пакрыўдзіў цябе тады... Проста адна жанчына... Яна чакала ад мяне дзіця. Так атрымалася, і з гэтым нічога нельга было зрабіць. Паміж мною і ёй не было ніякага кахання, але ж дзіця ні ў чым не вінаватае. Я не дараваў бы сабе, калі б яно вырасла сіратой пры жывым бацьку.

— Трэба было ўсё мне патлумачыць, я зразумела б.

— Наўрад ці. Ты так верыла мне, так кахала...

— Менавіта таму.

— Ну што цяпер гаварыць? Малады быў, дурны...

Ёй стала холадна. Яна падняла каўнер плашча і паглядзела на гадзіннік.

— Я хутка пайду, — сказаў ён. — Цягнік адыходзіць праз гадзіну, а трэба яшчэ забегчы ў гасцініцу і забраць рэчы... Мне не хацелася б, каб цяпер мы развіталіся так, як тады. Я вельмі вінаваты перад табой і хачу выправіць памылку.

Яна сядзела моўчкі, утаропіўшыся ў адну кропку. Ён узяў яе руку ў сваю і прыклаў да шчакі. Рука была халодная, а шчака гарачая.

— У мяне толькі адна просьба: заплюшчы вочы і пасядзі так, пакуль я не адыду. Згодна?

Яна матнула галавой і заплюшчыла вочы. Ён падняўся, узяў яе твар у далоні і крыху прыўзняў яго — яна адчула, што вачам стала цёпла ад сонечных прамянёў, якія прабіваліся скрозь даволі рэдкую лістоту. Ён пацалаваў спачатку яе заплюшчаныя вочы, а потым вусны... Ёй захацелася, як тады, у вагоне, абняць яго за плечы і не адпускаць. Ніколі і нікуды... Каб не паддацца гэтаму жаданню, яна ўчапілася за край лавачкі — так моцна, што пабялелі пальцы. І пачула яго крокі. Ён адыходзіў вельмі хутка, бо мог спазніцца на цягнік...

Калі яна адкрыла вочы, ужо нікога не было. Побач з ёю, на тым месцы, дзе ён сядзеў, ляжалі кветкі — пяшчотныя жоўтыя пялёсткі трапяталі ад ветру. Яна ўзяла іх, патрымала ў руках і паклала назад...

**Наталля УЛАДЗІМІРАВА.**

Фокус



Фота Крысціны ЛАСКІ.

# БЕЛАРУСКІЯ ДЗЕЦІ НАВУЧАЦЦА КІДАЦЬ ГРАНАТУ?

**У школах збіраюцца «настойліва ўвесці» нормы «Гатовы да працы і абароны». Такім чынам збіраюцца «адарваць дзяцей ад камп'ютараў»**

У канцы мінулага тыдня інфармацыйныя агенцтвы паведамілі навіну: «У школах плануюць увесці нормы ГПА». Для юных чытачоў патлумачу, што незнаёмы тэрмін ГПА азначае «Гатовы да працы і абароны». Тэрмін быў уведзены ў 30-я гады мінулага стагоддзя.

У прынцыпе, нормы ГПА мала чым адрозніваюцца ад нарматываў, якія існуюць цяпер: той жа бег, адцісканні, падцягванні і гэтак далей. У сістэме ГПА ёсць і экзатычныя практыкаванні, напрыклад, кіданне гранаты, пра што ў многіх школах даўно забыліся.

Не паспела паведамленне з'явіцца ў СМІ, як людзі пачалі актыўна крытыкаваць ідэю на форумах: *«Навошта наноў уводзіць савецкую сістэму, якая сябе зжыла?», «З аднаго боку, карысная рэч, але гвалтам мілы не будзеш», «Дзецям няма дзе займацца спортам, вось і сядзяць каля камп'ютараў».* На пяць крытычных поглядаў — адзін станоўчы.

Навіна хутка абляцела грамадства. На двары сустракаю суседа па пад'ездзе Валодзю, бацьку дваіх школьнікаў. Той расказвае пра новаўвядзенне і яго маляўніча каментуе:

— Памятаеш, *мне штраф далі за тое, што па праспекце на веласіпедзе ехаў? Веладарожак жа ў раёне пакуль не збудавалі. А яны на камп'ютары тыркаюць. Знайшлі прычыну ўсіх праблемаў,* — выказаўся Валодзя і распавёў мне, перш чым развітацца, вось такі анекдот.

Хлопец і дзяўчынка сядзяць на стадыёне і глядзяць, як іншыя падлеткі здаюць нарматыў па бегу. Дзяўчынка кажа:

*— Коцік, глядзі, як бяжыць вунь той хлопец, у прыгожай майцы з ружовай палоскай.*

*— Гэта не палоска, гэта ён язык падчас бегу высунуў і на плячо паклаў...*

Асабіста я нічога дрэннага ў нарматывах не бачу. Калі да іх ставіцца адэкватна, без фанатызму, граматна выкладаць фізвыхаванне, то ўсё нармальна. Але ці варта чакаць кваліфікаванага выкладання фізкультуры ў час, калі дысцыпліну недаацэньваюць — як дзеці з бацькамі, так і некаторыя настаўнікі.

На старонках «Звязды» 28 і 29 мая выходзіла журналісцкае расследаванне «Чаму на занятках па фізвыхаванні паміраюць дзеці?» За мінулы навучальны год у краіне здарылася пяць смяротных выпадкаў. Прынамсі два з іх — калі юнакі здавалі стометроўкі, два — калі хлопцы беглі ў вольным стылі на далёкія дыстанцыі. Такая колькасць трагедый для нашай краіны — вельмі шмат. Гэта першая прычына, чаму, на мой погляд, варта з асаблівай асцярожнасцю ставіцца да нарматываў і прынамсі пакуль не рабіць сістэму іх здачы больш жорсткай. Спачатку трэба падрыхтаваць адэкватныя кадры. Прынамсі, я не раз чуў, што ў Міністэрстве адукацыі праблему разумеюць і выкладанне фізкультуры будуць паляпшаць. Але ці варта чакаць зменаў так хутка?

Другая прычына майго асцярожнага стаўлення да нормаў ГПА такая: пакуль мы не маем гарантый, што медагляды вучняў праводзяцца сумленна, без фармалізму. Адзін з вучняў, які загінуў у мінулым годзе, перанёс на нагах інфаркт, а гэтага ніхто не заўважыў. Прадстаўнікі Міністэрства аховы здароўя выказаліся, што сістэму правядзення медаглядаў неабходна ўдасканальваць. Але ці паспелі правесці ўдасканаленне за такі кароткі тэрмін? Сумняваюся.

Трэцяя прычына — псіхалагічны фактар. Цікава, як самі школьнікі ўспрымуць «настойлівае ўвядзенне ГПА»? Абсалютна даведзены факт, што метад пугі і прымусу маладыя людзі найчасцей успрымаюць у штыкі. У «Звяздзе» не раз выходзілі матэрыялы, дзе аўтарытэтныя спецыялісты выказваліся наконт таго, як прывучыць дзіця да здаровага ладу жыцця. Што найперш важна прывіць пачуццё задавальнення ад наведвання заняткаў. А потым ужо чалавек папросту не зможа саскочыць з гэтай фізкультурнай «іголкі». Гэты метад, дарэчы, у свой час вельмі эфектыўна спрацаваў і на мне. Калі ў студэнцкім узросце я пайшоў у секцыю па тайскім боксе, дзе выкладаў старшы трэнер зборнай Беларусі і чэмпіён свету сярод прафесіяналаў Дзмітрый Пясецкі, то не сутыкнуўся з цяжкімі нагрузкамі.

— *Падчас бегу важна навучыцца дыхаць, цела само падкажа, калі трэба паскараць тэмп, важна атрымліваць задавальненне,* — вось што патлумачыў адзін з наймацнейшых трэнераў краіны, калі мы пабеглі першы крос.

І што ў выніку? Язык на плячо я не вешаў, па сёння як мінімум тройчы на тыдзень наведваю спартовую залу, баксірую, бегаю доўгія кросы і без фізічнай нагрузкі ўвогуле не магу існаваць...

Калі я рыхтую матэрыялы, звязаныя з фізкультурай і спортам, заўсёды раюся з кваліфікаванымі спецыялістамі — педагогамі, алімпійскімі чэмпіёнамі і гэтак далей. Так я перастрахоўваюся ад памылак і ў выніку не атрымліваю крытычных водгукаў на свае матэрыялы ад чыноўнікаў. Прынамсі пакуль. Таму мяне дзівіць, чаму самі чыноўнікі, як мне падаецца, не заўсёды ідуць на канструктыўны дыялог з зоркамі спорту і педагогамі, якія ведаюць справу.

Не хачу бэсціць абсалютна ўсіх чыноўнікаў. Многія разумеюць сітуацыю. Напрыклад, у Мінску адкрываецца ўсё больш каткоў, дзе можна актыўна і нядорага адпачыць. Пачалі будаваць веладарожкі. Гэта сучасны, модны і эфектыўны падыход да фізкультуры. Калі з'явіцца больш такіх веладарожак і каткоў, больш маленькіх спартовых залаў у спальных раёнах (пакуль яны відавочна адсутнічаюць), ды яшчэ і педагогаў будуць рыхтаваць лепш, то і праблема ў многім будзе вырашана.

Таму інфармацыя пра нормы ГПА, якія чамусьці вырашылі дастаць са старога куфра, мяне бянтэжыць. Навошта «Запарожцу» спаборнічаць з «Формулай-1»? Упэўнены, што праблему можна вырашыць куды больш абгрунтаваным метадам.

**Яўген ВАЛОШЫН.**

## ВАНДАЛІЗМ НА МОГІЛКАХ

**У Брэсце па заяве генеральнага консула Польшчы заведзена крымінальная справа.**

Звязана гэта з тым, што невядомыя на могілках «Каталіцкія», што знаходзяцца па вул. Пушкінскай, пашкодзілі каля 60 надмагільных помнікаў.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## 45 ЗВАНКОЎ У СУТКІ

**Больш за 10 тыс. званкоў паступіла ў 2010 годзе на тэлефон экстраннай псіхалагічнай дапамогі ў сталіцы — у сярэднім 45 зваротаў у суткі.**

28 % званкоў выкліканыя праблемамі псіхічнага здароўя (дэпрэсіі, трывожны стан), 21 % — юрыдычнымі праблемамі, 17 % — абстаноўкай у сям'і (п'янства аднаго з сужэнцаў, здрада, цяжкасці ва ўзаемаадносінах з роднымі). Распаўсюджанымі прычынамі зваротаў з'яўляюцца адзінота, алкагалізм, наркаманія, гвалт у сям'і.

У пачатку года было шмат званкоў, звязаных з праблемамі выплаты крэдытаў, звальненнем. Апошнім часам дактары дыспансэра неаднаразова аказвалі дапамогу мінчанам, якія пакутуюць ад гульнявой або інтэрнэт-залежнасці.

Для параўнання: у цэлым за 2009 год на тэлефон экстраннай псіхалагічнай дапамогі (яго нумары 290 44 44, 290 43 70) паступіла больш за 15 тыс. званкоў. Асноўнымі задачамі службы даверу з'яўляюцца аказанне псіхалагічнай падтрымкі ў экстрэмальнай сітуацыі, прадухіленне суіцыдаў.

**«Мінск—Навіны».**

## АДЗЕННЕ — КАНТРАБАНДАЙ

Кантрабанду, як правіла, перавозяць мужчыны, а жанчыны-кантрабандысткі — вялікая рэдкасць. А вось каля в. Дзівін (Кобрынскі раён) быў затрыманы аўтамабіль «Фальксваген-Пасат», якім кіравала жыхарка Кобрына. Яна ўвезла на тэрыторыю Беларусі адзення, на якое не было дакументаў, на 10 млн рублёў. А ў гаражы беспрацоўнай з в. Лелікава гэтага ж раёна было схавана адзення на 110 млн рублёў.

Праводзіцца праверка.

## ПРАЗ МЯЖУ З... ПАДУШКАЙ

Каля в. Шумакі, непадалёку ад беларуска-польскай мяжы, быў затрыманы грамадзянін Расіі. 28-гадовы расіянін меў пры сабе атлас Еўропы, компас, адзенне на змену, мабільнік, 305 еўра, 17 тыс. расійскіх рублёў, 23 тыс. беларускіх і... надзіманую падушку.

Затрыманы растлумачыў, што збіраўся перайсці мяжу, каб затым уладкавацца на працу ў Еўрасаюзе.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

**И П Горунов Александр Николаевич**

**извещает о проведении 30 сентября 2010 г. открытого аукциона на право заключения договоров субаренды помещений, расположенных по адресу: г. Гомель, ул. Огаренко, д. 30**

| № лота | Вид помещения | Цель использования | Площадь объекта, м² | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Помещение № 3 | Розничная торговля | 15,9 | 1 168 650 | 100 000 |
| 2 | Помещение № 4 | Розничная торговля | 30,2 | 2 219 700 | 200 000 |

Объекты сдаются в субаренду сроком на 11 месяцев. Размер арендной платы: 24500 за 1 м² в месяц.

К участию в аукционе допускаются только юридические лица.

**Условия продажи лотов:** торги по каждому лоту проводятся отдельно. Каждый участник имеет право участвовать в торгах по нескольким лотам при условии регистрации и внесении платы за участие и задатка по каждому из заявленных лотов.

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток на р/с 3013216850019 в Головном ф-ле по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк» код 768.

**Аукцион состоится по адресу: Гомель, ул. Шилова, 4к, 4. Начало в 14.00.**

Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: **Гомель, Шилова, 4к, 4.** по понедельникам с 11.00 до 12.00 по 23 сентября 2010 г. включительно. Подача документов по почте не допускается. На аукционе побеждает лицо, предложившее наиболее высокую цену.

Победитель торгов после подписания протокола о результатах аукциона обязан: в течение 5 дней подписать договор субаренды; в течение трех дней, не считая дня проведения аукциона, оплатить стоимость права субаренды, сформированную в результате аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка; в течение 3 дней с даты подписания протокола возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона на основании выставленного счета. Организатор торгов вправе снять лот с торгов до объявления его проданным.

**Контактные телефоны организатора аукциона: 8 029 651 1950; 8 029 121 3647.**

КІРМАШ
штотыднёвы рэкламны выпуск № 24 (645)
аддзел рэкламы ☎ 287 17 79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

*ПРАДАЕЦЦА*

❒ Дом з усімі выгодамі ў в. Хатляны Уздзенскага раёна, 40 км ад Мінска.
Тэл. 5774994 МТС.

❒ Карова пярэстая.
Тэл. 8 029 618 31 72.

❒ Трактар МТЗ-80. 4200 у.а., г. Маладзечна.
Тэл. 8 029 636 39 84.

❒ 2-пакаёвая кватэра, 3/3 цагельная «хрушчоўка», 43 кв. м, падвал, санвузел сумесны, без рамонту, цукровы завод, 20 км ад Брэста, у г. Жабінка.
Тэл. 8 016538 38 52.

❒ «Таёта-Карына» 1,8В, 1995 г.в., універсал, заменены ўсе расходнікі, 2 камплекты гумы з дыскамі, 4100 у.а., торг.
Тэл.: 8 0336771723, 8 029 599 36 60.

❒ «ВАЗ-2101» 1977 г. в., чырвоны, бензін, г/з, т/а, у добрым рабочым стане. У дадатак запчасткі. Цана 400 у.а. Торг.
Тэл. МТС 8 029 756 60 54, 8 017 296 40 28 — Мінск.

❒ Дыван 1,88х1,43 м. Цана 11 тыс. руб.
Тэл.: 8 033 635 37 97, 8 017275 38 29.

❒ Станок дрэваапрацоўчы трохфазны.
Тэл. 8 033 601 87 81.

❒ Каляска інвалідная з электрапрывадам.
Тэл. 8 044 754 06 65.

❒ «Пежо-405» 1994 г.в., 1,9Д, седан, цёмна-шэры металік, ц/з, сігналізацыя, г/у, ABS, эл. пакет, падагрэў паліва і крэслаў, ацынкаваны, выдатны стан, 2750 у.а., торг.
Тэл. 8 029 145 11 97.

❒ Жаночая вязаная блуза 46 памеру ў добрым стане. 15 тыс. руб.
Тэл. 8 033 635 37 97.

❒ Дом на Бярэзіне, 1 км ад Ялізава, 35 км ад Бабруйска, водаправод, лазня, 25 сотак.
Тэл. 8 033 255 49 21.

❒ Трактар МТЗ, дакументы рэгістрацыі ёсць, паўпрычэп, плугі, бароны.
Тэл. 8 029 873 02 85.

*КУПЛЮ*

❒ Трактар МТЗ (2000—2010 г.в.) заводскай зборкі з дакументамі.
Тэл. 8 044 4736890.

*РОЗНАЕ*

❒ Рэпетытар па рускай мове, вопытны настаўнік 5—11 кл., тэсціраванне. Мінск.
Тэл.: 8 017246 20 45, 8 029 274 93 79.

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі:
220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя______ №__________ Выдадзены ______________________

Подпіс ______________ Дата ________

# ШАШКІ

*Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА*

## АД РАШАЛЬНІКА ДА ЧЭМПІЁНА



Завяршыўся турнір IWCI-Rc1 — фінальная частка першага чэмпіянату свету па інтэрнэт-гульні ў рускія шашкі. Праводзіўся ён на сайце Айвара Ніедрыціса і вызначаўся тым, што ўдзельнікі не пісалі пісьмаў адно аднаму, а гулялі за электроннай дошкай. Змагаліся прэтэндэнты на медалі з Расіі, Украіны, Бразіліі, Латвіі, Літвы, Эстоніі і Беларусі. Прыемна адзначыць, што перамогу атрымаў неаднаразовы чэмпіён нашай краіны па завочнай гульні і шашачнай кампазіцыі Аляксандр Ляхоўскі з Жодзіна. Другое месца заняў расіянін Віктар Мядзведзеў, трэцяе — Яніс Пізанс (Латвія). Спаборніцтва ладзілася Санкт-Пецярбургскай акадэміяй шахматна-шашачнага мастацтва. Ад яе чэмпіён атрымае імянны кубак, медаль і адпаведны дыплом.

Майстар спорту А. Ляхоўскі паспяхова выступіў і ў мінулым годзе, заваяваўшы бронзавы медаль у 5-м чэмпіянаце свету па гульні ў шашкі-64 з выкарыстаннем электроннай пошты.

Ён часта быў пераможцам нашых рэспубліканскіх конкурсаў рашэнняў. Так што рашаючы звяздоўскія заданні можна стаць нават чэмпіёнам свету (!).

**«ПАГОДА Ў ДОМЕ»-7/18**



**Белыя:** a7, b2, b6, c7, e7 (5). **Чорныя:** a5, b4, d2, d8, e3, h2 (6). Выйгрыш.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі»**.

**РЭЙТЫНГ-ЛІСТ**

Па шашачнай кампазіцыі яго складае звяздоўскі аўтар Аляксандр Кагоцька (Пінск), які ўжо налічвае 113 удзельнікаў чэмпіянатаў Беларусі. Адначасова ім і вядучым нашай рубрыкі «Шашкі» створаны сімвалічныя клубы. Каб стаць іх членамі, трэба набраць 100 і больш заліковых ачкоў асобна ў кожным раздзеле кампазіцыі.

Сёння з гэтай задачай справіліся і ўвайшлі: у клуб **Шклудава** (праблемы-64) — сам Пётр Шклудаў з Наваполацка (291,25 ачка), мінчане Іван Наўроцкі (245,75) і Барыс Іваноў (217,25), Аляксандр Сапегін з Усполля Мсціслаўскага раёна (183,75), мінчане Мікалай Грушэўскі (174,125) і Віктар Шульга (162, 5), Дзмітрый Камчыцкі з Магілёва (153), Аляксандр Кагоцька (152,375), Леанід Вітошкін з Гомеля (141,25), Аляксандр Ляхоўскі (138,25) і Васіль Грабенка з Мінска (101,625); у клуб **Вітошкіна** (эцюды-64) — сам Л. Вітошкін (332,875), П. Шклудаў (168,002), Віктар Дзенісенка з в. Гатава Мінскага раёна (158,5) і В. Шульга (127,75) і ў клуб **Шурпіна** (задачы-64) — сам Аляксандр Шурпін з Клімавічаў (280,001), Мікалай Баброўнік з Мазыра (228,25), Канстанцін Тарасевіч з в. Сporава Бярозаўскага раёна (178,25), Л. Вітошкін (176,688), Уладзімір Ганчар з в. Пружанка Салігорскага раёна (159,75), Б. Іваноў (153,75), Віктар Самарын з Барысава (131,25) і Мікалай Зайцаў з Баранавічаў (126,938).

Што тычыцца мініяцюр-64, дык яны сталі самастойным жанрам кампазіцыі зусім нядаўна. Тут лідзіруюць В. Грабенка (88,375), А. Кагоцька (85), Л. Вітошкін (79,375), Д. Камчыцкі (78,25), М. Грушэўскі (71,25), П. Шклудаў (58,5), І. Наўроцкі (55,75), Пётр Кажаноўскі з в. Кашэвічы Пінскага раёна (55,25) і А. Сапегін (54,75).

**РАШЭННІ**

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў.

**«Пагода ў доме»: № 11.** I f8, g3, b4, II a5 (e3) e1x. II b6? (c3)=. I g3?, f8, b4 (c5 III) b8, e5 (e3!)=. III (f6?) f8, a5!x, **№ 12.** a7 (d6ABC) ae3 (e7DB1). Далей эцюд А. Лук'янава: h6x. A(c3) f6, h6 (b2) d4x. B(f4) h6, ae3, a5x. C(f6) c3, c7x. D(c7) a7 (f4) h6, ae3, d8x. B1(c5) a7 (f4) h6, ae3x, **№ 13.** f4, e3! (d4) c7, e3x, **№ 14.** I a3, e3 (d4) b6, e3 (f6/h6) f4x. I e5?, b8, a5 (e3 II) d4 (b6, b6) e5 (c5!)=. II (g3?, b6, b6) g5 (c5) c3 (h6) f6x і **№ 15.** g7 (fe3) f8, e3! (d4) c7, e3x. Заданні №№ 11, 13-15 належаць вядучаму рубрыкі, а № 12, як заўважыў А. Ляхоўскі, вядома з 1986 года, у якім дамка e3 знаходзіцца на g1.

**Аўтарскі-11** (У. Матус): **№ 3.** 18 (50) 27, 24 (6) 11, 10, 3x, **№ 4.** 43, 34, 32, 3 (37) 18, 29x і **№ 5.** 44-39, 33, 2, 44, 19, 3, 30, 34x.

**ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ**

**по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка**

| Наименование предмета аукциона | Капитальное строение и право заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|
| Местонахождение недвижимого имущества | Брестская область, Ганцевичский р-н, д. Шашки, ул. Советская, 28 |
| Продавец недвижимого имущества | РУП «Белтелеком», тел. (0162) 22 12 45, (01646) 2 12 31 |
| Сведения о предмете аукциона | Здание одноэтажное с холодной пристройкой, кирпичное, 1979 г.п., площадь – 136,6 кв. м. Земельный участок площадью 0,05 га использовать для размещения промышленного производства, общественного питания, торговли, услуг; срок аренды – 30 лет |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 119 431 060 |
| Сумма задатка, руб. | 11 943 000 |
| Организатор аукциона | *Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. (0162) 23 12 63, 20 87 85, www.brest-region.by* |

Аукцион состоится **5 октября 2010 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

**Для участия в аукционе представляются**:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 ГФ по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538; срок внесения суммы задатка – по 4 октября 2010 г. включительно.

3. Юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования.

4. Иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

5. Иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

6. Представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан:

подписать протокол аукциона в день аукциона;

в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка; внести в местный бюджет плату за право заключения договора аренды земельного участка, после чего не позднее 2-х рабочих дней заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

***Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням по 4 октября 2010 года включительно.***

# СІМВОЛІКА КОЛА

Кола — адна з найбольш значных і распаўсюджаных геаметрычных фігур — стала знакам цыклічнасці часу і дзялення прасторы на сваё і чужое. Круг у традыцыях народнай культуры многіх народаў свету быў надзелены статусам дасканаласці, таму што ў яго не існуе ні пачатку, ні канца. Кола (форма круга) стала знакам вечнага руху і абнаўлення.

- Абход, абворванне, апаясванне — рытуальныя дзеянні нашых продкаў, якія выконваліся па крузе злева направа (г.зн. па сонцы), калі жадалі працягу; накірунак руху справа налева (г.зн. супраць сонца) сведчыў пра жаданне спыніць які-небудзь працэс.
- У старажытнасці нашы продкі, перш чым пачаць будаўніцтва хаты, абворвалі пэўную тэрыторыю, акрэсліваючы тым самым сакральнае месца будучай вёскі.
- Абворванне вёскі (рытуальныя дзеянні групы аднавяскоўцаў, скіраваныя на акрэсліванне жыллёвай прасторы) выкарыстоўвалі, каб захаваць людзей і жывёлу ў час эпідэмій, якія ў народзе мелі назву «мор».
- На працягу года практычна ва ўсе вялікія святы — на Каляды, Вялікдзень, Юр'еў дзень, на пачатку сяўбы, у час засухі або працяглых дажджоў — выконвалі абход усіх двароў.
- Абрадавыя танцы нашых продкаў — карагоды — былі нічым іншым, як рытуальным дзеяннем, якое зноў-такі замыкала адпаведную прастору ў магічнае кола.
- У рытуалах сямейнай накіраванасці: на вяселлі, пры нараджэнні і хрышчэнні дзіцяці — абход вакол стала, хаты, вясельнага поезда выконвалі таксама па крузе.
- Шэраг рытуальных дзеянняў, накіраваных на аб'яднанне (злучэнне), выконвалі пры дапамозе круга. Напрыклад, каб куры не разбегліся з двара, на Каляды іх кармілі «ў крузе»: на падлогу клалі абруч, у сярэдзіну насыпалі зерне і склікалі курэй.
- Рух па крузе стаў складовай часткай у народнай медыцыне: хворага трэба было тройчы абвесці вакол сакральнага месца, каб пазбавіць ад хваробы.
- Малюнак круга на зямлі — абвядзенне рытуальным прадметам (нажом, крэйдай, вугалем і г. д.) — нашы продкі выкарыстоўвалі, каб абараніць сябе і сваіх блізкіх ад нячыстай сілы. Пры гэтым чыталіся малітвы і замовы: «Бог у крузе, чорт — па-за кругам». Або так: «Вакол мяне круг, малявала яго не я, а Багародзіца мая».
- Рэчы, якія лічыліся абярэгамі для чалавека: пярсцёнкі, бранзалеты, каралі, скроневыя колцы — таксама былі зробленыя ў форме кола.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнемся!

**Ажаніўся чалавек-невідзімка на дзяўчыне-невідзімцы. А дзеці ў іх — ну наогул глядзець няма на што!**

☺

На мытні:
— Зброя, наркотыкі, валюта?!
— А на папярэднім прыпынку халоднае піва прапаноўвалі.

☺

**Калі муж доўга не старэе, значыць, ён мала ведае.**

☺

На вечарынцы сустракаюцца дзве сяброўкі.
— Дарагая, у цябе такое пышнае калье. І такое доўгае! Мусіць, твой муж дорыцыць табе па жамчужыне на кожны дзень нараджэння...




З Днём нараджэння віншую **Алену Сцяпанаўну ДУДЗІЧ** з г/п Воранава. Жадаю вялікага сямейнага шчасця, моцнага здароўя, дабрабыту, поспехаў у працы.
**Матуля.**

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




## ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**Сканворд (28 жніўня). Па гарызанталі:** Гарэм. Паляўнічы. Пчаляр. Амбал. Сабор. Аід. Габой. Жняя. Ярмолка. Бры. Норка. Птах. Натура. Мол. Баабаб. Кава. Уса. Лях. Спірт. Рарог. Эрг. Такса. Гектар. Трупа. Улар. Ніка. Клунак. Таемнік. **Па вертыкалі:** Галубятнік. Рыбалоў. Сумёт. Умалот. Балеро. Яга. Мопс. Алах. Арган. Струна. Праём. Улік. Бабёр. Шпак. Ліяна. Арат. Лайба. Сіг. Карп. Джып. Табурэт. Вяха. Астра. Хіба. Грыбнік.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.15 | 20.03 | 13.48 |
| Віцебск — | 6.03 | 19.55 | 13.52 |
| Магілёў — | 6.06 | 19.53 | 13.47 |
| Гомель — | 6.05 | 19.47 | 13.42 |
| Гродна — | 6.31 | 20.17 | 13.46 |
| Брэст — | 6.35 | 20.15 | 13.40 |

### Месяц

*Апошняя квадра 1 верасня. Месяц у сузор'і Цяльца.*

### Імяніны

***Пр.** Георгія, Дзяніса, Емяльяна, Івана, Іларыена, Міхаіла, Рыгора, Яўгена.*

***К.** Ізабелы, Паўліны, Багдана, Марка, Раймунда.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




## 31 жніўня

### Дзве даты

**1939 год** — немцы інсцэніравалі напад палякаў на радыёстанцыю горада Глейвіц, што паслужыла нагодай да аб'яўлення вайны Польшчы. У той жа дзень Вярхоўны Савет СССР ратыфікаваў савецка-германскі пакт аб ненападзе.



**1935 год** — забойшчык шахты «Цэнтральная—Ірміна» Аляксей Стаханаў установіў рэкорд па здабычы вугалю, выдаўшы 14 нормаў за змену — 102 тоны. Пачатак стаханаўскага руху ў СССР.

### Цытата дня:

***«Жыццё пазнаецца з кніг і твораў мастацтва, можа быць, яшчэ ў большай ступені, чым з самога жыцця».***

**Тэадор Драйзер (1871—1945.), амерыканскі пісьменнік, публіцыст.**

# Валянцінкай

**...Кнігу не прачытаць — розуму не прыбавіць, кажуць у Кітаі. То днямі дачытала — іхнюю, а дакладней, адмысловую — складзеную з іхніх прыказак і прымавак; клічнікаў на палях наставіла. Ну вось як вам: «Здароўе — гэта скарб, які заўжды з табой»? Альбо: «Лепей блізкі клопат, чым далёкая спагада». Ці: «Іншы не пражыве і ста гадоў, а збрыдзее ўсім на тысячу», «Гнілое дрэва не гадзіцца ў справу, дурны чалавек не гадзіцца ў правіцелі».**

**Яшчэ? «Памерла маці чыноўніка — уся вуліца ў жалобе; чыноўнік памёр — труну няма каму несці»...**

**І ўсё ж у гэтым вельмі своеасаблівым шчодрым россыпе кітайскай народнай мудрасці найбольш здзівіла іншае — зусім кароткае: «Блізкі сусед лепш, чым далёкі родзіч». Здзівіла тым найперш, што гэтую прыказку я ўжо чула, прычым з маленства, не раз, ад... роднага бацькі. Праўда, гучала яна трошкі інакш: «Харошы сусед лепш, чым сем нехарошых (тата ўжываў і іншае слова) родзічаў»...**

**Меў падставы. Бо (як і большасць на гэтай зямлі) жыў з людзьмі, меў сваякоў — шмат і розных, у тым ліку нядобрых.**

**Меў, зразумела ж, суседзяў.**

# ХАЙ ПАЛЯЖЫЦЬ

Вера (а цяпер ужо і Пятроўна) пра свайго новага спачатку пачула. Сарафаннае радыё данесла, што ў аднапакаёўку ў яе за сцяной пераязджае мужчына — з дома, дзе іх гастраном. Што жыў ён там з жонкай і дзецьмі ў вялікай кватэры, але развёўся, размяняў жытло.

Дзён праз колькі пасля пераезду Вера яго ўбачыла (і нават упадабала, можна сказаць), бо высокі, досыць сімпатычны з твару... Хоць і зверáваты крыху: «здрасьце», прынамсі, як рубель падарыў.

Але хто б на гэта зважаў?! Калі б не дзеці.

Першы раз Вера ўбачыла іх (худога цыбатага хлопчыка гадоў васьмі-дзевяці і дзяўчынку трохчатырох), вечарам пад дзвярыма ў... сваю кватэру. Яны сядзелі на дыванку (у суседа не было нават звыклай анучы) і чакалі, чакалі, як сказалі — бацьку, а той недзе затрымаўся — дома няма.

«Яно ж з кім не бывае?» — стала апраўдваць суседа жанчына і, нягледзячы на стому (з вёскі прыехала, ды праз галоўкі ж не пераступіш, і не прагоніш) павяла дзяцей да сябе (бацьку ў дзверы запіску ўткнула...) — уключыла ім тэлевізар, сабрала нечага на стол, пачаставала...

Час ішоў, суседа не было (яна раз-пораз выглядвала ў агульны калідор — запіска па-ранейшаму тырчала), а дзеці не сыходзілі, чакалі. Тады, каб нечым заняць іх, жанчына выйшла ў лоджыю — там, на верхняй паліцы, ляжаў стары чамадан з дзіцячымі кніжкамі. А калі падступілася, каб дастаць яго, адчула пах дыму, паленай паперы. І, як чорт падаткнуў (раптам пажар?) — зазірнула праз перагародку, усунула свой нос у лоджыю суседа. Той быў... дома, курыў на свежым паветры з нейкай растрапанай дзябёлай дзеўкай.

Веру тады як варам абліло: бацька (!) не адчыніў... І каму? Сваім жа дзецям!

Потым яна бачыла гэта не раз. Суцяшала малых, падманвала, казала, што бацька іх зноўку недзе затрымаўся! Калі магла, забірала да сябе, частавала, падводзіла дамоў. Пакуль тыя, з часам, не стаміліся прыходзіць і чакаць пад дзвярыма, ці не дапялі самі, што бацьку зусім не патрэбныя.

А ён, відаць, толькі гэтага і чакаў: то па святах ды выхадных кампаніі збіраў, то цяпер і па будных дым у хаце каромыслам: тонкая сцяна паміж Верынай і яго кватэрамі літаральна, дрыжэла ад тупату, песень і гвалту.

Што тады рабіла Вера?

За гады хапіла ўсяго: далікатна маўчала — цярпела; хадзіла на перамовы — і ў той дзень і назаўтра; прасіла, нават маліла (калі сусед заводзіў свае «пласцінкі» па той бок ночы, а раніцай ёй рана ўставаць...); адключала (калегі навучылі) аўтамат на шчытку і пакідала яго без электрычнасці, без музыкі; вычарпаўшы, як здавалася, усе магчымасці, плаціла той жа манетай: на ўсю катушку ўключала Моцарта і сыходзіла з дому; скардзілася ў ЖЭС; пагражала судом, аднойчы выклікала міліцыю.

Бо нельга было не выклікаць і не ўпрошваць, каб прыехала (спачатку не хацела: да дзесяці вечара, маўляў, шумець можна)...

Вера ледзь пераканала тады, што вечар з вечарам не роўныя, што ў іншыя перацярпець можна. Але сёння — нябожчыца ў іх пад'ездзе (паверхам вышэй), маладая зусім жанчына. А значыць, там, наверсе, сцены ад плачу разносяцца, а тут, унізе, бугі-вугі грымяць.

І хадзілі ўжо яны да суседа, і прасілі, каб выключыў (ці хоць сцішыў), — першы раз адказаў, што чужое гора яго «не калыша». А потым проста не адчыняў дзвярэй — ні суседзям, ні сваякам нябожчыцы...

Міліцыі — адчыніў, давялося. Што там за размова была, Вера не чула, але пасля яе (на добрых паўгода!) сусед пацішэў: гэта значыць, гудзець гудзеў — сяброў і «бабачак начных» прымаў, але танцы ладзіў з аглядкай, песень ноччу не спяваў. Вера нават маці з вёскі прывезла — думала, старэнькая перазімуе тут...

Не выйшла. І зноў жа з-за суседа. Той (у прыдурка заўсёды свята) чарговую п'янку неяк заклаў, музыку ўрубіў — на ўвесь двор. А Вера на працы была. Вярнулася дамоў, — здалёку пачула. Прыбегла ў кватэру, матулі няма — ні ў спальні, ні ў зале, ні ў кухні... Думала, што нехта з жанчын забраў да сябе, каб гвалт пераседзела, адчыніла дзверы ў прыбіральню, і сэрца зайшлося: маці такі знайшла найцішэйшае месца — села там, на падлозе і задрамала, абклаўшы вушы падушкамі.

У дачкі дзе адвага ўзялася: развярнулася, уляцела да суседа, схапіла са стала магнітафон, выкінула яго ў акно і выйшла.

Мусіць, нешта было ў яе рухах і твары, бо з добрага дзясятка людзей у пакоі (пераважна п'яных... мужчын), ніхто нічога не сказаў. І не зрабіў.

Праўда, потым, калі яна ўжо ляпнула дзвярыма (чужымі, а потым і сваімі), сусед стаў званіць і грукаць, крычаць, што яна адкажа, яна заплаціць...

Маці баялася, а Вера чамусьці не. Ні ў той дзень, ні потым, калі амаль кожныя выхадныя гойсала ў вёску, каб праведаць яе (нешта прыгатаваць, памыць, прыбраць...), а потым па ночы, лічы, вярнуцца дамоў...

Пра тое, каб жыць з дачкою у горадзе, старая і чуць не хацела.

Ды яно і гаварыць пасля дня ў прыбіральні сэнсу не мела.

Як і чакаць.

У першыя гады Вера яшчэ спадзявалася, што сусед мо пакіне ў сябе нейкую з начлежніц, з сяброўак, ачалавечыцца — зажыве. Як людзі. Але ён (прынамсі да лепшага) мяняць сваё жыццё не хацеў — да горшага мяняў чужыя. Вера ведала: нерваваліся, абураліся, недасыпалі суседзі (знізу, збоку, зверху...). Сама ж яна, лічы, перастала карыстацца адным з пакояў, перастала запрашаць да сябе гасцей, узненавідзела святы...

Мужчынскае — 23 лютага — сусед адзначаў з ранку і, як заўсёды, бурна. Пасля чаго пачаўся «апахмел» — крыху цішэйшы, але зацяжны, як здавалася, да свята жаночага.

Аднак на яго ў суседа, што страшэнна здзівіла, «заплыву ў шырыню» не было. Больш за тое — неўласцівая, мёртвая цішыня стаяла за сцяной і потым: лічы, што ўвесь сакавік ў кватэры не гарэла святло. «Ну нарэшце недзе захлынуўся ці некуды з'ехаў! — з палёгкай рашылі суседзі і ўжо нават прыкінулі магчымыя «маршруты». Ну, па-першае, ён мог застацца ў некага з сабутэльнікаў ці сабутэльніц, яму (ну недзе ж працуе?!) маглі даць «гарачую» пуцёўку ў нейкі санаторый; ён сам мог паехаць недзе адпачыць, да таго ж, Вера ўспомніла (дзеці казалі), што дзесь пад Еўпаторыяй жыве іх родны дзядзька, бацькаў брат. То мог жа падацца і ў госці...

Пра тое, што з ім было насамрэч, дазналася ад суседавай дачкі, якую выпадкова сустрэла на вуліцы. «Інсульт... З работы на «хуткай» забралі. У бальніцы ляжыць, — сказала дзяўчынка і без крупінкі эмоцый (жалю, трывогі...) дадала, што маці з братам хадзілі ў ЖЭС, каб даведацца, ці не прападзе («ну потым...») кватэра, былі і ў бальніцы — бацька завяшчанне напісаў. Так што «хвалявацца цяпер няма чаго», усё ў парадку. У іх...

У бацькі...

Тыдні праз два пасля той сустрэчы яго, як данесла сарафаннае радыё, выпісалі з бальніцы, прывезлі дамоў. «Сам, сваімі нагамі да пад'езда ішоў, — казалі аматаркі пасядзець на лавачцы. — Але правай, бедны, колы чарціў... Як тым цыркулем... Пад левую руку вялі... Страшны-страшны...»

Яно ж, тое радыё, данесла, што да хворага следам прыходзіў сын: нёс сасіскі, хлеб, малако...

«Нямогламу б свежых сокаў цяпер, вітамінаў, булёну ды супу гарачага!, — прыкідвала Вера і разоў колькі (усё роўна ж варыцца!) нават налівала ўжо... Каб занесці. Аднак...

Перасадку галавы не робяць яшчэ — у памяці тут жа ўсплывалі то падманутыя дзеці — на дыванку пад яе дзвярыма, то п'яныя бабы (пад яго...), то крылатае: «Мяне чужое гора не калыша», то вечны шум за сцяной і сляды начных «дыскатэк» (у выглядзе ванітаў і іншага) на падлозе ў іх агульным калідоры... То (апошняю кропляй) родная маці з падушкамі ў прыбіральні...

Пасля чаго Вера адлівала той суп назад у каструлю і казала сабе: хіба потым...

А пакуль...

Пакуль хай паляжыць, хай падумае: можа, зразумее, адчуе, што жыў і жыве не адзін, што навокал людзі — розныя, але пераважна добрыя, што яны маглі б дамовіцца, нават «скласці графік»: хто і калі (побач жа!) будзе праведваць, што прыносіць. Яны б маглі дапамагчы — падняцца, стаць на ногі — але... чалавеку.

Калі ж ты ім не быў...

Зрэдчас (тонкія ў доме сцены) Вера чуе галасы. Да суседа прыходзіць сын (на яго, відаць, кватэра апісана?). Дачкі не заўважала, не сустракала ні разу. Ды і што ёй сказаць, убачыўшы, у чым папракнуць? Бацька ж ад іх адвярнуўся, адрокся першым.

...Цяпер ён заўсёды дома. Ляжыць. Напэўна ж, чакае...

Па вечарах, па начах з яго вокнаў ліецца святло, на якое больш не злятаюцца ні ранейшыя сябры, ні «начныя бабачкі». Ціха там (хіба кашаль зрэдчас).

А спакою ўсё роўна няма.

**Валянціна ДОЎНАР.**

**P.S.** *У той прачытанай нядаўна кніжачцы хацела адшукаць удалую кітайскую прыказку для патрэбных, магчыма, высноў. І не знайшла.*

*Як сякера пад лаўкай, навідавоку ляжала наша, сто разоў чутая: «Што пасееш, тое і пажнеш, што пажнеш, тое і змалоціш, што змалоціш, тое і з'ясі».*

*А многім хацелася б іншага.*

*Асабліва тады, калі змяніць ужо нічога не можаш.*

# 245 км/г — хуткасць дазволеная!

**ТРЫЦЦАЦЬ сем удзельнікаў з Польшчы, Украіны, Расіі, Літвы і Беларусі, больш за сто машын.. У апошнюю суботу гэтага лета на тэрыторыі аэрапорта «Мінск-1» адбылося аўтамабільнае свята «Чэмпіянат Беларусі па драгрэйсінгу».**



Самы хуткі аўтамабіль Еўропы — «Шэўрале карвет».





Ужо трэці год запар беларускаму драгрэйсінгу перашкаджае дрэннае надвор'е. Але нягледзячы на дождж, гэты від спорту становіцца ўсё больш папулярным. Да нас прыязджаюць знакамітыя гоншчыкі з суседніх краін. Вось і сёлета паляк Гнегаж Сташэўскі на «Шэўрале карвет» устанавіў новы для Беларусі рэкорд. Дыстанцыю ў 402 метры гоншчык пераадолеў за 9.61 секунды. На фінішы яго хуткасць склала 245 км/г. Дарэчы, у Гнегажа Сташэўскага гэта не адзіная перамога — у 2008 годзе ён атрымаў ганаровае званне чэмпіёна Еўропы.

Акрамя заезду, гледачы маглі паназіраць за спаборніцтвамі па гукавым ціску, сфатаграфавацца з рэдкімі аўтамабілямі, кошт якіх далёка за сто тысяч долараў.

Наперадзе — яшчэ адна грандыёзная схватка па дрыфце, якая адбудзецца 18—19 верасня на тэрыторыі аэрапорта «Мінск-1».

**Фотарэпартаж Марыны БЕГУНКОВАЙ**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 4226 Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12